

*Рыгор*
*Барадулін*

# халодная
# памяць
# вады

халодная
памяць
вады



*Рыгор*
*Барадулін*

# халодная
# памяць
# вады

Мінск
Рымска-Каталіцкая парафія
святога Сымона і святой Алены
2010

УДК 821. 161. 3-1
ББК 84 (Бел)-5
Б 24

Укладальнікі
*Ксёндз Уладыслаў Завальнюк — кандыдат гістарычных навук, магістр тэалогіі;*
*Ала Сакалоўская — кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Рэдактар *Ала Сакалоўская*

**Барадулін Рыгор**
Б 24 Халодная памяць вады: Рыгор Барадулін. — Мн.: Рым.-Катал. парафія св. Сымона і св. Алены, 2010. — 498с. [12] л. іл.

ISBN 978-985-6652-32-8.

Усё на зямлі мае памяць — і дрэва, і камень, і колас. У вады памяць халодная, бо яна глыбокая. У новай кнізе паэзіі Рыгора Барадуліна ў асноўным новыя вершы новага стагоддзя.

Падзяка Усявышняму за радасць жыцця, светлая журба, вечаровы роздум у шчырых радках. Выходзіць кніга клопатамі пробашча Чырвонага касцёла айца Уладыслава Завальнюка і Алы Сакалоўскай.

**УДК 821. 161. 3-1**
**ББК 84 (Бел)-5**

**ISBN 978-985-6652-32-8**

© Барадулін Р., 2010
© Завальнюк Ул., 2010
© Сакалоўская А., 2010
© Мацур Г., дызайн і макет, 2010

## Яшчэ мне хочацца жывой вады...

Наш славуты паэт Рыгор Барадулін выпусціў у свет кнігу новых вершаў. Як птушку, што нясе людзям радасць, дабрыню, спагаду — Дабравесце.

Чым хоча падзяліцца паэт з людзьмі? Пра што гэтыя вершы, якія напісаны ўжо ў наш, такі складаны, мітуслівы, супярэчлівы і адначасова шчаслівы час — у пачатку XXI стагоддзя?

Як і ў вершах яго знакамітага зборніка «Ксты», які перарваў дзесяцігадовае забыццё, няўвагу да паэта, ты пачуеш, адчуеш тое, што хвалюе цябе і кожнага чалавека. Хто стаў бяднейшы ад таго, што вершы не друкаваліся? Паэт? Не. Мы. Паэт пісаў і піша.

Усявышні трымае яго на гэтым свеце, спрыяе, радзіць, ратуе. Таму многія вершы Рыгора Барадуліна, асабліва з кнігі «Ксты», святары чытаюць з амбона, а вернікі, стоячы на каленях перад іконай.

Няма такога чалавека, які б не задумваўся над жыццём і смерцю, вечным і надзённым, каханнем і нянавісцю, любоўю да радзімы, да маці.

Калі прабудзеш з паэтам тры леты ў ягоным вушацкім доме, зразумееш, што радзіма для яго — гэта не нешта абстрактнае, агульнае, а вельмі канкрэтнае.

Гэта і стары таямнічы сад, па якім «ходзяць яблыкі басанож»; «засохлая ігрушына — застыглае вогнішча»; шпакоўня на бацькавым вязе, якая «глядзіць... сваім апусцелым вокам»; столь у мамінай хаце, якую, «як паэму лесу, чытаць па габляваных радках не стамляецца вока»; «матылёк заспаны», што «б’ецца ў шыбінку дзверцаў»; старыя ходзікі, якія «паўтараюць, як будзе вада па-латыні:

ак-ва, ак-ва, ак-ва»; нават камары, якія «ля роднай хаты кусаюць неяк саладзей».

Кожны верш Рыгора Барадуліна — гэта глыбокае разважанне над сэнсам жыцця, чалавечай сутнасцю.

«Свечка,
Зацепленая Ўсявышнім, —
Гэта і ёсць
Чалавек на зямлі».

Жыць з Богам, па Боскіх законах — вялікае шчасце для кожнага чалавека. Рыгор Барадулін думае, ацэньвае свае ўчынкі, вагаецца і прыходзіць да высновы, што

«На шалях дабра і зла
Няма раўнавагі ніколі».

Моцныя песімістычным матывы ў вершах зборніка. Думаецца, што ў сталым узросце ў кожнага чалавека яны пераважаюць, яны на падсвядомасці. А ў паэта яны — у радках вершаў.

«Жыццё — наканаваная нявола»;
«Нябачны ланцуг у волі».

Часам гэта крык душы, роспач, адчай:

«Вырвацца нельга
З прыгону жыцця.
Роспач і стома
Ў душы як дома.
Хочацца мёртвым зайздросціць...»

Паэту самотна ў гэтым жыцці. Такі настрой характэрны многім яго папярэднім вершам, і тут іх шмат.

«Застаешся адзін
Як кол.
А наўкол —
Чуж-чужына»;
«Застаўся я
Адзін як воўк
Суцешыць развітанне».

Але душа паэта марыць «аб праталінцы... ў завеі вечнасці», верыць, што «благое міне хоць на развітанне».

Драматычная гісторыя напісання геніяльнага верша «Як па сухому...» Гэты верш быў створаны ў самы страшны дзень жыцця паэта — 24 лютага 2007 г., калі ён знаходзіўся ў рэанімацыі, паміж жыццём і смерцю.

Як мы змагаліся за яго жыццё, як прасілі Усявышнага! «Жыві, жыві, жыві! Будзеш жыць, будзеш жыць, будзеш жыць!» — паўтарала аўтарка гэтых радкоў усе восем чорных дзён і начэй. І Рыгор, насуперак усім прагнозам дактароў, выжыў. Госпад пачуў нашыя малітвы.

На трэці дзень разам з запіскай ён перадаў нам гэты верш. Потым казаў, што вельмі баяўся забыць яго, баяўся, што не запіша. Але Госпад дараваў яму жыццё. Сапраўды, «калі Госпаду верыш, як Сын, то цябе і вада трымае...»

Зборнік мае назву «Халодная памяць вады». Кажуць, што вада захоўвае інфармацыю, захоўвае аб'ектыўна.

У вершах кнігі гэтая інфармацыя мае паэтычны змест і паэтычную форму. Але яна не халодная, яна жывая, у ёй душа паэта, яго перажыванні, жарсці, пакуты — «гарачыя вочы пажару».

Сваё паэтычнае і чалавечае крэда Рыгор Барадулін выказаў у радках:

«А прыходзіць на свет
Чалавек садоўнікам —
Гадаваць у сэрцы сваім
Госпаднее Слова...»

*Кс. Уладыслаў Завальнюк,*
*Ала Сакалоўская*

# на шалях дабра і зла

Самае страшнае
Ў гэтым жыцці –
Жыць...

на шалях дабра і зла

## Не паверыць...

Не развітаўшыся,
Жыццё прайшло.
І толькі
Затрымалася змяркане.
Сплыло вясло.
І човен павяло
Уткнуцца ўрэшце
Ў бераг наракання.

А бераг наракання,
Ён круты.
З яго відаць
Крыўдліва і далёка.
Прыслеплі
Смешнай зайздрасці краты.
Віна ўсміхаецца
Белааблока.

І на каго ні наракай
Цяпер,
Табе ўжо не паверыць
Твой давер.

*16 снежня 2007 г.*

## Непадуладны

Непадуладны той касе,
Якая ўсё жывое косіць,
Цярпліва час сябе нясе,
Нікога памагаць не просіць.

Ані сяброў, ані радні
Няма ў разважлівага часа.
На спадкаемца цішыні
Трывога пазірае ласа.

І сам сабе смяецца час,
І сам сваё кунежыць гора.
Не выстаўляе напаказ
Сваю знямогу непакора.

*20 мая 2005 г.*

## У чарзе

Час — праўнук Вечнасці.
І ўсё жывое
Ў чарзе стаіць,
Каб павітацца з ім.
І смутак —
Нечаканы пілігрым —
Паразвінаў забытыя сувоі,
Дзе ўсё, што будзе,
На пачатку дзён
Рукой халоднаю
Накрэсліў кон...

*8 ліпеня 2006 г.*

## Яшчэ не ноч…

І цемры хочацца прытулак мець.
Яшчэ не ноч.
Але далёка раніца.
Пазелянела поўневая медзь.
Самота з цішынёй
Ахвотна раяцца.

Мой сон блукае
Ў дажджавым трысці.
Мой неспакой
З маркотаю ў хаўрусе.
Знайсці сябе
Цягнуся ў забыцці.
І паступова
Цемраю раблюся…

*27 чэрвеня 2008 г.*

## Каб паспеў…

Нябёсы мастаку, як ліхвяры,
Час пазычаюць,
Каб паспеў адбыцца,
А не абы адбыць наканаванне.
Тут, на зямлі, штодня
Ісці з гары
Туды,
Дзе неўміручая крыніца
Вясёла зазвініць на развітанне.

Па незямных мастах
Свой цень мастак
У сваты пасылае да надзеі,
Каб доўг вярнуць свой
З гакам і не позна.
Бяроза радасці на веснавых лістах
Калыша цішыню і маладзее.

Ад прымакоў у Вечнасці завозна.

*2 студзеня 2006 г.*

## І нагадвае...

Вастравокі прыжмур стралы
І напятыя плечы лука.
Страх сцюдзёны на дне скалы.
І ахвяры святарная мука.

Гэта кволіць слова *было*,
Каб сустрэцца са словам *будзе*.
І нагадвае цемры святло,
Што жудзе беспрытульна ў цудзе.

*6 верасня 2008 г.*

## Успамін

Жыццё – ўспамін
Таго жыцця, якое
Павінен быў пражыць, ды не пражыў,
Якое кон суроваю рукою
Разварушыў і небасхіл прымжыў.

Жыццё – ўспамін
Самым сябе самога,
Якім не стаў,
Якім ты мусіў стаць.
Жыццё – дарога да таго парога,
Адкуль канец бясконцасці відаць.

Жыццё – ўспамін
Таго, што ўрэшце будзе,
Што стала на зямлі й на небясі.
Жыццё аднойчы заблукае ў цудзе.
Не вернецца назад,
Як ні прасі...

*11 красавіка 1998 г.*

## На шалях дабра і зла

На шалях дабра і зла
Няма раўнавагі ніколі.
У хітрай свавольніцы долі
Расплывісты почырк вясла.

На шалях зла і дабра
Ніколі няма раўнавагі.
У Вечнага Дрэва кара
Баліць ад няўвагі й знявагі.

Вясельная чарка й куцця
На шалях трывання й знікання.
Трывогі гарластая каня
Галосіць на лузе жыцця...

*3 кастрычніка 2008 г.*

## Прачынаемся…

*Хто сказаў, што ў гэтым жыцці*
*толькі раз мы былі маладыя?*
Су Дун-по

Узысці на нябеснай ніве
Нам аднойчы дазволіў сподзеў.
І, шчаслівыя ў шчырым наіве,
Маладзіць гэты свет прыходзім.

Час шануе
Стралу і стрэмя.
Нас ад нас
Аніхто не адыме.
Дзень пражыўшы,
Цішэем, старэем.
А раніцай
Прачынаемся маладымі…

*27 жніўня 2008 г.*

## З намі...

Дрэва кожнае на зямлі
Паўтарае Дрэва Сусвету.
Птушкі лёсу
Ў чорным галлі
Давяраюцца толькі ветру,

Што крылатыя
Весткі нясе,
Каб яны
Павіталіся з намі.

Мы ў Сусвеце –
Суседзі ўсе.
І Сусвет
З намі дзеліцца снамі...

*20 жніўня 2008 г.*

***

І вецер не ведае, дзе
Сустракаюцца
*Заўтра* і *сёння*.
Хто жадае
Сэрцу крыніцы біцца.
Час спакойна ідзе,
Ды яго не абгоняць
Ані думка,
Ні бліскавіца...

*21 мая 2008 г.*

## Каб не зябла...

Кожны крок на зямлі выпадковы.
Мройным зоркам
Зайздросціць жарства.
Ветрам нашы развеюцца словы.
З праху ціхая ўзыдзе трава.

Наабгон з вечарамі старэем.
Маладзее цярпліва труна.
Ці жывем,
Ці зямлю гэту грэем,
Каб не зябла ў Сусвеце яна?..

*25 мая 2001 г.*

## Мова камянёў

З усіх забытых
І замоўклых моў
Трывае толькі
Мова камянёў.

Яна яднае
Змрок і чысціню.
На ёй стагоддзі
Думаюць глыбінна.
На мове камянёў
Упершыню
Загаварыла ўпартая лавіна,

Каб счысціць
З ранішняй зямлі датла
Праклён прадоння
І людское смецце.

Спачатку
Мова камянёў была.
Пасля –
Маўчанне ў стомленым Сусвеце.

*5 мая 2008 г.*

## Непрычаканы...

Дзён менш і менш,
І любы́ з іх лю́бы,
Узгаднай птушкай
Шчабеча ў быллі.
Агні і воды
І медныя трубы,
І небыльніцы, й былі
Былі.
А можа, іх
Не было й не будзе.
І ты спадзяваннем адным
Жывеш,
Што зможа на схіле
Выбіцца ў людзі,
Як сын твой непрычаканы,
Верш...

*2 ліпеня 2006 г.*

## Халаднее...

Паміраць сабірайся, а жыта сей –
Крывічы спрадвеку казалі.
Гэты свет мне ўжо
Робіцца як музей
З экспанатамі ў кожнай зале.
З экспанатамі шчодрых страт,
З экспанатамі сквапных набыткаў.
Град прайшоўся
Па могілках град.
Зман
Туман сівавусы выткаў.

Долу годна ўкленчыўшы,
Вышыня
Давярае свой сон забаве.
Халаднее забытна
Музей штодня.
І зачыніцца неўзабаве...

*27 мая 2006 г.*

***

Як перад выраем,
Над стомленым табой
Душа, здаецца, лётае кругамі.
А лёс заняты ўсё яшчэ таргамі,
Зямнымі звадамі й падхмарнаю дзяльбой.

Табе пара ўжо
Ад таргоў і ад дзяльбы
Нічога не чакаць.
У іншым целе
Твая душа згуляе наваселле,
Абы табе аб ёй не рупіцца.

Абы...

*6 чэрвеня 2003 г.*

## Па-новаму...

Спачатку поўняю,
Як караваем,
Жыццё сустрэне шчодра,
А затым
Акрайчык ветаха за небакраем
Паабяцаны будзе,
Ды не ўсім.

Пралескі зорак,
Позірк апрамецця
Прыцемрыць вечарова
Сіні дым.

Тым і трымаемся
На гэтым свеце,
Што хочам жыць па-новаму
На тым...

*18 мая 2004 г.*

***

Зжаць загон нашых дзён
Больш як трэба жней.
Пад канец мы й не рады
Прыдбанаму смецццю.
Ды, пакуль яшчэ тут,
Думаем, што страшней
Напаткацца са старасцю,
Чымся са смерцю.

*31 мая 2003 г.*

## Omnia mea mecum porto

Усё маё з сабой нашу.
А дзе маё,
А дзе чужое?
Са згоды добрага настрою
Адно сваёй лічу душу.

Але, відаць, мяне душа
Чарговым лічыць
І трывае,
Пакуль разгубленасць жывая
Трымаецца таго каша,

Які заплеччу лёс нясе,
Ступаючы па каляінах,
Дзе вязнуць крокі ў напамінах,
Што свой адчай нясуць усе...

*23 лістапада 2006 г.*

## Чужэюць...

Сляды сырыя
Травой параслі.
Сляды старыя
Запалі снягамі.
Шукаючы іх
На глухой зямлі,
Ступаеш
Як не сваімі нагамі.

Сляды да радасці,
Да бяды
Вялі, ды разам
З табой прысталі.
Зямля раднее,
Чужэюць сляды
Перад сустрэчай
З расстаннем...

*4 студзеня 2001 г.*

## Пералётня

Каб час падняў павека небасхілу,
Убачыў бы,
Працяты нематой,
Зямлю, як занядбаную магілу,
Дзе радасць плача
Горкай сіратой.

Магіла –
Гэта пералётня тая,
З якой,
Стаміўшыся ад мітусні,
Душа ў маўклівы вырай адлятае,
Знябыўшы ўсе свае зямныя дні.

Спакойна радаснаму караваю
Саступіць покуць
Посная куцця.
Чужых магіл на свеце не бывае –
Мы ўсе радня па лініі жыцця.

*6 мая 2006 г.*

## Адпаведна

Па выбоінах часу
Падскоквае воз,
Што вязе і святло, і пакуты.
Кожны сам
Дакарае і няньчыць свой лёс,
Кожны сам да сябе прыкуты.

І цярпліва чакае
Кожнага дол,
Адварочваецца пагарда спіною.
І над кожным крыляе
Ягоны анёл,
Чорт бяздомны
Варушыцца пад рабрыною...

*10 чэрвеня 2007 г.*

## Ціха...

Цень ранішні,
Як дзень людскі, кароткі.
Цень вечаровы
Доўгі, як даўгі.
І дрэвы –
Цені незямной тугі,
Якую нам успадчынілі продкі,
Каб распавесці ціха
Сон жыцця
Нястомленаю моваю лісця...

*30 верасня 2005 г.*

## Відаць...

Ці, як жах, брысці
Па глыжах, па асці.
Ці, як човен, плысці
Па трымтлівым трысці.
Дзень вітаць, спачуваць
Ахрыпламу грому.
Ды, відаць, галоўнае
Ў гэтым жыцці
Не замінаць, як сабе,
Анікому...

*17 снежня 2007 г.*

***

Усё жывое –
Дым і цішыня,
Маўчун-валун
І рэха баравое.
І вышыні
Зайздросціць глыбіня.
І вышыня
Прыкінецца гарою.

А на гары
Гняздо саўе груган,
Каб крыламі
Смялелі груганяты.
І ветру наўздагон
Крычыць туман:
Хоць дол – мой дом,
Я, як і ты,
Крылаты...

*6 лютага 2008 г.*

## Будзіў...

Глухі званар
Будзіў глухія далі,
Аж рэхам папярхаліся званы.
І далі нешта
Званару шапталі.
І чуў званар,
Што ведалі яны.
Што не маглі,
Апроч яго, нікому
Даверыць
У няпэўнай цішыні.

І спавядаліся
Глухому грому,
Свой голас
Распазнаўшы ўрэшце,
Дні...

*16 сакавіка 2008 г.*

## Напомняць...

Прыстаўшы ад памкненняў хады,
Не дакрануўшыся да небасхілу,
Напомняць самі пра сябе гады,
Шкадуючы сваю былую сілу,

Якую парастрачвалі дарма
На безвыходнасці, багатай смеццем,
Так і не скінуўшы з сябе ярма,
На іх накінутага апрамеццем.

Але табе ўжо моцы нестае,
Неперабарліваму ў смелых тратах,
Пашкадаваць сябе й гады свае,
Ці як дзяцей,
Ці лютых паганятых.

*15 лістапада 2003 г.*

## Недарэмна...

Зялёнай зайздрасцю
Сенажаць
Не зайздросціць ціхім лясам.
Кожны павінен
Сябе паважаць
Сам.

Чоўну нясмеламу
Сцежку ў трысці
Лёгка згубіць.
Кожны стараецца
Ў гэтым жыцці
Быць.

Колас,
Які расце для куцці,
Недарэмна дрыжыць.
Самае страшнае
Ў гэтым жыцці –
Жыць...

*21 сакавіка 2007 г.*

***

Жыццё сабой занятае.
Яно
Увагі ні на кога
Не звяртае.
Гарыць агонь.
Чакаць умее дно.
Горб хоча выпрастаць
Гара крутая.

Усім нам ва́рыцца
Ў адным катле.
У лёса мы –
Як пасынкі ў айчыма.
Жыццё сабой занятае.
Але
За ўсімі сочыць
Пільнымі вачыма...

*10 снежня 2007 г.*

## Прызімак

Два апошнія яблыкі
На галодным суку
На дол у адчаі
Драўлянымі пазіраюць вачамі.
Кожны баіцца зваліцца.

Усё, як у садзе людскім, –
Хто за кім?

*1 лютага 2006 г.*

***

Таго не хапае,
Таго няма.
Жыццё праходзіць у мітушэнні.
А доля – скнара,
Яна дарма
Не пакладзе нічога ў кішэні.

І чалавек хапае, грабе,
І колькі ні ўхопіць –
Яму ўсё мала.
І цягне, як коўдру,
Туман на сябе.
І зорку пасе,
Каб яна не драмала.

Адно для трывогі
Багата прычын –
Не можа злічыць
Усіх сваіх схові́н.
І ўрэшце на немінучы спачын
Адвозіць яго
Безвясёльны човен...

*3 жніўня 2006 г.*

**Лягчэй...**

Думаць пра смерць
Маладому лягчэй,
Чым ледзьве жывому.
Не спяшаецца кон
З аселых плячэй
Скінуць засумавалую стому.

Маладому хапае шустрых вачэй
Бачыць толькі радаснае,
Затое
Ўцяміць да часу жывы хутчэй:
Усмешка Існага –
Наша жыццё зямное.

*15 лістапада 2003 г.*

***

Жыццё
Рыфмуе ўсё як ёсць —
Стагі й снягі,
Мілосць і злосць.

Нябыт,
Ад зайдрасці глухі,
Ані жадае чуць сугучча,
Бо ведае, што немінуча
Усё павяжацца ў мяхі
Няшчадныя.
А ў тых мяхах
Перад жыццём нямее страх.

Як ні стараецца
Нябыт,
Яму непадуладны
Міт...

*8 мая 2007 г.*

## Адно...

Я пачынаю разумець ваду,
Якой прабіцца хочацца з цямрэчы.
Я пачынаю разумець жуду,
Якой упалынеў настрой старэчы.

Я пачынаю разумець вясну,
Якой не зябка грэць сваю завею.
Я пачынаю разумець віну
Сваю.

Адно сябе не разумею...

*5 студзеня 2006 г.*

## Бадай што...

Я б падзяліўся
Смехам і плачом
Бадай што з пасівелым крумкачом,
Яму зірнуўшы ў стомленыя вочы,
Дзе пестуе крумкач
Свой сум прарочы
У станістага дуба на плячы,
Маўклівасці пазычыўшы начы.
Ды спілавалі дуб.
А крумкачу
І без мяне начлежыцца ўваччу...

*26 кастрычніка 2006 г.*

## Пані

Ёй каб што ўздыханні,
Заляцанні.
Ад прыхільнікаў няма праходу.
Самахоць смакуе асалоду
Старасць –
Незгаворлівая пані.

Несуцешная,
Сябе шкадуе,
Па растрачаных гадах сумуе.
Забывае ўсіх,
Сябе самую
Старасць помніць
Толькі маладую.

*12 снежня 2003 г.*

## Падзеліцца...

Штоначы засынаем
Ў беспрабудным наіве,
Што неба падзеліцца з намі
Снамі сваімі.

А небавы сны –
Зніклівыя аблачыны,
Плывуць
Да ветрам акрэсленай стараны,
Да сваёй незямной айчыны...

*7 снежня 2003 г.*

## Лёс не кожнаму...

Лёс не кожнаму
Па-сваяцку ўсміхаецца.
І ў багатага
Беднай хапае радні.
Чалавек,
Каб падоўжыць свой век,
Завіхаецца.
Гэтым самым
Свае дакарочвае дні.

*22 мая 2001 г.*

## Гузікі

Стагоддзі —
Гузікі, на якія
Зашпільвае Час
Свой святочны сурдут.
А ў Нябыта
Ад аднастайных пакут
Бычэе шыя.

Адарвуцца гузікі —
Новыя прышывае
Бясконцасць
Ніткамі бліскавіц.
Яблык разладу
Падае ніц.
Зажывае рана
Рана світання
Жывая...

*25 мая 2007 г.*

## Усіх...

Падвысіць неба
Хоча дах...
Сум дрэмле
Ў посахах яловых...
Вяльможна
Полымю ў карчах...

Галеча
Лічыць па ратах,
Смерць – па галовах,
Цемра – па вачах
Усіх жывых,
Часовых...

*5 лістапада 2007 г.*

***

Мінулае
Шматгулае,
А цішыня скупая.
Наступнае
Наступнае
На ўзгадкі наступае.

Сум радуецца рэшце
У радасці ў кішэні.
І цішынёю ўрэшце
Разменіцца цярпенне.

... Аж покуль не значэе
Слоў ранішніх значэнне.

*2 чэрвеня 2007 г.*

## Каб не мялела...

Жыццё –
Мітуслівая завіруха.
І людзі –
Зняверанеы снег,
Які
Вясёла растаіць
Вясна-шчыруха,
Каб
Дно не мялела
Ў Вечнай ракі...

*3 лютага 2007 г.*

## Позірк цішыні

Хто смялейшы,
Рызыка ці праца?
Хто мудрэйшы,
Цемра ці святло?
Ў кемлівасці вочы разгарацца.
Ў роздуму змаршчыніцца чало.

Рызыка адумаецца потым.
Праца цяжка дых перавядзе.
Толькі вечна маладым турботам
Не даводзіцца сустрэць нідзе

Позірк цішыні,
Каб у спакоі
За бяседным пасядзець сталом.

Вечны час залежыць ад настрою
Шустрай спрэчкі
Цемры са святлом...

*27 снежня 2005 г.*

## У мроях

Лета на цэлую восень
Старэйшае за зіму.
І зіма ледзянее ад пыхі,
Аж пакуль не растане.
Чоўну Вечнасці
Сон ацяжарыў карму.
Човен носам уткнуўся
Ў прыткі бераг вяртання.

Човен Вечнасці
Ў мроях Сусвету плыве.
Дно падсвечваюць
І дагараюць зоркі.
Кропля цёпла дрыжыць
У вясёлкі на перапялёсістым рукаве,
Губы патрэсканыя пагрэць аб яе
Цягнецца вецер золкі...

*30 снежня 2001 г.*

## Боль

І камень, і дрэва, і дым –
Жывыя яны.
А таму
Каменю молат баліць,
Дрэву – сякера,
Дыму – агонь.
Вядома, баліць таксама
Молату – непадуладнасць каменя,
Сякеры – ашчаднасць дрэва,
Агню – няшчаднасць дажджу.
Боль усё жывое трымае.
Болю не чуе смерць.
Смерць нямая...

*5 кастрычніка 2003 г.*

## Не маючы...

Калі б магла,
Трымалася б імгла,
Каб затрымаць
Прыход святла чаканы.
Атожылкі знішчаюць цень датла,
Не маючы
Ні ўдзякі, ні пашаны
Да тых,
Што з небам гутарку вялі
На гэтай
Імі знойдзенай зямлі...

*4 ліпеня 2007 г.*

***

Пасвечвае залысінамі тло.
Пажарышчы пазараслі лясамі.
Што сёння ёсць,
Ужо раней было.
Што будзе,
Некалі было таксама.

Зямлю мы пакідаем, кожны раз
Чакаць нас застаюцца
Нашы цені.
Спаконны гаспадар –
Спрадвечны час.
Жыццё згарае
Ў мітусні, ў трымценні.

*27 сакавіка 2004 г.*

## SOS

Калі адчуюць,
Што ідуць на дно,
Дык моляцца:
Ратуйце нашы душы!
А цела ані мору, ані сушы
Не трэба,
Бо часовае яно.

А як ўратаваць душу,
Калі
За ёй палююць
Слугі апраметнай?
Калі шляхі,
Што змовіліся з мэтай,
Мяцеліцы зняверу замялі?

Хмель маладосці
Давярай каўшу.
Хай радасць не заглушыць
Голас жалю.
Пакуль жывеш,
Шануй сваю душу.
І помні,
Што пакутуе чужая...

*5 ліпеня 2007 г.*

## Там...

Там,
Дзе нябыту ўсё знаёма,
За першароднаю ракой
Прытулак знойдзе неспакой.
Як дома будзе наша стома.

Там,
Дзе, напэўна, небасхілу
Не проста выпрастаць спіну,
Прымроіць даўніна вясну,
Што крыллям пазычала сілу.

Там,
Дзе сустрэнемся аднойчы,
І непрыязнікі, й сябры,
І ўвойдзем на глухім двары
Ў раку адну і тую ж двойчы,—
Сябе самога кожны сам
Успомніць і спазнае
Там...

*11 верасня 2004 г.*

***

Жыць – значыць жаць
Жыта смеласці,
Ячмень захмялеласці,
Авёс незразумеласці
Сярпом сподзеўным маладзічка,
Роздумным сярпом ветаха.
Скупы як тужэй
Сціскае снапы.
У шчодрага
Далікатныя перавяслы...

Якое жаццё –
Такое й жыццё...

*16 верасня 2005 г.*

***

Па жыцці
Мяне сцежка чакання вяла.
Ды яна давідна
Жаўталісцем запала.
Мне хапала марозу,
Мне хапала цяпла,
Мне хапала святла.

Мне сябе не хапала...

*22 кастрычніка 2006 г.*

## Жыві!

У вечнасці след на ілбе
Ад пацалунка бяды.
З сабою нават сябе
Не забярэш туды.

Час –
Човен на быстрыні.
Намеры –
Салодкі дым.
Жыві ў сягонняшнім дні,
Каб заўтрашні
Стаў тваім.

*19 мая 2005 г.*

## Якая рука...

Ліст трымціць
На галіне трывогі.
Ліст жыцця,
Што аднойчы зляціць.
Будзе восень яго залаціць.
Паляціць
На глухія разлогі
Ліст,
Каб доўг за сябе заплаціць.

Згіне,
Каб паўтарыцца вясною
Трапяткім і зялёным лістком.
Будзе ў неба
Ірвацца крадком.
Зноў жа
Над баразною пазною
Ён адчуе сябе
Дзіваком.

Схіласць
Снамі жыве маладымі.
Чуе ластаўку,
А не крука.
Ліст зляціць,
І якая рука
З долу вытаптанага падыме?
Жабрака
Грэе лёс жаўрука.

*10 лістапада 1996 г.*

## Тады й цябе...

Любіць жыццё —
Любіць сябе жывога,
Ды, ясна, не да самазабыцця.
Бо ты, аскепак рупнага жыцця,
На гэты свет прыйшоў
З дазволу Бога.

Адыдзеш — і забудзецца жыццё,
Што неслухам ягоным
Быў калісьці.
І словы,
Што люляць цябе кляліся,
Хутчэй
Уп'юцца ў памяць, як асцё.

І там,
Дзе будзе стылае начлежжа,
Дзе вечны адвячорак
Будзе цьмець,
Сябе ты паспрабуеш зразумець,
Але нямецьмеш,
Як глухая вежа.

Жыві й не думай,
Колькі ён заважыць,
З твайго загону
Прывідны ўраджай.
Пакуль жывы —
Жыві і заўважай
Жыццё,
Тады й цябе яно заўважыць.

*14 студзеня 2000 г.*

## Збудзь...

Гісторыя –
Суровая ўдава,
І добрае забудзе, і благое.
Ў яе сабой занята галава.
Маўклівасцю
Свае апёкі гоіць

Ад вогнішчаў,
Якія на зямлі
Разводзіць – каб сагрэцца –
Люд часовы.
Мільгаюць дні –
Вясёлыя чмялі.
Хмурэюць ночы –
Зморaныя совы.

Як жаўталісце –
І пяшчота, й люць.
Жыццё –
Наканаваная паклажа.

Што маеш збыць –
На гэтым свеце збудзь.
Той свет не шмат
Гісторыі падкажа...

*14 кастрычніка 2006 г.*

## Не знелюдзець...

Не знелюбець сабе самому.
Ў людскім віры не знелюдзець.
Сваю спакойна несці стому
І мову зла не разумець.

Яшчэ пачуць,
Яшчэ пабачыць
Хоць нешта ў зманлівым жыцці.
І за дабро дабром аддзячыць.
І ціха-ціха адысці...

*16 ліпеня 2006 г.*

## Хоць...

Прымі падзяку,
Лёсе,
За ўсё,
Што мне паслаў.
Хапіла мух у носе,
Спраў і бяседных лаў.

Сагрэлася завея.
Згас у вачах агмень.
І дзень мой карацее.
І карацее цень.

Як той туман, дымлюся.
Як Млечны Шлях, сівы.
Падміргваю спакусе.
Хоць з вечарам на *вы*...

*1 снежня 2007 г.*

## Аддаваць...

Гады зямныя –
На вадзе кругі.
Змятае час
Мітрэнгаў нашых смецце.
Жыць –
Значыць Богу аддаваць даўгі.
Хто без даўгоў –
Таго няма на свеце.

Кароткая сцяжына да бяды.
Дарога да бясхмарных дзён
Даўгая.
Нас даганяюць нашыя сляды,
Каб нагадаць,
Што мы жывем даўгамі.

Рака наноў
Шукае берагі.
Буцян ладзьбуе
Гнездзішча на коле...

Жывыя могуць аддаваць даўгі.
Таму жыццё й не скончыцца
Ніколі!

*5 жніўня 2005 г.*

# ціха ўкленчы нябёсам

Мама мяне
Усявышняму даручыла...

ціха ўкленчы нябёсам

## Мне светла...

Без Бога ні да парога –
Мамін наказ
Па жыцці вядзе.
Трывога –
Прыслужніца страху жывога –
Як ні стараецца
Дагадзіць бядзе,
У яе не выходзіць нічога.
Бог
Мяне не пакідаў нідзе.

Мне светла
Ад прарочыстых слоў
З мамінымі вачыма.
І, адыходзячы
Ў гаспадарства сноў,
Мама мяне
Усявышняму даручыла...

*13 студзеня 2007 г.*

## Як па сухому...

Дзень, як сын дачаканы, падрос.
Ціша стому вярнула дадому.
І ступаў малады Хрыстос
Па вадзе, як па сухому.

Тыя, што над вадой
І ў вадзе,
Ўсе нямелі ў нябесным здзіве,
Ведалі,
Гэта Сейбіт ідзе
Сеяць душы
На горкай ніве.

Досвітак загараўся і гас.
І рабіліся блізкімі далі.
Хвалі ўрэшце дагналі час
І Хрыстовы сляды захавалі.

Ростань выкне вініць успамін.
У сустрэчы сцежка крывая.

Калі Госпаду верыш, як Сын,
Дык цябе і вада трымае...

*24 лютага 2007 г., рэанімацыя*

## Слава!

Слава ў нябёсах і на зямлі!
Слава бясконца!
Нас мілатою сваёй наталі,
Сэрца Гасподняга сонца.

З цемрадзі роспачнай выведзі нас,
Ойча Адзіны.
Покуль агонь у вачох не пагас,
Дай нам ступіць на сцяжыны

Тыя, якія вядуць да Цябе
На пакаянне.
Дай нам убачыць, верным мальбе,
Вечнай надзеі світанне.

*9 лістапада 2003 г.*

## Шчырэць...

*Айцу Аляксандру Надсану*

Шчырэць
У святарнай сяўбе,
Госпадняе Слова сеючы.
Радзіму насіць у сабе,
Пакутныя душы надзеючы.

Жагнаць
Небадарным святлом
І вернікаў, і зняверaных,
Каб лёткім
Анёльскім крылом
Бясконцасць была адмерана.

Не зябнуць
У стылых мурах.
Трымацца крывіцкай шчырасці.
Спрыяць,
Адпрэчыўшы прах,
Спаконнаму дрэву вырасці.

Разложыстыя галіны
Узважаць грахі й правіны.
Спагадлівыя лісты
Расчуляць
Нястомнасць вярсты...

*19 мая 2007 г.*

## Іначай...

Жыццё –
Усмешка Госпада, й яе,
Пакуль ты кватаруеш тут,
Нябога,
На спадзяванні й на адчай стае
І на вяртанне да сябе самога.

Ты ўвесь як недабудаваны храм,
Заселены сп’янелымі сватамі,
Жыць мусіш тут,
Пакуль жывы,
А там
Усмешка ўжо іначай засвітае...

*21 лістапада 2004 г.*

## Anno Domini

Летам Гасподнім
Дайшло да мяне,
Што бальшыня майго веку
Мінула.
Рэштка сама
Без мяне праміне.
Смутак мой сам сябе
Ўсцешыць прачула.

Я адыду
І аднойчы ўзыду
З вечнай раллі
У Тваім успаміне,
Перахітрыўшы на момант
Бяду,
Ў лета Гасподняе
Не на чужыне...

*18 кастрычніка 1997 г.*

## Прыходзіць...

Потым ён робіцца
Бездапаможным віноўнікам
Вэрхалу.
Потым знішчае
Сябе безгалова.
А прыходзіць на свет
Чалавек садоўнікам —
Гадаваць у сэрцы сваім
Госпаднае Слова...

*1 снежня 2006 г.*

## На мове матчынай...

На мове матчынай
Душа да Бога
Звяртаецца з падзякай і мальбой.
На мове матчынай
Крычыць трывога,
Пакуль маўчыць неразгуканы боль.

На мове матчынай
Душа вітае
Чаканай раніцы першапрамень.
На мове матчынай
Імша Святая
На плён добраслаўляе рупны дзень.

На мове матчынай
Душа смуткуе,
У свет адчуўшы новы свой прыход.
На мове матчынай
У трапяткую
Раку жыцця ўцякае кожны род.

*30 чэрвеня 2005 г.*

## 28 чэрвеня 2004 года

Гэта лёсам пасланая
Ласка Тварца,
За якую душа
Вечна кленчыць гатова.
Ў Вечным Горадзе
З вуснаў Святога Айца,
Як з нябёсаў,
Пачуць беларускае слова.

Шмат забудзецца,
Счэзне, зніцее, міне.
А да скону запомніцца
Абавязкова —
Папа Рымскі
Добраслаўляе мяне.
І ў Яго як свая
Беларуская мова.

*1 верасня 2006 г.*

***

Шалом, Ерусалім,
Чалом, святое месца.
Святлом сваім амый і ацалі.
Нібы ў дзяжы, ў душы
Тут падыходзіць цеста.
Каб веры хлеб
Не звёўся на зямлі.

І нашых мрояў
Ластаўкі зямныя
У вырай сподзеву
Лятуць сюды.
Шкляныя зоры,
Ліўні ільняныя
Напіцца думаюць жывой вады.

Тут, як вачніца,
Зеўрае пячора.
Тут самаўкрыжаваўся небасхон.
Тут наша заўтра
Звечарэла ўчора.
Тут блізка Бог.
І ўсё пачуе Ён…

*1 снежня 1997 г.*

## Касцёл

Тут сон свой мроіць стомлены анёл,
Світае зрок нястомнае пашаны.
Апора духу, дом Свяцейшай Панны –
Нябёсамі асвечаны касцёл.
Каля яго бажэе ўсё наўкол.
І рабаваны быў, і руйнаваны.
Ды рунню веры цень укрыжаваны
Скароміў душ зняверaных падзол.

Ідуць смялей і нашае маленне,
І свечкі ў пілігрымку да святла.
І ластаўкамі зоры пад скляпенне
Лятуць – і адступаецца дакука.
Касцёл, каб свет не засціла імгла,
Да Бога цягнецца праменнарука.

*21 снежня 2001 г.*

***

Шчодры Госпадзе!
Усе ў Цябе
Толькі просяць,
І просяць, і просяць.
На Тваю нябесную восець
Пазіраюць ласа ў мальбе.

Хлеб надзённы з Тваёй рукі
І галодны бярэ, і сыты.
Млынары чакаюць, калі Ты
Ветру скажаш круціць ветракі.

Ветракі нашых марных дзён
Мелюць клопат зямны
З лянотай.
Вецер часу ўцякае ўпотай
За нязбытнасцю наўздагон.

Хочацца заставацца людзьмі.
Божа моцны, Божа вялікі,
Хоць падзякі нашай пылінкі
З далані Сваёй не садзьмі.

*23 красавіка 1999 г.*

## Маці Божая Будслаўская

Маці Божая Будслаўская святая,
Будзь у славе навечна і ў небе, і доле.
Ў нашых душах пакорных Твой вобраз світае.
Да Цябе пуцявін не забудзем ніколі.

Захлынала наш край за навалай навала.
Провідам са святла Ты нам ясніла вочы.
Ты Гасподняю ласкаю нас ахінала,
Даравала нам дзень, ратавала ад ночы.

Ад пагляду Твайго ўсё жыве навакола.
Прыпадае пакайна правіна з мальбою.
Да парогу Айца пойдзем схіленачола,
Маці Божая Будслаўская, за Табою.

*14 ліпеня 2006 г.*

## Малітва Матчына

Гаючыя словы малітвы Матчынай,
Якія Ён шаптаў перад сном,
Ісус паўтараў на крыжы,
Як на няўлоўнай мяжы
Між чорнай ноччу і белым днём,
Світаннем святое крыві пазначанай.
І ў кожным з нас нерастрачанай спадчынай
Жывуць, ратуючы нашыя дні,
Вяртаючы душы да вышыні,
Балючыя словы малітвы Матчынай.

*10 мая 2005 г.*

## Хвала пчале

З нялёгкім здабыткам пчала
Вяртаецца ў вулей з аблёту.
Крылатая кропля святла
Салодзіць зямную гаркоту.

У дня маладога з чала
Сыходзіць туман недаспаны,
А ўжо вылятае пчала
Шчырэць на лугі, на паляны.

У дружным старанні такі
Хай будзе наш рой, як пчаліны.
Збіраць нам сказалі вякі
Мёд ведаў у соты Айчыны.

Малітваю прэчым імглу,
Прыйсці да нас кемлівасць просім.
За кожны прамень, за пчалу
Падзяку Ўсявышняму ўзносім.

*9 ліпеня 2007 г.*

***

Светлая Апякунка раёў,
Што, як зорны ружанец,
Бурштынна раяцца.
Ветлая Гаспадарыня пчаляроў,
Што спрадвеку не ўмеюць
У працы стамляцца.

Дай руплівай пчале
Меданосныя дні,
Адчыні, адхіні патаемныя сховы
Там, дзе ліпа цвіце
Ў сонечнай цішыні,
Дзе жадана шугае пажар верасовы.

Ты багата дала
Беларускай зямлі.
Незямная ў сваім
Незямным непарушшы,
Молім: крыллям моцы дадай,
Каб маглі
Даляцець да нябеснай пасекі душы.
Амэн.

*13 ліпеня 2007г.*

***

Іспас,
Што яблычным імем завецца.

Прапахлі яблыкамі крыжы.
Шапчу сваёй палахлівай вейцы:
Не калышы слязу,
Не дрыжы...

Слязою яблык дрыжыць на галіне.
Раса дрыжыць на смутнай траве.
Хмурынка,
Лёгкая на ўспаміне,
У памяць незабыцця плыве...

*19 жніўня 1998 г.*

## Прыйдзе...

Баяцца кветкі абразіць дол,
Далей уцякае настрой панылы,
Калі абнізіцца мусіць анёл,
Каб нам напомніць
Пра нашыя крылы.

З якімі мы ў гэты свет прыйшлі,
Каб лётаць не толькі ў мроях,
Ды ўпарта мы прыраслі да зямлі
У хмарных сваіх настроях.

І крылы свае знебылі,
І вакол
Бяскрыла ляжаць небасхілы.

І лётае той,
Да каго анёл
Аднойчы прыйдзе
Прымераць крылы...

*25 снежня 2005 г.*

## І нанова...

Абгароджаны двор наш зямны
Частаколам грахоў сукаватым.
І ў бяседзе любой мы адны,
Бо над намі адчай –
Цёмным катам.

З грэху мы.
Грэх за намі ідзе
Рэхам цёплым
І ценем сцюдзёным.
Гэты цень на зямлі,
На вадзе
Мы жыццём называем
Штодзённым.

Каімся і нанова грашым,
Быццам мы
Без грахоў нежывыя.
Ад сябе безнадзейна бяжым.
А грахі –
Як слупы верставыя.

*5 верасня 1999 г.*

## Не тут

Дзверы вечнай начы
Вісяць на круках,
Чарнакрыларaспятых,
Глюгатых.
Ходзяць цені грэшнікаў на руках
Па зачараваных кратах.
У катлах закіпае смала
З сосен смутку,
Падсочаных жалем.
Пepатомленая імгла
Не дае сустрэцца скрыжалям...

*25 лістапада 2005 г.*

## Парабкаванне

Мы – парабкі ў дзён,
Нам пазычаных Богам,
Скупых.
Ды толькі няроўна
Падзелена клопатам рата.
Кароткая ў радасці раніца,
Быццам успых.
І доўгая ў роспачы ноч,
Як жыццё для вар'ята.

*5 ліпеня 1996 г.*

## Дасведчаная дабрыня

*Юрыю Стулаву*

Дня шырокая даланя
На высокім чале небасхілу.
Неакрэсленае птушаня
Знойдзе неразгаданую сілу
У крыніцы
З жывой вадой,
Што даверылі продкі нябёсам.
Трэба йсці
Маладой хадой,
Каб вачмі
Павітацца з лёсам.
...І дасведчаная дабрыня
Абароніць ад наслання...

*6 лістапада 2007 г.*

## На дне прадоння

Каля глухіх, зажураных вазоў,
Што запыніліся
На дне прадоння,
Ад першажаўранкаў да маразоў
Бяссонне ходзіць
З кайстраю рудою.

Вязе ўспамін на млын
Палын змалоць,
А на хаду заснуць
Спрабуюць колы.
Жыццё ёсць сон,
Які сасніў Гасподзь,
А нам яго распавялі
Анёлы...

*9 сакавіка 2005 г.*

## З далоні

Жаўранак абнашчыцца расінкай,
Падаллю насыціцца крумкач.
Крыўдаю,
Як чэрстваю скарынкай,
Папярхнецца сіроцінны плач.

Неба корміць жаўранка
З далоні.
Крумкача гадуе дол глухі.
Карані
У цемрадзі ў палоне,
У няволі ў яснасці
Вярхі.

І не чуе крумкату сырога
Пошчак,
Як вузельчык вышыні.
Жаўранак –
Іскрынка ўсмешкі Бога.
А крумкач
Не выбіраў радні.

*15 студзеня 1997 г.*

## За веру

*Памяці Росіцкіх пакутнікаў*

Смерць павыкасіць хоча
Жывыя лугі.
Толькі ёй не спыніць
Плынь балючай атавы.
Росіца –
Пасівелых хмараў стагі.
Тут раса дастывае,
Як прысак крывавы.

Тут спаконнае ў неба
З дымамі пайшло.
Тут далоні свае
Сашчапіла знямога.
Тут насланага ліха
Смялела жазло.
Тут наелася полымя
Стогну людскога.

Мусяць пастыры душ
У зямным жыцці
Адпаведнымі быць
Святому даверу.
Каб на вогненную Галгофу
Рашуча ўзысці
І згарэць
Разам з вернікамі за веру...

*31 ліпеня 2006 г.*

## Касцельны звон

*Шунічы Ямашыта*

Ад жаху пякельнага
У Нагасакі
Час аніяк
Не мог далічыцца дзён.
Разгублены задыяк
Свае пераблытаў знакі.
Апраменены небасхон
Сцяўся і анямеў.
Гэта Гасподні гнеў
Паўтарыў
Над зняверанай светам
Касцельны звон,
Які адзін ацалеў
З усяго, што жыло і трывала
Тут.
Каб клікаць на Страшны Суд.
Каб нагадваць, што розум
Быць мусіць цвярозым.
Бо, з апрамецця пакліканы,
Атам
Робіцца катам
Заклятым...

*7 сакавіка 2006 г.*

## Дзе тая?

Крыж нагадвае птушку,
Якая
На імгненне ў палёце
Застыла.
Цень ад птушкі ўцякае,
Знікае.
Карацее без ценю магіла.

Гэта ў вырай
Душа адлятае.
Беспакутна, нячутна,
Крылата.
І ў маўчання пытае,
Дзе тая
Мохам модлаў імшоная
Хата?

*30 красавіка 2000 г.*

## Згараючы...

Грозяцца жнеі нябыту:
Усё выжнем!
Страх просіць цемру:
Паднеб'е залі...
Свечка,
Зацепленая Ўсявышнім,
Гэта і ёсць
Чалавек на зямлі.

Свет малады яшчэ.
Цемра старая.
Стынуць сляды
На гарачай жарсцве...
Хліпкае полымя
Цені стварае.
Толькі згараючы,
Свечка жыве...

*13 жніўня 1997 г.*

## На ручніках

*Памяці Алеся Траяноўскага*

На ручніках маўклівую труну,
Як скарб апошні,
Давяраюць долу.
У скрухі не спытаўшыся дазволу,
Гукае сподзеў вечную вясну.

Хаваюць боль і роспач ад сябе
Цяжкія вочы,
Згорбленыя спіны.
Заплеччу ціха шэпчуцца ўспаміны.
Зярняты слёз пакорацца сяўбе.

Старэе зябка цішыня вякоў.
Душа шукае,
Дзе не спіць аблога.
І шырыцца да Госпада дарога
Са сцежак вышываных –
З ручнікоў...

*18 сакавіка 2005 г.*

## Досыць!

Мы самім сабе як успаміны,
Бо жыццё — салодкая гаркота.
З намі ад пачатку да канчыны
Наша беспрытульная самота.

Першым крыкам гэты свет вітаем
І на той маўкліва адыходзім.
Нам здаецца, што за небакраем
Смутак незямносцю залагодзім.

Наш прыход і адыход нікога
Не расчуліць, ані патурбуе.
Можа, толькі ганак Пана Бога
Нашых сценяў ціхі крок пачуе.

Мы — чаўны надзей і дамавіны.
Нам з грахамі мулка размінуцца.
Толькі немаўлячы сон нявінны
Зможа да нябёсаў дакрануцца.

*10 верасня 2004 г.*

## Ля Селішчанскага касцёла

Перажагнаўшы абсяг
Светлаценімі крыламі,
Бусел адпачывае
На яшчэ ацалелай вежы
Разбуранага касцёла.
Бусла вышыня благаслаўляе.
Касцёл трываліцца
Духам,
Намоленым праз вякі.
Камяні сцен
Далоняцца ў неба...

*11 жніўня 2009 г.*

## Балюча...

*Памяці Вінцэнта Гадлеўскага*

Жытнім коласам і васільком
Верніца кашулю вышывала.
А наўкол,
Накліканая злом,
Бушавала чорная навала.

Словы беларускія святар
Апранаў у шаты шчырай веры.
І няйнакш для іх
Спагадна дзверы
Адчыняў нябесны Ўсёўладар.

...А кашулю не надзеў святар.
Крывадушнасць цемру падкупіла –
Куля ў ноч калядную разбіла
Сэрца багавернага алтар.

Свечку цела згаслыя агні
У снягі балюча захінулі.

Гузікамі з вышытай кашулі
Доўга стыглі зоркі ў вышыні...

*20 снежня 2006 г.*

## На тое...

На тое Звышнім даецца радзіма,
Каб ведала сэрца,
Дзе біцца павінна.
Радзіму забыць
Ці набыць немагчыма.
Радзіма – дрэва Сусвету,
Галіна,
На якой сваю песню гушкае
Любоў небакрылай птушкаю...

*13 студзеня 2005 г.*

## Як думка

Палілі царкву.
І драўляны Хрыстос
З гарышча ўцякаў
З вяроўкай на шыі.
Агонь даганяў, як зняверааны лёс,
І храм
Ані гром, ані дождж не тушылі.

І рухнула
Абяззвоненая царква.
Хрыстос дагараў
На паваленым плоце.
І аддальвалася абгарэлая галава,
Як думка,
Далей ад ліповае плоці...

*1 студзеня 2003 г.*

## Хрост

У касцёле
Як не на ўсю Вушачу
Заходзіцца ад шчырага плачу
Толькі што акшчонае немаўляці.
Цяплей і ўтульней
Робіцца ў Божай хаце.
Падзяку Звышняму
І радасць пачатку
Жыццёвага падарожжа
Новы вернік пакуль што
Гэтак выказаць можа...

*14 жніўня 2006 г.*

## Калыханка

Ціхі сон здалёк ідзе,
Не спыняецца нідзе.
Ён спяшаецца якраз,
Каб да нас паспець у час.

Спі, праменьчык родны мой,
Бог схіліўся над табой.
Перакшчоную ў святле
Долю Ён табе пашле.

Спі, праменьчык залаты,
Волаты — твае браты.
Сёстры — зоркі ў вышыні.
Не злічыць усёй радні.

Над табой вякі плывуць.
Падрастай і дужым будзь
І душою, і плячом —
Беларусам, крывічом...

*9 жніўня 2006 г.*

## Радзімалюб

*Памяці Эдварда Вайніловіча*

Сум
Сон-траву на чужыне скуб.
Бязлітасны кон
Нагрувашчваў хмары.
А ён, зацяты радзімалюб,
Спяшаўся ўзвесці
Госпаду храмы.

Тапталі ногі
Чужыя палі.
Вялі ў забыццё
Сцяжыны чужыя.
І подыхам ветру
З роднай зямлі
Душа багавейная даражыла.

І як ні шалеў
Разгуканы гнеў,
Як дух нячысты
Свет ні знявечваў,—
На балючай радзіме
Храм ацалеў,
Каб стацца верніку
Домам вечным...

*17 красавіка 2006 г.*

## Знядзеленыя вочы

Світальна шчырае,
Таму й жыве
Святло ў душы –
Нябеснае святло.
І зайздрасць мружыцца
Сляпой савою.
Ад лютай немачы
Старэе зло.

У шчырасці знядзеленыя вочы.
У крэўнасці
Знадзееныя дні.
Агонь,
Да самазгубнасці ахвочы,
Свой след
Шукацьме ў зорнай вышыні.

*8 чэрвеня 2005 г.*

## Вераю

Род людскі не злічыць вякоў,
Свой узрост
Ён згадкамі мерае.
Ад навалы з усіх бакоў
Беларусь засланялася вераю.

Кожнаму па сваім каўшу.
Як бабылка,
Туга вячэрае.
Д'яблу не прадала душу –
Беларусь утрымалася вераю.

У нябёсаў святла стае,
Каб адпрэчыць хмурыну шэрую.
Адмаліўшы грахі свае,
Беларусь адродзіцца вераю.

*25 сакавіка 2005 г.*

## Трыпціх Чырвонага касцёла

*Айцу Уладыславу Завальнюку*

I
ЧЫРВОНЫ КАСЦЁЛ

З Чырвоным касцёлам на «ты»
Вятры,
Што лятуць з Бэтлеему.
І рупіць прачыстаму небу
Дзяліць з ім святло мілаты.

Господзь яго верніцы ў сон
Паслаў
Як абраз летуценны.
Імёны Сымона й Алены
Вяльмуе прарочысты кон.

Бажэе ў вяках небадол.
І душы жагнае трывога.
У цемначы тлуму людскога
Світае Чырвоны касцёл...

## II
## НЕ ЗГІНАЮЧЫСЯ...

Нарог нашай памяці
Мусіць араць
Аблогу зніклівасці
Ў высілках лютых.
Каб прывіднай радасці
Ўслед пазіраць,
Прыходзім у стомлены свет
У пакутах.

Ля зорак спагадлівых
Грэецца лёс,
Для душ нашых звіць
Намагаецца путы.
Крыжовы шлях,
Што пракладваў Хрыстос,
Нанова для кожнага
Значаць пакуты.

І кожны зможа
Сябе знайсці,
Мець сподзеў,
Што Госпадам будзе пачуты,
Калі ён здолее
Ў гэтым жыцці
Прайсці, не згінаючыся,
Праз пакуты...

## III
## НЯБЁСЫ ВЕРЫ

Нябёсы веры
Трымаюць свет.
Znявер'е горбіцца валунамі.
Зямныя дні,
Як вясновы цвет,
Спадаюць,
Каб паўтарыцца снамі.

Нябёсы веры
У вышыню
Кіруюць годна
Думкі й пагляды.
І зорным зернем
Поўніць сяўню
Світанню руплівому рады.

Вачэе мудрасць.
І слепне зло.
У хаце споведнай —
Насцеж дзверы.
І апранаюць душу ў святло —
Каб не азябла —
Нябёсы веры...

*26 жніўня 2006 г.*

# я забыўся, як бульба цвіце...

Жыву не тут,
Дзе пражываю дні...

я забыўся, як бульба цвіце...

## Дрэмле сон…

Сталіца сноў маіх –
Вушача.
Бо толькі там
Да гэтых дзён
Асвер пяе,
Бяроза плача,
Смяецца затанулы звон.

Сон
Мае памяць маладую,
Як ранішняя цішыня.
Ён моўчкі
Сам сябе гадуе.
Расце
Ад вечара да дня.

Світання сіняя сініца
Надзеяй цвеліць
Змрочны скон.
Жывеш –
Табе рэальнасць сніцца.
Памрэш –
Жыццё ўзгадае сон.

… А ў роднай хаце
Ёсць палаці,
Дзе дрэмле сон,
Што сніўся маці…

*19 сакавіка 2007 г.*

## Мой род

Мой даўні род
Пачатак свой вядзе
Ад крывічоў з паганскімі вачыма,
Што кленчылі
Зямлі, агню, вадзе.
Я думаю,
Яшчэ раней, магчыма,
Пачаўся ён,
Калі свой першы сон
Прысніў аціхлы прашчур у пячоры.
І дзіду ваяру закляў заклён,
Якую атрымаў ад непакоры.

Як сваякі, паганскія багі
Жылі спаконна з продкамі маімі.
Рака часін змяняла берагі,
Каб зноў вярнуцца ў іх
У новым імі.

На кроснах крозаў
Ткала палатно,
Каб ахінуць мой род,
Рупліўка доля.
Ад мудрых зор я ведаю адно,
Што не звядзецца род мой аніколі.

Ён вечны, як і вечная зямля
Крывіцкая,
І да мяне, й пасля...

*23 верасня 2006 г.*

***

Жыву не тут,
Дзе пражываю дні,
А там, дзе дні мае
Раслі са мною,
Атуленыя шчырай гаманою
Расчуленай зялёнай цішыні.

Імкнецца ўсё маё
Штодня туды,
Дзе зябне ў ноч завейную
Падпечнік.
Дзе Хатнік
Свой бярозавы падсвечнік
Нясе на кут,
Каб бачылі Дзяды,

Што ў хаце ён —
Руплівы гаспадар.
Чакае. Не спяшаецца.
Трывае.
Тут халадаецца душа жывая,
Забыць баіцца
Нетутэйшы сквар.

Тут мамін сум
Глядзіць яе вачыма.
Тут дні ў нябыт ідуць,
Каб па вясне
Нанова зарунець,
Але не мне,
А на мяне падобнаму,
Магчыма...

*8 лістапада 2003 г.*

## Шпакоўня

Шпакоўня на бацькавым вязе,
Якую я, няўседлівы школьнік,
Майстраваў і старанна ўзносіў,
Глядзіць на мяне
Сваім апусцелым вокам
З дакорам.
Мне так і чуецца
Ейны драўляны голас:
З мяне павылецелі шпакі –
Іх вырай паклікаў.
А ты чаго
З матчынай хаты вылецеў?
Ты, некалі чорначупрынны,
Як шпак,
Зрабіўся белагаловым,
Як наш туман.
Ты ўніз расцеш,
А я падымаюся ўсё вышэй.
...Прыросшы да вяза,
Шпакоўня цярплівая
На мяне пазірае звысоку.

*2 жніўня 2007 г.*

## Подых

Чаратовыя стрэхі
Пад першым снегам
Пахнуць ракой і луской,
Адлегай, начлегам
І адлегласцю.
А вятры маладыя –
Маленствам,
І зялёнымі ксцінамі,
І мясцінамі тымі,
Якія завуцца
Нашчаднай радзімай.

*25 кастрычніка 2005 г.*

## Падлётак

Пакуль мой смутак
Яшчэ не ляны
І сподзеў гняздо не пакінуў,–
Ляціць да родных мясцінаў
У сны
Вырай маіх успамінаў.

Там поўныя клопату халады
І ў крыўды
Самы пяшчотны дотык.
Адстаў і не дагнаў чарады.
Абзімаваў
Маленства падлётак.

*30 верасня 2002 г.*

***

Сны маленства майго залатога,
Як цвет вясновы,
Апалі.

Дарогі юнацтва былога
Пад пылам ссівелага часу
Прапалі.

Маршчынаў матулі сівыя скрыжалі
Душы дзяцей наморшчылі
Гадамі жалю.

*12 студзеня 2005 г.*

## Зябка

*З лясочку вернецца,*
*А з пясочку — ніколі...*
Мамін прыгавор

Маленству хацелася падарожжа.
І калі ад'язджаў хто
На цягніку,
Здавалася,
Ён вярнуцца не можа,
Як тое зязюльчыстае «ку-ку».

Прасцей ад'язджалася
У дамавіне.
Яны недалёка маўчалі, клады.
І смутак,
Як вераб'я на мякіне,
Абвесці лёгка было тады.

У тым маленстве
Бесцягніковым
Заносіла мроі ўдалечыню,
Адкуль вярнуцца
Льга толькі словам,
Дзе горача ў пяты
Паганцу агню.

...Паездзіў,
Наколькі хапіла змогі,
Аж стаў рыпець,
Як стары вазок.

Цяпер ужо зябка
Ад блізкай дарогі,
Што кліча ў лясок,
Дзе сыры пясок...

*24 лютага 2000 г.*

***

Каса й сякера,
Малаток і цэп,
Здаецца, ўчора
У руках маіх спявалі.
І на стале світаў
Надзённы хлеб.
Валамі соннымі
Хрыбты ўгіналі ўзваллі.

Ды час пайшоў
Са мною на размін.
Ужо смялей з мяне
Пакеплівае праца.
І кожны новы год
Як напамін
Усё пра тое,
Што пара збірацца...

*3 студзеня 2009 г.*

## Вузельчыкі на памяць

Вузельчыкі зялёныя на памяць
Старанна яблыні пазавязалі,
Каб не забыцца цёплыя імёны
Вятроў і тумаnоў,
Што іх з пяшчотай
Ад маразоў і ліўняў баранілі.
Лісты панашапталі пра сваё.

Ды ападуць вузельчыкі й лісты.
І яблыні згалелыя чакаць
Налецця будуць.
І спакойны снег
Ім нагадае
Цвет і рой пчаліны.

Каб зноў вузельчыкі паназавязваць
І думкамі пра лета
Ў сцюжу грэцца.

P. S.
А мне сарока скінула пяро.
Я запытацца так і не паспеў,
Пра што мне напісаць,
Што не забыцца
Занатаваць
У сінім сшытку неба.

Ды што ні занатуй –
Сатруць хмурынкі.
Ёсць вочы й галава –
Запамінай!

*1 ліпеня 2006 г.*

## Вогнішча

Памяць – гэта вогнішча,
І языкі агню
Ўхапіцца як далей стараюцца.
Вечарэе вогнішча.
І раніца
Ані паварушыць цішыню.
І чуваць,
Як у прычахлым прысаку
Недагаслыя іскрынкі пырскаюць...

*23 ліпеня 2006 г.*

## Адказ рэху

– Якую ўспамінаеш маму?
– Добрую.
– Якую шукаеш маму?
– Светлую.
– Якую гукаеш маму?
– Шчырую.
Бог пасылае маці
І забірае,
Каб сыну да апошняга дня
Шукаць,
Гукаць,
Успамінаць,
Упарта верачы, па-чалавечы,
Што станецца Дзень сустрэчы.

*10 ліпеня 1999 г.*

***

Мама
Радзей пачынае сніцца.
Ці ўсе клопаты
Забрала з сабой
І часу не мае?
Ці застаецца мала
Да нашай сустрэчы?

*18 лістапада 2008 г.*

***

Я забыўся,
Як бульба цвіце
Безнадзейнадаверлівым цветам.
Як Пярун,
Развітаўшыся з летам,
Кленчыць кожнай зялёнай вярсце.

Я прыглух у чужой тлумаце.
Цішыня
Мне ўжо стала сакрэтам.
Пяўся
Паразумецца са светам,
А забыўся,
Як бульба цвіце...

*23 ліпеня 2009 г.*

## Зялёнае людства

Дрэвы –
Тыя самыя людзі,
Толькі ўпарта адданыя
Роднай зямлі,
Дзе пясчынку кожную
Перамацалі каранямі.
У рукастым галлі
Птушкі недасяжнасці
Гнёзды звілі.
Цені густа ўцянелі,
Каб магла
Праявіцца праява.

У зялёнага людства
Нашаптаны аблокамі
Ветраны лёс,
Што здавён заклінае
І сляпы агонь,
І глухую сякеру.
Векавечнасць ступае
Маладымі сцежкамі кроз,
Тоячы ў сэрцы галодным
Паганскую веру...

*18 ліпеня 2008 г.*

## Неразгаданая...

Дзе першаслед замроенага продка
Лагодна стыў на ранішняй траве,
Дзе хмаркі смутку зносіла паводка,
Дзе паважала вышыня падлётка, –
Неразгаданая душа жыве...

Быў першаслед
Сагрэты Млечным Шляхам.
Не шкадавала хмара жалю
Слёз.
Падлётак стаўся вольнакрылым птахам
Вяртання ў вырай сноў
Пад родным дахам.

Цвікамі зорак
Дах той гонціў лёс...

*23 верасня 2005 г.*

## Запросіны

Усе мае,
Якія ўжо не тут,
Прашу вас
На маўклівую бяседу.
З Дзядамі ўпоплечкі
Саджу на кут,
Даверыўшы
Дарогу ўспомніць следу.
Хай ён
Сюды здалёку прывядзе
І вёсны шчырыя,
І смех забыты.
Хай сум
Даручыць
Пілнаваць бядзе
Балючыя
І камяні, і пліты...

*6 красавіка 2003 г.*

## Крэўнае

Родная старана,
Ты – незагойная рана,
Схаваная
Ад вока чужога
Старанна.
Душа без цябе
Лодкаю без стырна
Б'ецца ў халодныя
Берагі тугі.

Ты, як душа, адна,
Крэўная старана…

*23 чэрвеня 2007 г.*

## Экспромт

Дзень добры, месяц мой,
Дзень добры, цёплы люты!
Сагрэй мяне зімой.
Хай будзе сум пачуты
Па той зіме,
Калі
Ляцелі ў радасць сані.
Далёкія былі
Апошнія расстанні...

*1 лютага 2000 г.*

## Імяніны...

Я дома...
Тут кожнае дрэва – радня.
Нябёсам над мамінай хатай высока.
І каб не праспаў імяніны дня,
На досвітку будзіць мяне сарока.

Дзякуй ёй!

*10 чэрвеня 2004 г.*

***

Асланяе брамку ў родную хату
Зялёная аблачынка бэзу.
Комін надвор'ю
Плоціць квартплату.
Гэтулькі золата
І не снілася Крэзу,
Колькі гарыць
На подзе ў шчытку.
Шчыток хавае дым за шчаку.
Чалеснік чарнее.
Адвячорак аднекваецца:
Цур, не я...

*3 верасня 2009 г.*

## Перачытваю...

Столь у мамінай хаце
Ў самотных сучках,
Як неба ў прыцьмелых зорках,
Яшчэ нада мной высока.
Столь, як паэму лесу,
Чытаць па габляваных радках
Не стамляецца вока.

З якіх баравін,
З узлескаў якіх радкі,
Каго запытаць
І якой парою,
Калі ты і сам падсочаны
На беразе высокай ракі,
І жывіцы ўжо нестае
І тваймý настрою...

Перачытваю паэму паволі,
Бо не за гарамі той дзень,
Калі
Мой клопат
Згубіць свой след на зямлі.
І ў самай нізкай апошняй столі
Ані сучка ўжо не ўбачу болей...

*26 ліпеня 2006 г.*

## Нанізаць...

Камяні з брукаванкі,
З роднай Каменскай вуліцы
Нанізаць на нітку тугі,
Каб атрымаўся ружанец
Для вечаровай малітвы
Па ўсіх вушацкіх,
Якіх не хапае мне,
Як баравога спакою...

*27 чэрвеня 2007 г.*

***

Прыспаны змрок.
Шыферны дах.
Першакласнік дождж
Па складах
Чытае слова чаканае
Пе-
      ра-
            пы-
                  нак...

*13 жніўня 2009 г.*

## Таксама...

На пні спілаванай яліны,
Амаль заімшэлы, сяджу.
Плывуць успаміны.
Маўчаць аблачыны.
Спякота чакае дажджу.

Не хоча прамень забывацца,
Што быў нядаўна агнём.

...І гэта таксама праца –
Паціху рабіцца пнём...

*24 ліпеня 2008 г.*

***

Праз яшчэ зялёны
Небасхіл яблыні
Праразаецца
Азяблая Вечарніца.
Нясмелая сінічка яблыка
Падае на дол сперапуду.
Здаецца,
З-пад небасхілаў гэтых
Не адлучаўся я
Анікуды...

*17 жніўня 2009 г.*

***

Сінічкі раннія спевы
Спрабуюць давесці да ладу.
Зялёныя зоркі спеюць
У небе старога саду.

Хапае журбе разгону,
Каб аблачынкай стацца.
З успомненага палону
Не хоча душа вызваляцца.

*25 ліпеня 2008 г.*

## Вясціны

Няўжо з Сарочына прыляцела
І пад вакном маім села сарока?

Світанню смела,
Бярэзіне бела.
Вачам шырока.
Смутку глыбока.
Вясцінам з роднае стараны
Цёплакрока...

*21 чэрвеня 2007 г.*

***

У прыхмараным небе
Маладзенькі крумкач
Стараецца правільна
Картавіць *р*.
Крапіва зморана пахне
На запусцелым гародзе.

Гэта было калісьці,
Ці ёсць цяпер,
Ці ўзгадаецца
У загаданым годзе?..

*21 жніўня 2009 г.*

***

Курку топча певень,
Вулку — халадок.
Бялеюць бровы
У далягляда
І ў дзеда.
Валун не баіцца
Адлежаць бок.
Сама сябе
Весяліць бяседа.

Усё, як у даўнім жыцці,
У сне
Напамінаецца палахліва.
Не спудзь крыло,
Што свой цень кране,
Які забыццё
Прыспала раўніва...

*28 лютага 2008 г.*

***

Мітуслівая шляхта –
Местачковыя верабʼі
Ля базарных вазоў
Балявалі ў ахвоту.
Тут бяседы былі,
І любошчы, й баі,
І над цёплым грудком
Перспектыва для ўзлёту.

Весялеў верабʼём
Мой настрой малады
І трымцеў над вазамі
З мяхамі настрою.
Зноў я тут.
Ды прысталі
Гады ад хады.
Іншыя верабʼі.
І мястэчка не тое...

*6 ліпеня 2008 г.*

## Вушацкая сасна

Калыска й роднай хаты
Бёрны
З вушацкае сасны.
І дні малолі
Часу жорны.
І везлі сны
Чаўны.

Люлялі аблачыны
Сосны,
Дзе спалі перуны.
Сарочку долі
Ткалі кросны
З вушацкае сасны.

Калі заціхне
Над труною
Зямная гамана,
Хай вырастае
Нада мною
Вушацкая сасна...

*22 снежня 2008 г.*

***

Адвячорак той самы.
Крык той самы малечы.
Той самы пясок.

Ля брамы,
Згорбіўшы плечы,
У хату просіцца змрок
Пагрэць
Свой смутак старэчы...

*25 жніўня 2009 г.*

***

Засохлая ігрушына —
Як застыглае вогнішча.
Парэпаныя языкі агню,
Затоена стогнучы,
Усё яшчэ цягнуцца ў вышыню.
Каб прыпячы
Хоць пяткі начы,
Якая
Нябачна ўцякае,
Капрызна знікае.

*2 ліпеня 2008 г.*

## Суседзі

А з суседзяў усіх
Толькі дрэвы
Яшчэ засталіся.
З імі добра ўзгадаць,
Памаўчаць, пажурыцца.
Як калісьці,
Вясне давярае
Наіўнае лісце.
І паганскую існасць
Кволіць памяць —
Лірычная жрыца.

Я малю даўніну,
Каб яшчэ патрывалі
Суседзі.
Каб ні лютыя маразы,
Ні ўраганы
Іх не кранаці.
Бо, пакуль яны
Цягнуцца ў неба,
Маю спадзеў,
Што ў тым невядомым недзе
Па-зямляцку мяне абаўюць
Ціхімі каранямі...

*10 ліпеня 2008 г.*

## Ноч у дарозе

Вецер засуквае рукавы
І ад нецярпення
Абтрэсці яблыкі
Аж заікаецца.
Дождж падае
На ліст крапівы
І не баіцца,
Што абстрыкаецца.
Ноч у дарозе.
Ў трывозе ўсе,
Што яна ў хатулі нясе?..

*30 ліпеня 2007 г.*

## Дагасанне

Небасхіл звечарэў абнылa.
Чыйсьці дзесьці здарожыўся лёс.
Восень роздумна запаліла
Памінальныя свечкі бяроз.

Полымя маладзее бухмата.
Дагасанне – куды ні зірні.
Не дагнаўшы набытак,
Страта
Спавядаецца цішыні...

*25 кастрычніка 2004 г.*

***

Люляюць старыя яблыні
Яблыкі,
Як унукаў.

Люляе блізкае неба,
Як унучак,
Зоркі.

Дзядуля-час
Маўчыць і ведае,
Што вечны
Толькі ён...

*27 ліпеня 2009 г.*

***

У маленстве радасць –
Свет прызнаў за свайго.

У юнацтве радасць –
Надзея за небасхіл вядзе.

У сталасці радасць –
Яшчэ ўсё можаш.

У старасці радасць –
Яшчэ ты тут...

*4 сакавіка 2009 г.*

***

Каб зрэзаць галінку
З дрэва цемры,
Забылася ціхі нож
Ноч скупая.
Па Млечнай Брукаванцы
Басанож
Думка ступае.

*7 сакавіка 2009 г.*

***

Запалі
Магіл утравелыя грудзі.
Цішыню спавіваюць імхі.
Зрудзелай ігліцы
Дождж сухі
Спрабуе
Разбудзіць беспрабуддзе.

Сосны растуць
Са спаконнага праху
На новыя труны
Ў ахвяру страху...

*20 чэрвеня 2008 г.*

## Спрэчка

Мянташка з касой
Над рэчкай
Гарачай грэюцца спрэчкай:
— Тупая,
тупая,
тупая!..
А тая
Не саступае:
— Мянташка
І ёсць мянташка.
Меньціць
Языком шурпатым
Не цяжка.
А ты паспрабуй
Цярпенне абуй
Ды пакасі
Таўстаногі быльнёг.
Гаспадару
Спірамідзіцца стог.
А табе
Ані дзякуй,
Ані мерсі...

*22 жніўня 2009 г.*

***

Прыгадвае свой цень
Пачутае.

Душа глядзіць,
Як цела пакутуе.
Не цешыцца й не спачувае.

Маўчыць на магільніку,
Як на хутары,
Крыўда жывая...

*3 ліпеня 2009 г.*

## Зноў дома

Думцы ўвішна.
Настрою ўсцешна.
Вейкамі вішняў
Заснежана сцежка.

Светла сцежцы.
Козытна ўсмешцы.

Кожны закутак
Дабрэе навінай.
Нашчыцца смутак
Слязой вераб'інай...

*16 мая 2006 г.*

***

Абсягу адсутна і нема.
Час едзе
На ціхіх хвілінах.
На карце зімовага неба
Азяблыя рэчкі галінак.

І сябе не прысніўшы,
Сівее
Зялёны ўспамін ліставея...

*3 сакавіка 2009 г.*

***

Конь
Спакойны, як стол...

Верабей нахохлены,
Як габрэй нахохмлены...

Брукаванцы
Баляць мазалі
Ад падковаў і колаў...

Хмялеюць кухлі
У мураванцы...

Не спяшаецца
Заходзіць сонца...

У небасхіла
Зацякла спіна...

Прысніла сама сябе
Рэчка ўвечары...

Мястэчка...
Маё малечае...

Сніцца мне
Ўсё часцей...

*5 чэрвеня 2009 г.*

***

Певень голас падае
Як з перапою.
Выбірае конь
Ласейшую траву.
Восень цэдзіць цеплыню
Рукой скупою.

У гадах забытых
Зноў жыву...

*25 жніўня 2009 г.*

***

Шчырэйшага болей нікога няма
За перадвясновую завіруху.
Ад белага смеху цяплее зіма,
Забываючыся на сцюдзёную скруху.

Забельваць і чарнату, й галізну —
У завірухі светлая праца.
Пад старасць
Зіма ўжо чакае вясну,
Баючыся не дачакацца.

*18 лютага 2001 г.*

## Трыумвірат

Зіма не хоча адступіцца.
Бярэзінкам хоць адубей.
З усмешкі лужыны
Напіцца
Чакае зябка верабей.

Таўром адлегі
Пратаўрона
Ралля.
Пачаў туман гарэць.
Настылым каркатам варона
Сябе стараецца сагрэць.

І галадрэвіны карчамі
Тырчаць у пространі
Адны.
Звініць, звініць,
Звініць ключамі
Сінічка –
Ключніца вясны...

*27 сакавіка 1997 г.*

## Ці не гэткі?

Сакавіты сакавіцкі снег
Пахне і адлегай, і вясною.
Ці не гэткі снег
Смяяўся Ною,
Як да Арарата плыў каўчэг?

Самавіты сакавіцкі снег
Пахне і трывогай, і расстаннем,
Як і той,
Што можа стаць астатнім,
Дзень мой,
Завяршыўшы крутабег.

Несярдзіты сакавіцкі снег
Пахне праламкамі і вірамі,
Ператомленымі сівярамі,
Што шукаюць для зімы начлег.

*5 сакавіка 2001 г.*

## Перазімавалі...

Красавік ступае нетаропкай хадой
Па ўзроўю,
Па ўзваллю,
Па хлуду.
Вераб'і купаюцца ў лужыне маладой,
Шчаслівыя да перапуду.

На вадзе на ўвесь рот
Смяюцца кругі,
Як гукі на карнавале.
У вераб'ёў ані крыўды, ані тугі –
Не лёталі ў вырай.
Тут зімавалі...

*17 красавіка 2005 г.*

## І потым...

Кажух зялёны накінула поле
Ад пуні да небасхілу.
Бульба выйшла з падполля,
Каб легчы жывой у магілу.
Каб саграваўца
Халодным потам
Ды паміраць што сілы
У цемры цяжкой.
І потым
Устаць маладзейшай
З магілы...

*10 сакавіка 1998 г.*

***

З сухой аблачыны
Ад дажджу ахінала
Іголкай маланкі
Шыць пачала навальніца,
Ды йголка ў стог перасохлы ўпала.
Іголка знойдзецца –
Швачка чакала,
Пакуль не пачаў стог
Дрымотна дыміцца.

І ў навальніцы
Заўсёды мокрыя плечы.
А як бы было ахінала дарэчы!

*9 снежня 2002 г.*

## Прапажа

Похапкам паліць Пярун
Лучыну нервовую бліскавіцаў,
Каб у цемрачы адшукаць
Пярсцёнак,
Які прымяраў на мезенчык.
А той пакаціўся, круглы, як рэха,
У далёкае некуды.
Пярун толькі бачыць,
Як бліскаюць босыя пяткі дажджу.
А ён, зніцелы, худы,
Уцякае куды?
Што шукае?

*1 кастрычніка 2002 г.*

## Чуе дном...

Возера
Сярпом маладога лядку
Дажынае апошнія травы.
Бярозы,
Надсмакаваныя туманом,
Шурпацяцца неўзнаку.

Човен,
Зачэплены за сук каравы,
Глыбіню ўхаладзелую
Чуе дном...

*1 красавіка 2000 г.*

## Дзе ветрава радзіма?

То сінімі — ад азярын — вачыма,
То пабялелымі — ад завірух —
Шукае вецер,
Дзе яго радзіма,
Ствараючы захмарны, марны рух.

Знаёмаю журбой
Запах ядленец,
Здаецца,
Нарадзіўся вецер тут.
Ды затрымацца самавысяленец
Не можа,
Каб прыпомніць родны кут.

Знянацку прыхінулася лагода
Да гулкага пляча.
Ці не яе
З мясціны гэтай блізкай
Ветру шкода
І, дзе б ні бег блуканец,
Нестае.

З дня нарачэння
Да недасканчэння
Шукаць сябе ён будзе,
Як наноў.
Нідзе сваю радзіму не сустрэне,
Не звязаны дакорам каранёў.

*20 красавіка 2003 г.*

***

Птах вёслакрылы
У прасцяг імкнецца.
Заспаная вышыня
Яго вабіць.

Усхваляваная глыбіня
Хоча закружыць яму галаву
Вірам.

Адно спакойна
Дно чакае.
Яно сваю патаемную
Непазбежнасць ведае...

*15 ліпеня 2009 г.*

***

Выходджу на ганак,
Разрываю ілбом павуцінку,
На якой дажывае
Зажаўцелая лісцінка
З яблыні.

Павук папярэдзіў,
Што лета развітваецца...

*3 жніўня 2009 г.*

***

Страх на гарышчы заціх
І вочы заплюшчыў.
Паспела нешта
Прысніцца знічцы.
Ноч прымярае
Новую апранаху.
Пералічваюць на даху
Драніцы
Мокрыя пальцы дажджу...

*11 сакавіка 2008 г.*

***

Сонца прачнулася.
Матылёк заспаны
Б'ецца ў шыбінку дзверцаў
Майго пакойчыка
У падстрэшшы мамінай хаты.
Куды, бывае,
Да мяне радкі залятаюць,
Як матылькі.

Гэта нейчы родны дух
Будзіць мяне...

Выпускаю матылька
Ў раніцу
Бліжэй да неба.

Хоць яму
Магу падараваць волю...

*1 жніўня 2009 г.*

## Настраёвае

Цішыня, як падвялае сена,
Растрэсена.
Восень хмарыць даверліва
Бровы густыя.
На яшчэ неадпалымнелай бярэзіне
Галавешка вароны
Картава стыне...

*16 чэрвеня 1999 г.*

***

Сухарукі сад...
Пасівелы
Пенсіянер дзьмухавец...
Няўпэўнены плот...
Ветравухі дах...
Бесцырымонны палын...

Забірае ўсё да сябе
Зайздрослівавокі ўспамін...

*12 чэрвеня 2009 г.*

***

На паганскім капішчы
Местачковы магільнік.
Надтрунні бязладна цісну́цца,
Як у чарзе ў недалёкі рай.
Певень склікае курэй,
Што разбрыліся
Па бязлюдным падворку,
Шукаючы манну нябесную
Ці мяздрыстую znічку –
Сунічку даспелую,
Якая з лагодай салодзіць
Аблачынку травы...

*11 ліпеня 2006 г.*

## Арэц

Цёплы клопат мяне бядзіць,
Як патрапіць у песню,
Дзе
Сіў-арол сядзіць,
На ваду глядзіць.
Веташок плыве па вадзе.

Дзірваны ўзараў
Той арол-арэц
Сівых аблачын,
Туманоў.
Перуну прайграў
З вышынёй гулец.
Пагубляў арол
З сініх сноў
Сыноў.

У таго арла
Клопату пагарла,
А сцюдзёны клопат –
Як лёд.
Пасівець арлу
Памагла імгла.
Веташок на сход,
А туга на ўзлёт...

*10 сакавіка 1995 г.*

***

Аблавухі вятрак
Дабег да мяжы
І сказаў
Даўгалыгаму ценю:
— Пастаю тут,
А ты бяжы
Напярэймы
Свайму здзіўленню.

Цень пабег
І знік уначы.
А вятрак на мяжы
Разважае,
Ці яму чакаць,
Ці ўцячы.
Скарга ветру
Яму чужая.

Ветраку ўтульна
Думаць вушамі.
Вышыня цішыню
Суцяшае...

*21 снежня 2008 г.*

***

На лясным магільніку
Дрэвы цягнуцца з праху.
І будуць з іх
Смутныя плахі,
Зацятыя дамавіны.
І ўзаўюцца яны
Дымам у неба.

Каб праслязіліся аблачыны...

*6 ліпеня 2009 г.*

## Зямляцкі трыпціх

*

І халодны камень не стрымае слёз,
Слухаючы, як сабака ў цемначы
Жаліцца на свой сабачы лёс...

*

Жне цішу маладзічковы серп.
Пра волю
Хоць словам якім перакінуцца
Сабакам на ланцугах няўсцерп...

*

У дварах местачковых паснулі цені,
А сабакі да самай раніцы
Абмяркоўваюць апошнія паведамленні...

*3,15,16 жніўня 2007 г.*

***

У падстрэшшы мамінай хаты
Будзіць мяне пачынаюць
Вушацкія пеўні
Неапахмеленымі галасамі.
Пасля насцярожаныя,
Але ўпартыя вераб'і
Празрыста чырыкаюць.
І нарэшце сарока –
Быццам нехта
Скіпае сырую лучыну
Да гэтага часу
У век электрычнасці.
А сабакі
Не забываюцца нагадаць,
Што яны не звялі вачэй,
Але пасаромеліся
Гучнабрэха
Будзіць мяне,
Каб наноў прывыкаў
Да забытай цішыні...

Дзякуй усім!

*9 жніўня 2008 г.*

## Прыляцелі...

Гэта з вятрыстае Верасовачкі
Прыляцелі сарокі ў двор
Яшчэ раз мне нагадаць,
Што ад хутара нічога не засталося.
І цвеляць з імі ляцець
Сароку з зялёным крыллем –
Бярэзіну растрывожаную.
А ёй ніяк ад зямлі
Не адарвацца...

*23 жніўня 2004 г.*

## Адвячорак ля мамінай хаты

Скрусе цяплей
З прысмеркам у хаўрусе.
На губах палыновых
Прысмак ростані горкі.
Яблыкі дрэмлюць,
Як перад выраем гусі.
Праз зялёныя крылы
Прарастаюць рахманыя зоркі.

*31 жніўня 2005 г.*

***

Мама ткала
Кужаль туманоў.
Шыла мне кашулю
Голкамі бліскавіц.
Прышывала
Гузікі зорак.
Кашуля ад мамы
Не мае зносу.
Вольна ў ёй мне
І маёй душы-хутаранцы…

*29 ліпеня 2009 г.*

## І чуе...

Малога мяне за правіны
У вугал мама стаўляла.
Каб каяўся, каб цішэў.
Шалёны, чорначупрынны,
Дуросцю ажно кішэў.
Было мне пагрозаў мала.

Сівога ўжо на змярканні
У вугал жыццё стаўляе
Пакаяцца за грахі.
Стаяць за плячыма цені.
І чуе мой шал глухі,
Як плача крыўда малая...

*16 сакавіка 2003 г.*

## Адкажы...

Маміны рукі –
Калі яны спалі?
Маміны вочы –
Калі спачывалі?

Мама,
Дзе вякуюць яны,
Вочы твае,
Рукі твае,
Голас твой,–
Адкажы мне.

*20 верасня 2002 г.*

## Маміна слова

І на пачатку Слова было,
І слова было ад Мамы.

Маміна слова
Мне свет гадавала.
Анёл далікатны самы
Браў слова маміна пад крыло,
Каб на яго
Ні дажджынкі не ўпала.

Маміным словам
Малюся й хварэю,
Маміным словам
Баюся й смялею.
Маміным словам
Жыву!

*2 ліпеня 2007 г.*

## Хоць нешта

Маміны вочы слухалі неба.
Маміны рукі чыталі луг.
Маміны ногі гадавалі дарогу,
Каб, па ёй ідучы няспешна,
Мог прачуць я і скеміць
Хоць нешта...

*17 мая 2005 г.*

***

Жыццё –
Кароткі шлях на кут.
Да шчасця ў двор
Замкнёна брама.
І дзень і ноч чакала тут.
І там
Мяне чакае мама.

*18 красавіка 2004 г.*

***

Ты сабе, душа,
Свабодна лётай.
Я дабуду тут
Зямную рату.
Чую, кліча мама
З неахвотай.
Клікала не так,
Бывала, ў хату...

*15 мая 2009 г.*

***

Рана
Цямнее ўсё навакол.
Прачнуцца пазней
Пачынае падабацца світанням.
Як у маленстве
За мамін падол,
За жыццё трымаюся
Перад развітаннем.

Але штораніцы,
Штоначы
Жыццё стараецца
Ад мяне ўцячы...

*12 студзеня 2007 г.*

## Застаўся...

Няхай бы я змалку
Хадзіў за плугам,
Нагамі босымі грэў баразну,
Чакаў у сваіх мясцінах вясну,
Паказваў сцежку
Вятрам-валацугам.

Але прывабілі
Вырaі слоў.
Мае памкненні й падумкі
З імі.
Бацькоўскі кут
Мяне ўжо не прыме,
Бо ён застаўся
Ў даліне сноў...

*12 верасня 2007 г.*

## Іншапланецянін

Я іншапланецянін –
З той планеты,
Дзе ўсё наскрозь
Крывіцкае было.
Дзе не таіў Пярун
Свае сакрэты,
Дзе называлася цяплом святло.

Дзе выграбалі з печы
Прысак зорны.
Карова цёпла дыхала ў хляве.
Дзе рух Сусвету
Паўтаралі жорны.
Пень свежы
Грэўся ў маладой траве.

Глыбей хавалася ў зямлю
Карэнне.
Біў човен лбом
Да іскраў у вачах.

Там помнілі
Пра першы дзень тварэння.
Плуг
Баразной яшчэ гарачай пах...

*17 чэрвеня 2006 г.*

***

Калі люляўся ў пупышцы,
Нецярпелася
Свет убачыць.

Зялёны,
Цягнуўся пакратаць блакіт.

Зжаўцелы,
Прыкідвае, дзе зляцець.
Каб долу аддзячыць
За тое,
Што адчуў вышыню.

Кожны раз
Упершыню...

*5 верасня 2009 г.*

***

Кожны існы
Сам сабе чужы,
Покуль ён не дойдзе пазнавата
Да тае таемнае мяжы,
Дзе стаіць прыцішаная хата.

У якой абранніка даўно
Зачакалася паненка Доля,
Хмелячы цярплівае віно,
Дні блуканца кволячы ў прыполе.

У расхваляванай цішыні
Можа ўцяміць,
Ашукаўшы стому,
Што застаўся з усяе радні
Родны толькі ён
Сабе самому...

*24 жніўня 2006 г.*

***

А што яшчэ
Мяне трымае тут –
Сябры, ўспаміны
Ды бацькоўскі кут.

Але штогод
Сяброў радзей, радзей.
Сплываюць успаміны
Без надзей
У памяці трымацца
Да канца.
І хата да апошняга вянца
І глухне,
І паціху асядае.
Старэе ўсё.
Хіба што маладая
З нябытам заручоная туга.

... І нешта затрымалася
Чарга...

*9 жніўня 2006 г.*

## Меней...

Малечыя гады,
Яны паўсюль з табою,
Сябры тваёй жуды,
Твайго сівога болю.

Для смутку дзён стае.
Шляхі ў спакой хлудзеюць.
Старэеш, а твае
Ўспаміны маладзеюць.

Лёс сцішвае ганца
Усіх тваіх памкненняў.

Чым меней да канца,
Тым да пачатку меней...

*9 чэрвеня 2006 г.*

## Няўжо...

З бацькоўскай хаты
Ад'язджаеш кожны раз
З надзеяй зноў ступіць
На ціхі ганак.
Ды кепліва глядзіць
Аднекуль час –
Ён гаспадар
Хвілін тваіх чаканых.

Вось ён якраз
Вяртацца не прывык.
Паўсюдны,
А свайго не мае й ценю.
Няўжо
У яго нябачнага трымцення
Няма сцяжын
Ні простых, ні крывых?..

*25 жніўня 2006 г.*

## Журба нерастрачаная...

*Радзіма маладзіла,*
*А чужына — старыць...*
Васіль Быкаў

Чужына
Калючая, як ажына.
Радзіма
Ласкавая, як мурава.
Дадому вяртае
Паненка сцяжына.
Праводзіць упрочкі
Трывога-ўдава.

І дзе б ты ні быў,
Пра сябе нагадае
Журба нерастрачаная,
Маладая...

*26 верасня 2007 г.*

## На гарадскіх хутарах

Нібыта з вайны —
Біты друз, каміны.
Дзічэюць сады.
Дзічэюць сабакі
І выюць на Месяц.
Забылі яны
З гаспадарчай рукі прысмакі.

А горад кепліва
Наступ вядзе
На двары, на ціхія стрэхі.
Дарогу ўступаючы лебядзе,
Плечы ўгінаюць лехі.

Гаспадарамі пакінутыя,
На гарадскіх хутарах
Сабакі пілнуюць
Паганскі страх.

*26 снежня 2005 г.*

## Даганяючы вякі

Заходняя Дзвіна
Даганяе вякі,
А па дарозе заходзіць
У Полацак,
Каб на распагоджаных хвалях
Палюляць Сафійку,
Што, як лілея,
Узбегла берагу на плячо
І затрымалася.
Сафійка ведае,
Што рака часу
Не забудзецца на яе
І не пакіне ў самоце...

*13 чэрвеня 2007 г.*

## Як жар

Спадчынных мясцін
Наіў і здзіў
Прытулілі далячыні й высі.
Не вярнуць сябе таго,
Што быў,
Не вярнуць таго,
Чым жыў калісьці.

І, як жар у печы качарга,
Развярэджвае ўспамін
Туга...

*24 жніўня 2006 г.*

## Задажджыла...

Бясхмарныя леты,
Дзе вы?
Гукае ўспаміны ганак.
Шуміць пшаніца залевы
Пад спевы сярпоў маланак.
Не хоча імжа густая
Скарыцца сонцавым стрэлам.
І раніцу певень вітае
Голасам адсырэлым...

*7 жніўня 2006 г.*

## Туды,

Дзе першы снег наўскач
Пабег па цішыні.
Туды, дзе першы смех, як снег,
Растаў ад дабрыні.
Туды, дзе грэюць халады
У гурбах сны вясны.
Туды, дзе першыя сляды
Дасюль ідуць адны...

*22 верасня 2006 г.*

## У адпаведнасці з настроем

Вяртаюся ў думках туды,
Дзе смех мой
Жагнае чаіца.
А сам адыходжу туды,
Адкуль не вяртаюцца.

І радасны шум, і тлум
У цішыню высылаецца.
Душу засяляе сум,
А смех высяляецца.

Як той перад зносам дом,
Шапчуся з вятрамі.
Маўчыць без'языкі бом,
Павесіўшыся на браме...

*8 студзеня 2000 г.*

## Іду

Іду
Да землякоў,
Дзе іх няма ўжо там.
Дзе ні дзвярэй, ні брам,
Ні клямак, ні замкоў.

Іду
Ў гасподу сноў,
Дзе ўсе жывуць яшчэ.
Куды душа ўцячэ,
Каб паўтарыцца зноў.

... Адпрэчыўшы жуду,
Сустрэць сваіх
Іду...

*27 чэрвеня 2007 г.*

## Вякі і землякі

На сцежку забыцця
Апошні ліст спадае.
Малечыя сляды
Адводзяць ад бяды.
Радзіма — гэта там,
Дзе мама маладая,
Дзе ты не пачынаў
Лічыць свае гады.

Вандроўніца душа
Вяртаецца дадому.
Не можа вышыню
Забыць двухкрылы дах.
Без крэўных каранёў
Сваім не стаць чужому.
Самоту ў край бацькоў
Кіруе Млечны Шлях.

Жывеш датуль, пакуль
Жыве ў табе Радзіма,
Пакуль з тваёй рукі
П'юць песні жаўрукі.
Пакуль на свет глядзіш
Бацькоўскімі вачыма,
Здалёку пазнаюць
Вякі і землякі.

*1 верасня 2009 г.*

**Чужы...**

Галініўся
Зялёны гай
Жаданых землякоў,
Радзіны.
Як свята,
Быў бацькоўскі край,
І кожны дзень –
Як імяніны.

Сум карчаваў
Вясёлы гай.
Час сек
Самотныя галіны.
«Трываем мы,
І ты трывай», –
Шапталі
Родныя мясціны.

Пачаў
Дамоў спяшацца дзень.
І цені следам
Цягнуць шыі.
Застаўся я адзін
Як пень.
І ўсе атожылкі –
Чужыя...

*14 лютага 2007 г.*

## Дзе можна...

Хоць ёсць куток,
Дзе і памерці можна,
Пайсці спакойна
Да сваёй радні,
Люляць тугу
Даверыўшы вяльможна
Глухім галінам –
Зданям цішыні.

А на галіны
Прылятуць вясною
З паганскай пракавечнасці
Лісты.
І па рацэ
Світальнага настрою
Сны паплывуць,
Як познія плыты.

А расчытаць лісты
Паможа зорка,
Што развітальна
Ўзыдзе нада мной.
Палын, як успамін,
Запахне горка.
Маўчанне
Папярхнецца гаманой...

*21 мая 2006 г.*

***

Я прашу шаноўную цішыню,
Што пануе над цэлым светам,
Даравацъ маю мітусню,
Падахвочаную імпэтам.

...Горбіў плечы
Малечы плач.
Панядзелак вітаўся з аўторкам.
Смех мой бег
За рэхам наўскач,
Каб дагнаць
За суседнім пагоркам.

Маладыя звінелі дні,
Не хацелі паддацца скрусе.
...Я аднойчы
Прыйшоў з цішыні
І ў яе
Замаўчаць вярнуся...

*19 ліпеня 2008 г.*

***

Зрабіўся белым марны прах.
Заснула немата глухая.
З гадоў малечых
Першы страх
Сябе забытага гукае.

Не выдасць сэнс
Сваіх кладоў.
Сябе ратуе стомай праца.
Усё,
Што выйшла з халадоў,
Павінна ў халады вяртацца...

*21 лістапада 2000 г.*

## Каб мог...

Калі я аднойчы
Свет гэты пакіну,
З крывіцкіх паданняў
Змайструйце мне дамавіну.
Закрыйце вочы
Маміным словам *сыночак*.
Велікодным світаннем
Труну ахініце.
Зацепліце васілёк
У даверлівым жыце.
Забіце века
Вушацкіх жартаў цвікамі,
Каб мог павітацца вясёла
Я з землякамі...

*23 кастрычніка 2008 г.*

# паміж тлом і святлом

Нябачны ланцуг у волі...

паміж тлом і святлом

***

Не першы прыйшоў я
На гэту зямлю
І не апошні яе пакіну.
Час адсявае
Людскую мякіну,
Зярняты кідаючы ў араллю.

Зярняты неразгаданай тугі
У араллю вякоў загаданых.
Трава забыцця
На нябесных палянах
Расце, захлынаючы берагі
Ракі напаміну,
Якая
Вар’яцтву віроў патакае.

*11 красавіка 2008 г.*

## Пакуль...

Пакуль збіраўся жыць,
Жыццё прайшло.
І ўсё як ёсць
Зрабілася мінулым.
Прыкінулася прыцемкам святло.
Злічыла радасць
Дні свае агулам.

Што з памяці няпрошана сплыло,
У сэрцы безназоўна засталося.
Згніло з чаўна,
Што ў заўтра вёз, вясло.
Журба звіла
Вянок з пустакалосся.

Ужо мой цень
Чужы на той мяжы,
Якая то знікае,
То ўзнікае.

І што сабе ў суцеху ні кажы,
Цішэй шуміць
Бяседа гаманкая.

*17 мая 2006 г.*

***

Яшчэ на гэтым свеце
Жыву,
А часам падасца,
Што ўжо дажываю.
Надзея як тая
Вада дажджавая,
Якую збіралі,
Каб мыць галаву.

Дажджы начуюць
У той старане,
Якая ўжо
Да мяне не прыйдзе.
І я да яе.
Мы абое ў крыўдзе.
І толькі смутак
Душу кране,

Што, як апошні туман,
Плыве,
Які разгубленасць затрымала.
Забытых дзён
Застаецца мала.
І валасоў
На цяжкой галаве...

*1 лютага 2009 г.*

## Пацярпі...

Душа,
Пацярпі мяне,
Хоць я табе знадакучыў,
Пакуль з пазахмарных кручаў
Страла мой туман не пратне.

Чыёй ты была да мяне,
Цярпліва ў цябе не пытаю.
Чарга да цябе – нібы тая
Жывая даўней на млыне.

Табе не самотна адной,
Запрошанай на пагасціны.
Даруй мне мае правіны,
Пакуль ты яшчэ са мной...

*4 мая 2003 г.*

## Звіняць...

Шаргункі пад дугой
Адгулі-адзвінелі.
І паспелі вяселлі
Папярхнуцца тугой.

Ні дугі, ні каня,
Ні на шчасце падковы.
Толькі сум верасовы
Слухае цішыня.

І звіняць праз вякі,
Мроям дорачы сілу,
Пад дугой небасхілу
Жаўрукоў шаргункі...

*26 лістапада 2007 г.*

## Каб...

Вочы радасці
Здзіўляцца прысмерклі.
Рукі клопату
Шчырэць здранцвелі.
Ногі памяці
Вяртацца прысталі.
Небасхіл недасяжнасці
Старэць пачаў.

Каб задумацца...

*12 снежня 2006 г.*

## Спачувае

Кожны дзень,
Як дрэва ўспаміну,
Мае свой пень
І сваю вершаліну.

У зварушлівай вершаліне
Гнеў раз'юшаны стыне.
Ля пня
Ў пацярусе
Спачувае крыўдлівай скрусе
Прысталая цішыня...

*21 студзеня 2006 г.*

***

Усё цяжэй насіць свае гады,
Але яшчэ цяжэй
Расстацца з імі.
Не разумееш, покуль малады,
Што груз з тваіх плячэй
Ніхто не здыме.

Ты мусіш дагаджаць
Гадам сваім,
Каб на цябе
Яны звярнулі ўвагу.
Каб з вогнішча жыцця
Салодкі дым
Падмаладзіў
Разведзеную брагу,

Якую піцьмеш
З поўнага каўша,
Адшчодранага
Скупаватым конам.
І пасвятлее
След за небасхонам.
І пасмялее
Ціхая душа...

*28 красавіка 2009 г.*

## І помніць...

Калі адпачыць наважыцца дзень,
А цемра яшчэ негустая,
З гасподы ценяў
Выходзіць цень,
Нібы з-пад зямлі вырастае.

І помніць цень
Кожны кут,
Які
Ім быў
У бывалым жыцці абжыты.
Туды глядзіць
З-пад нябачнай рукі,
Адкуль
У дарогу збіраюцца міты.

Сустрэць яго
Тужыцца позірк дарма,
Ён непадлеглы
Святлу, ні трымценню.
Слядоў
У няіснага ценю няма.
У ценя няма
І празрыстага ценю...

*15 сакавіка 2008 г.*

## Трывожнай ахвотай...

Застаешся адзін
Як кол.
А наўкол –
Чуж-чужына.
Марыцца
Цярплівасці вол.
Хрыпне
Неспакою жаўна.

І жыцьмеш
З капрызнай самотай
Трывожнай ахвотай.
Пакуль,
Як зляжалы град,
Пясок пасыплецца
На апошні твой спрат.

...Дажджынка бяссонна
На зыбкай галінцы дрыжыць.
І ёй, безабароннай,
Хочацца жыць...

*27 кастрычніка 2007 г.*

## Не пакінуць...

Ад былога мяне
Толькі ймя й засталося.
І за ўсё, што збылося,
Дзякуй шчырай мане.

Бо яна ад мяне
Жорсткасць свету таіла.
Боль калючы гаіла
На чужой старане.

Як зямля прыхіне,
Адыду ў шлях далёкі,
Толькі ймя ды аблокі
Не пакінуць мяне...

*25 мая 2008 г.*

## Няпэўнасць

Усё ў мінулым
Неабмінулым
Як быццам стала
Няпэўным гулам.
Усё самотнае
Знікла агулам,
Легла на дно
Каменем затанулым.

Са дна няпуджанага
Не ўсплывае
Ні сон, ні нават
Памяць жывая...

*26 лютага 1996 г.*

## Журлівае

Усё, як той вецер золкі,
Прайшло.
Прайшло,
Як праз вушка йголкі,
Праз зло.

Прайшлі дасвецці й змярканні,
І сны
Сплылі, каб вярнуць расстання
Чаўны.

Сплыла журба аблачынаў,
Ільдзін.
І ты застаўся для напамінаў
Адзін.

*26 снежня 1999 г.*

***

Відаць, мне цяжка будзе паміраць,
Бо неяк лёгка да жыцця прывык.
І змоўкне смех —
Мой кеплівы дарадца.
І здзівіцца з сябе самога
Крык.

І цішыні пакрыўджуся на стому,
Кіўну на развітанне гамане.
Ды як я адыду,
Бадай, нікому
Ўсё гэта нецікава,
Як і мне.

*11 мая 1996 г.*

## Слядамі дажджоў

Ішоў я слядамі дажджоў,
Падступнасць канаў
Абмінаў.
Ды так я і не знайшоў.
Ды так я і не дагнаў.

Пачаў адставаць ад хады.
І цень ад мяне адстае.

Дажджы пазмывалі сляды
Свае.
І, вядома, мае...

*20 снежня 2007 г.*

***

Ноч кроіла цемру на
Шапатлівае ахінала.
Нажніцы бліскавіц давідна
Тупіліся, й стала мала
Часу,
Каб ноч наўскач
Паспяшалася за далягляды.

Акравак цемры –
Крумкач –прыгадваў зорныя ляды.

І рупіліся карані,
Каб вершалінам сніцца.
І ўпала ў раку цішыні

Кропліна блакіту –
Сініца.

І як сябе ні інач,
Табе не дадуць забыцца

Акравак цемры –
Крумкач,

Кропліна блакіту –
Сініца...

*5 жніўня 2008 г.*

## Усё яшчэ...

Я не спяшаюся.
Няма куды
Спяшацца
І надзеі, і адчаю.
Прыстаў ад беганіны
І хады.
І сам сабе
Развагу пазычаю.
А дробны дождждык клопатаў
Імжыць.
І выглядае стома,
Дзе прылегчы.
І толькі думка
Ўсё яшчэ бяжыць.
Ёй рупіць,
Як да ісціны дабегчы.

*30 кастрычніка 1999 г.*

## Смутнае

Прасеяў вечар
Рэдкімі рашотамі
Стамлёны змрок.
І цішыні стае.
Як ператлелы жар,
Зграбаюць лісце жоўтае.
Як дні мае.

Пераглядаць
Даводзіцца адносіны
З тугой, і са смугой,
І з нематой.
А на млыне
У ранняй восені завозіны.
І неспакой.

Дзень ніцавокі
Неўпрыкметку менее.
Лятуць чароды ў вырай,
Як дамоў.
Аблокі з дрэвамі
Абменьваюцца ценямі.
Не чуць грамоў.

На свет са спадзевам
Атава точыцца
З-пад страху
Крумкачовага пяра.
Сказаць сабе самому
Так не хочацца:
Прыйшла пара.

*5 кастрычніка 1999 г.*

***

Пераходзяць па мне,
Як па мосце,
Ягамосці гады
Ад берага весялосці
На бераг нуды.

Я стаў ад іхнай хады
Худы,
Калісьці бясхмарны
І малады...

*17 красавіка 2008 г.*

## Жыву...

Дрыжу над кожным днём,
Прызнаным ціхай скрухай.
Я рад сустрэчы з пнём,
З сарокай-сакатухай.

З людзьмі ажно ў запас
Хапіла мне сустрэчаў.
Таму,
Хто лёс мой пас,
Я ўдзячна не пярэчыў.

Хто дасць кажух віне
Маёй азяблаплечай?
З усімі, хто ўва мне
Жывуць,
Жыву сустрэчай.

*9 мая 2002 г.*

***

Збіраючыся, затрымацца.
А гэта значыць –
Жыць і жыць.
Пакуль траву
Трывога мацае,
Агонь гарыць,
Вада бяжыць.

Пакуль цябе,
Нашчадка Ноя,
Не выстаўляюць напаказ,
І за сваё,
І за чужое
Яшчэ не клічуць даць адказ.

*24 красавіка 2009 г.*

## Не скажа...

Ад ненадзейнай галіны
Пажоўклы ліст адарваўся.
Але не ўпаў на абыякавы дол –
Зачапіўся за ценькую павуцінку.
Так і дрыжыць ні жывы ні мёртвы
Спаміж зямлёю і небам.

Ці доўга яшчэ дрыжэць засталося,
Не скажа ягоны ветраны лёс...

*11 жніўня 2006 г.*

## Рака й чалавек

Рака з берагоў выходзіць,
Рака рашуча мяняе рэчышча,
Каб не вярнуцца назад.

Чалавек выходзіць з сябе,
Мяняе спакой на трывогу,
Мроячы некалі вярнуцца ў сябе.

Ад ракі адракаецца старыца,
Ад чалавека – ўспамін.
Ад самоты горкне палын.
Чало нябеснае хмарыцца.

Рака й чалавек –
Абое
Абнашчаныя й аблашчаныя
Журбою...

*10 студзеня 2006 г.*

## Куды?..

Часовы на гэтай зямлі,
Нічога мой цень
Не заважыць.
Калі я адсюль адыду,
Вядома, ніхто
Не заўважыць.

І тут быў чужым я,
І там
Сваім
Мне не стацца нікому.
Адбыўшы належныя дні,
Куды мне вяртацца дадому?..

*17 ліпеня 2007 г.*

## Лічыць...

Як рашчына з дзяжы,
Выпіраюць мазгі.
Я сабе ўжо чужы.
Дый не так дарагі
Той,
Што ўсіх на зямлі
Забірае ў зямлю.
Не спытаеш,
Калі
Ў стомленую пятлю
Сціcне туга туга.

... А ў згалелым галлі
Цені лічыць чарга...

*7 ліпеня 2007 г.*

## Твае

Ці хмурыць бровы
Твой пан настрой,
Ці лашчыцца радасць —
Чужая паненка, —
Належыць толькі сабе самой
Душа твая —
Вечная перасяленка.

Спяшаешся, морышся ад хады
Па сцежках, вытаптаных імшою.
Ідуць не з табою твае гады,
Яны ў цябе
Стаяць над душою.

*27 снежня 2002 г.*

## Следам...

Дрымотнай павуціны
Шоўк
Акрыў чало паляне.
Застаўся я
Адзін як воўк
Суцешыць развітанне.

Цень вогнішча ляснога
Змоўк.
Сум разбудзіла жрыца.
Я нікаю
Адзін як воўк,
Каб страху заіскрыцца.

І следам за ваўкамі
Знікаю,
Замаўкаю...

*2 чэрвеня 2007 г.*

## Самотны воўк

Былі ваўчыныя вяселлі.
Руя халодная была.
Сябры трапялі ў пасткі,
Пселі.
На голад не хапала зла.
І не аднойчы быў жанаты.
Не звык і плесціся ў хвасце.
Былі ваўчыцы й ваўчаняты.
Канала здобыч на хрыбце.

Гаспадару зірнуць у вочы,
Чыіх авец перацягаў,
Не дазваляе гонар воўчы.
Дасюль чуваць сабачы гаў.

Поўсць пасівіў нахабны іней.
Сцяжкоў чырвоных крык замоўк.
І ў полі волю гаспадыняй
Адну прызнаў
Самотны воўк.

*13 лютага 2000 г.*

## **І я там...**

Чым далей,
Тым смялей карацее дарога.
Адчуваю, што я ўжо
Не йду, а вяду
Ператомленага сябе самога.

А на лузе ўспамінаў
Зялёнастога
Смутак дрэмле.
І я там прытулак знайду...

*7 чэрвеня 2007 г.*

## Зялёна...

Мурагу,
Як і чалавеку,
Чужую не зразумець тугу.
Абы не сцюдзёна й зялёна
Было б.
Яму, як і ветру,
Не задумацца
Ў апошнім парыве,
Па кім сумуе
Абмалочаны сноп.
Па маўклівых зярнятах
Ці па гаварлівай ніве?..

*23 чэрвеня 2007 г.*

## Змаркочанае

Радасць —
Ранішняя раса
На вясновых марах настрою.
Іржавець не любіць каса,
Помнячы рамяство старое.

Замаркоціць туман стагі.
Сонца ўзыдзе —
Раса растане.
Шле хмурынку смугі
На стагі
Настальгія —
Самотная пані...

*7 студзеня 2007 г.*

## Нетутэйшы...

Ёсць нетутэйшы страх,
І гэта ён
Нас нечаканым чынам папярэджвае,
Што не чакае запрашэння кон,
Бярэ сваё з нахабнасцю старэчаю.

Спакой бяжыць
За ценем наўздагон.

Цень страху першабытнага,
Як віж,
Маўчыць, прыпамінае,
Падпілноўвае.
І пахнуць дошкі
Скрухаю сасноваю.
І рукі распасцерці
Хоча крыж.

І не спытаеш страх —
Чаго дрыжыш?

*10 мая 2006 г.*

## Сурочаны...

*Так за справу вазьмуся,*
*аж туга запяе...*
Хафіз

Я за справу бяруся,
А туга не пяе.
На цвяленне спакусе
Аддае дні мае.

Марыў горы зварочваць,
А звярнуў галаву.
Чысцінёю сурочаны,
Толькі ў мроях жыву.

Чысціня асцярожная,
Ціхая чысціня
Нада мною, здарожаным,
Да апошняга дня.

*6 жніўня 2006 г.*

## Пытанне

*сабе*

Каму патрэбны мае радкі,
Мой шэпт салодкі,
Мой лямант горкі?
Прыцьмелі зоркі,
Прыселі ўзгоркі.
Зямлёй зрабіліся землякі.

Адно рака забыцця цячэ,
А дно глыбее ў яе штохвіліны.
Лёс абяцаў мне
Даць мёд чмяліны,
Які ніхто не спытаў яшчэ.

І травы, й кветкі ўсе дацвілі.
Зніцелі цені
Цемры ў дагоду.
Тым і жыву,
Што чакаю мёду.
Чаму ж злянелі мае чмялі?..

*14 ліпеня 2007 г.*

## Auribus teneo lupam

Трымаю ваўка за вушы,
Ваўка майго недаверу.
Ні ўпартай скуры, ні тушы
Займець не маю намеру.

Воўк трошкі яшчэ патрывае,
Мне ў вочы сцюдзёна гляне.
Яна і ўва мне жывая —
Трывога таго палявання,—

Калі абкладаюць сцяжкамі
Прастору да небакраю.
І горла рэху сціскае
Сабачая злая зграя.

Яна ад даверу,
Бяда ўся.
Зман дужы ў сваім непарушшы.
Пакуль у хмыз не падаўся,
Трымаю ваўка за вушы...

*7 лістапада 2006 г.*

## Перадвесне

Неспатольная прага і смага жыцця,
Бо жыццё і салодкае, і салёнае.
З-пад стахлага леташняга лісця
Выпростваецца трава зялёная.

Праталістая, як сарока, зямля
Маладзее,
Абнашчыўшыся праменнямі.
Бярозы ў праталінах цёплых
Пасля
Здранцвення зімовага
Мераюцца ценямі.

Стань каля пня,
Як прытомлены пень,
І ўбач, як штодня
Карацее твой цень.

*2 красавіка 2005 г.*

## Як зразумееш...

Як зразумееш,
Што даўно няма
Цябе вясёлага і маладога,
Паненка незамужняя
Трывога
Не выпусціць
З нахабнага ярма.

І скажа,
Што самотная сама,
Што ёй твая
Патрэбна дапамога.
І захлыне
Бяздумнасцю юрма.
Рахманкаю прыкінецца
Трывога.

І назавецца воляю
Турма.
Забытая,
Згадаецца карчма.
Захоча нешта
Вызірнуць з нічога.
Як зразумееш,
Што даўно няма
Цябе вясёлага і маладога.

*11 мая 2007 г.*

***

Вусы падрыгваюць,
Як заінелыя чарацінкі.
Рыжым хвастом атуліўшы нос,
Рысік спіць і праз сон
Салодкае нешта мармыча.
Ці сам з сабою гаворыць,
Ці некаму скардзіцца
На сваю кашыную долю.
А можа і ў сне
Цвяліць яго верабей за акном.
Прачнецца,
Але не раскажа.

Хай хоць яму
Будзе ў сне спакойна...

*4 кастрычніка 2008 г.*

## На дно...

Валачэцца нудна
З душэўным спакоем воз.
Хутка ўсё нелюдзее
На гэтым свеце.
Чалавека ў клетку жыцця
Замыкае лёс
І шпурляе ключы
На дно ў апрамецце.

*5 мая 2005 г.*

## Яшчэ ляцець...

Сябры мае
Дамоў пайшлі
Са згоды небакраю.
А я застаўся на зямлі,
Сваю чаргу чакаю.

Балюча й сумна навакол.
З кім
Пацвяліць самоту?
Я ўжо як той
Апошні кол
Паваленага плоту.

На ім драмалі гладышы,
Сушыла хвост сарока.
Як кол, я рухну,
А душы
Яшчэ ляцець далёка...

*18 мая 2007 г.*

## Кожны сам...

Кожны сам сваё пекла нясе ў сабе.
Кожнаму свайго пекла хапае.
Жарабок самалюбства траву скубе,
А трава самагубства скупая.

На траве самагубства пасецца адчай,
На траве спадзявання — здзіўленне.
Уцякае з заспанага пекла ручай,
Вербам віннасці мые калені.

Ну а ў кожным пекле сваё гадаўё
Са сваімі рагамі й лычамі.
Кожны ўрэшце знікае й пекла сваё
Да агульнага далучае...

*1 красавіка 1998 г.*

## Рабства

*Той — раб пыхлівасці,*
*той — стаў рабом народу,*
*няўдзячлівага й ветранага зброду...*
Амадыс Камен

Хто першы з іх на белы свет
Прыйшоў — свабода ці няволя?
На цаліку чый першы след
Аднойчы ўбачыла спатоля?

Няволя з норавам крутым
Прывабліваць давер'е ўмее.
Ды ўміг сплыве ружовы дым —
І з чарнахмар'я зыркнуць змеі.

Свабода — кволае дзіця.
Усім кіруе перамога.
Жывыя ўсе — рабы жыцця.
І кожны — раб сябе самога.

*8 жніўня 2006 г.*

## Змеі агню

Галоўнае — не азірнуцца,
Каб прысак не разварушыць,
Да вогнішча не прыгарнуцца,
Што змеямі агню кішыць.

Агонь спаліў мае аблокі,
Хмурынкі хмарамі зрабіў,
Мой спапяліў спакой далёкі
І ў небе позірк мой згубіў...

*1 жніўня 1996 г.*

## Наканаваная няволя

Жыццё – наканаваная няволя,
Якая хоча волю спадʼярэміць.
Са стрэмя выбʼе,
Даланю застрэміць,
Калі табе дае рыдлёўку
Доля.

Рыдлёўку,
Каб дагрукаўся да скарбаў,
Капаў
І выкапаў сабе магілу.
Не чуе неба
Перуновых скаргаў.
І зацякае шыя небасхілу.

Нядоля
Любіць глухату раздолля.
І цішыні баліць
Трава жывая.
Яно сабе самому спачувае,
Жыццё – наканаваная няволя...

*8 студзеня 1997 г.*

## Ворагі

*І ворагі чалавеку хатнія ягоныя...*
Дабравесце ад св. Мацвея 10:36

Чалавек —
Ён вораг сам сабе.
А без ворагаў ён сіраціна.
Сваякі як сінякі на лбе.
Хатнія калючыя, як кпіна.
Не прыкідваючыся ні на міг
Дабрадзеямі па абавязку,
Хатнія хутчэй сябе саміх
Запрашаюць на бяседу ў казку.

Хатнія,
Пачуюцца яны
Дрэвамі далёкімі ў карэнні.

Адыходзяць крэўнікі,
Як сны.
Хто іх, дзе, калі
І як сустрэне?..

*1 жніўня 2006 г.*

## Не змог...

І з таго, што мог,
Нічога не змог,
Любы пасынак
Гордай долі.
Парасцягалі мяне,
Як стог,
Засняганы,
Пакінуты ў полі...

*3 снежня 2006 г.*

## Шчырэюць...

Шчырэюць дзеткі,
Каб хутчэй бацькі
Збіраліся ў адвечную краіну.
А ўнукі –
Як апошнія цвікі,
Якімі забіваюць дамавіну...

*23 чэрвеня 2006 г.*

## Трымае...

Сум таксама,
Як і свет, стары.
Сум, як шум,
Нічога не кранае.
Застаюцца дзеці і сябры.
Зрэшты ўсё, як і жыццё,
Мінае.

Дзеці застаюцца,
Каб бацькам
Болю і бяды
Не стала меней.

Іржавець старым,
Як тым цвікам,
Што жыццё трымае
Мокрай жменяй...

*23 ліпеня 2001 г.*

## Цвёрдая валюта

Сыходзяцца ў адзін усе шляхі.
І дзеці –
Тая цвёрдая валюта,
Якой за клопат наш і за грахі
Разлічваецца лёс
І шчодра, й люта...

*9 студзеня 2003 г.*

***

Даўнейшы ён за шлях
З вараг у грэкі,
Шлях ад заможнасці
Да торбы ды кійка.
Бацькі – лясы,
А дзеці – дрывасекі:
Ссякуць пад корань,
Абцярэбяць да сучка.

*16 красавіка 2000 г.*

## Нябачны…

Не магу
Ад сябе адагнаць тугу –
Сваячку бедаў і ведаў.
А тут яшчэ
Сабака суседаў
На ланцугу
Ёкатам зябкім якоча,
Тугой са мной
Падзяліцца хоча.
А мне і сваёй даволі.
Смялей, суседзе, брашы.
Можа, зробіцца
Весялей на душы.

Нябачны ланцуг у волі…

*8 кастрычніка 2006 г.*

## Невядома...

Вырвацца нельга
З прыгону жыцця.
Роспач і стома
Ў душы як дома.
Хочацца мёртвым зайздросціць,
Хаця,
Як ім жывецца там,
Невядома.

Ці ўсе раскашуюцца,
Як паны?
Злом ці дабром
Поўны скрыні й прыскрынкі?
Думы цяжкія там,
Як валуны?
Клопаты лёгкія,
Як аблачынкі?

Кожны аднойчы
Дазнаецца сам,
Як гэта ўсё
Там...

*19 сакавіка 2008 г.*

## Не самой...

Пачынае душа турбавацца,
Не зважаць
На старое жытло.
Пачынае на ўсё забывацца,
Што жыло,
Што гуло,
Што сплыло.

Не самой
Выбіраць падарожжа.
Ды цікавіць
Душу ўсё адно ж,
Ці ляцець ёй у вырай,
Ці, можа,
Па калючках
Ступаць басанож.

Ці яшчэ лёс налье
Гарнец мёду,
Ці падасць
Палыновую кадзь.
Трэба,
Каб не пакрыўдзіць лагоду,
І маўчаць,
І трываць,
І чакаць...

*12 красавіка 1997 г.*

## Грэе...

Ці, як мох
У маладым бары,
Я стары.
Ці, як камялі,
Дні мае ад завеі
Пасівелі
На сцюдзёнай зямлі?

Старасць нікога не абміне.
Але старэйшыя за мяне
І вясна, і кароткае лета.
І мой зімовы настрой
Іншай парой,
Як і надзея,
Быццам бы грэе
Сподумка гэта...

*9 сакавіка 2001 г.*

***

Знябытае, забытае,
Балючае, далёкае
Сляды свае заблытвае,
Ўздыхаючы з палёгкаю.

Але на міг вяртаецца
Калядным светлым вечарам.
І марыць аб пратал́інцы
Душа ў завеі вечнасці...

*31 снежня 2008 г.*

## Хай без мяне...

*Ещё, как патриарх,*
*не древен я...*
Я. Баратынскі

Яшчэ ў мяне турботы пад рукой,
Яшчэ атава руннюю не здаецца.
І не здаецца пал,
І не здаецца
Мой неспакой спакою
Як пакой.

І сам я
Не хачу кватараваць
У рэўнасці былой
У сценах цесных,
Да смаку праснакоў,
Як старасць, прэсных
Звыкаць
І смутку крыўды даравяць.

Яшчэ мне хочацца
Жывой вады,
Якою сэнс жыцця
Прагоніць смагу.
Увагу не звяртаючы
На звягу,
Спяшацца й не падумаю
Туды...

Хай без мяне
Спяшаюцца гады...

*10 мая 1997 г.*

## А ўсё-ткі...

Няўжо
Я жыццё не сваё жыву,
І смутак, як брата,
Шаную.
І не сваю нашу галаву,
А чужую?
Куды
Ад самога сябе ўцячы,
Каб дачытаць спакойна
Скрыжалі.
Чакаю ноч
І баюся начы.
Яна без жалю.

Надзея
Стамілася ад мяне.
І радасць
Не мае прыстання.
А ўсё-ткі веру –
Благое міне.
Хоць на развітанне...

*22 ліпеня 2007 г.*

## Жаўранак кахання

*Акраверш*

*Ашукаўшы злыя халады,*
*Ласкаю чаканага світання*
*Абнадзеіць сэрца назаўжды*
*Сонцакрылы жаўранак кахання.*
*Абляціць пажоўклы ліст журбы.*
*Колас шчырасці нальецца сілай.*
*Адляцець да зорнай варажбы*
*Лёс дазволіць роспачы абнылай.*
*Одум ціха ўкленчыць вышыні*
*Ў неабвечарэлым парыванні.*
*Слова дападзе да глыбіні.*
*Кожны дзень багатым святам стане.*
*Адгукнецца жаўранак кахання*
*Яснавітай далечы жадання...*

*15 лютага 2005 г.*

# вянцы ізруба

Прысталі ногі ад зямных дарог...

вянцы ізруба

## Як хрэснік...

Дзень кожны на зямлі
Як хрэснік дзіва.
Спагада шчырая ў сваёй мане.
Як ні стараўся я —
Жыццё маўкліва
Прайшло і не прыкмеціла мяне...

*5 ліпеня 2006 г.*

## Паволі...

У моры забыцця віроў даволі.
На сцежках ранішніх палын пасох.
І не чуваць, як цэдзіцца паволі
Праз пальцы Вечнасці
Людскі пясок...

*14 жніўня 2006 г.*

***

І Вечнасць шануе цяпло,
На ноч зачыняючы дзверы.
Жыццё —
Гэта ўсё, што было.
А тое, што будзе, — намеры.

*10 верасня 2003 г.*

***

У небе начным
Цепляцца свечкі зорак.
У кожнага з нас
Свечка свая.
І яна бажэе,
Пакуль мы верым
У анёла свайго...

*3 лютага 2008 г.*

***

Жыццё –
Як выдыхнуты верш,
Якому Вечнасць чыніць допыт.
А ўвогуле, датуль жывеш,
Пакуль твой не стаміўся клопат.

*27 лютага 2006 г.*

***

Засмягне рэха баравое.
Адчуе свет сябе старым.
Трава паўторыцца травою.
А чалавек імгненны –
Чым?

*22 красавіка 2008 г.*

## На памяць

Зрэшты вернецца ўсё
У зямлю,
Славай значанае
Ці абразаю.
Шыбеніца тугую пятлю,
Як вузельчык на памяць,
Завязвае...

*29 лістапада 2007 г.*

***

Што табе дадзена,
Мала ці многа,
Не спяшайся спажыць.
Нельга засмучаць Пана Бога,
Ды не пажадана й смяшыць.

*21 мая 2005 г.*

## Недагарэлыя

Зоркі — на дарозе да недасяжнасці вешкі, —
Каб свяціцца ясней,
Толькі й заклапочаны тым.
Людзі —
Недагарэлыя галавешкі,
Ад якіх затрымацца не хоча дым.

*29 сакавіка 2003 г.*

## Варта...

І прыцаніцца, і патаргавацца
Паспеўшы на жыццёвым кірмашы,
Сябе самога варта запытацца,
А што набыў для стомленай душы.

*13 студзеня 2006 г.*

## Вернецца

Тут цябе зрэдчас бачыў лёс-айчым,
Супакою не ведала маці-трывога.
Ды так і адыходзіш адсюль ні з чым,
Не спраўдзіўшы спадзевы Пана Бога.
А душа, перааблічыўшыся наноў,
Вернецца са спалучаных штатаў сноў...

*18 верасня 2003 г.*

## У каго?

Быў з сабою самым
Як далёкі сусед.
Засталося часу, каб развітацца.
І па што я прыходзіў
На гэты свет,
У каго запытацца?..

*18 верасня 2004 г.*

## У госці...

У госці да вечара ціха брысці,
На досвітку выйшаўшы
З роднага дому.
Па часе галоўнае ў гэтым жыцці –
Не знадакучыць сабе самому...

*8 лістапада 2006 г.*

***

І памяці твая апрыкла праца.
І ты ўжо
Як цытата з даўніны.
Самім сабе
Звыкаюць сніцца сны,
Каб раніцай
Табе і не ўзгадацца.

*4 красавіка 2003 г.*

***

І не было супыну сцежцы,
Спяшалася за небасхілы,
Каб сцішыцца каля магілы.

Жыццё стаілася ва ўсмешцы...

*22 красавіка 2008 г.*

***

Закон жыцця
У прынцыпе воўчы.
Усё тое будзе, што ўжо было.
Паціху змяркаюцца нашыя вочы,
А нам здаецца —
Старэе святло...

*28 мая 2007 г.*

***

Жыццё —
Такі прымусовая праца.
І покуль наглядчыцай вісне знямога,
Старацца жыць,
Каб нарэшце спытацца,
Навошта жывеш,
У сябе самога...

*4 мая 2003 г.*

**Дасць...**

Ад роспачы шалееш і нямееш,
Пакуль сябе не выдасць адкрыццё,
І ты, самазагнанец, зразумееш —
Бог даў жыццё.

*9 мая 2004 г.*

***

Пры няпрошанай ростані
У забыцці
Успрымаем жыццё
Як вясёлую згадку.
І калі наперад
Няма куды йсці,
Пачынаем вяртацца назад,
Да пачатку...

*13 ліпеня 2007 г.*

**Усё роўна...**

Грахоў за плячыма
Ці фунт, ці пуд.
А ўсё роўна
Бяруць аблогай.
Шпіталь –
Пераваланы пункт
Перад апошняй дарогай.

*5 кастрычніка 1999 г.*

***

Праз гады
Праз клады
Да бажніцы
Ці да вязніцы
Шлях карацее
Куды?..

*8 кастрычніка 2007 г.*

## Скеміць...

П'еш брагу жыцця
І з каўша, і з карца,
Пакуль дазваляе ахвота,
Каб скеміць,
Што вернай табе да канца
Адна застаецца самота...

*4 ліпеня 2006 г.*

***

Малітву не заглушыць брэх.
Гнеў не пагодзіцца з абразаю.
Спакусу не спатоліць грэх.
Душа за цела не адказвае.

*28 сакавіка 2006 г.*

***

Перш чым тленам зрабіцца,
Гожа
Узалочвае дол лісцё.
Мабыць,
Толькі мёртвы і можа
Адказаць,
Што такое жыццё...

*21 сакавіка 2007 г.*

## Сустрэча

Жыццё сваю існасць,
Як міт, перахоўвае.
Нічога з самога сябе не ўцякае.
І смерць — гэта толькі
Сустрэча чарговая,
Сустрэча з крэўнікамі
Ды з землякамі.

*8 кастрычніка 2003 г.*

## Прапанова

Галінку трываліць
Упартасць камля.
Сцяжыну вясне
Пазначае пратална.
І прапануе маўкліва зямля
На свет паглядзець
Вачмі катафалка.

*15 жніўня 2007 г.*

## Маўчаць...

Маўчаць крыжы,
Ці стомленыя цені
Крылатых душ,
Што змрок перамаглі
І ціха ў вечны вырай паляцелі,
Пакінуўшы спагаду на зямлі...

*31 кастрычніка 2003 г.*

## Добрай ночы!

Паважаць пачынаю
Надвор'е ціхае,
Да былога сябе
Стомлены пілігрым.
Гэты свет паціху
Мяне выпіхвае.
Хоць не веру,
Што дужа чакаюць на тым...

*16 верасня 2005 г.*

***

У зорак позіркі заімгляцца.
Прыкінецца цемра святлом.
Сабраўшыся ў шлях,
Па-зямляцку
Жыццё закрануць плячом...

*12 чэрвеня 2009 г.*

***

А калі пагасне
Ў вокнах вачэй святло,
Так я й не разбяруся дбала,
Што ў маёй галаве жыло,
Што плыло, што гуло, што маўчала, –
Што наогул з ёю было?

*9 сакавіка 2003 г.*

***

Нядоўга на покуці стыне куцця.
Пісьмёны вясла на вадзе не сцерці.
Не першы прыйшоў я да адкрыцця:
Жыццё – рэпетыцыя смерці.

*13 чэрвеня 2006 г.*

## Шэпт

Ніколі не забудзецца яно,
Аднойчы ўчора ўбачанае сёння.
Трывацьме ў чоўне спадзявання дно,
Ахутанае роздумам прадоння.
Шэпт ціхагубых хваляў цішыні
Аддасць даўгі за будучыя дні...

*19 кастрычніка 2006 г.*

***

Стаіўся смех.
Стаміўся крок.
За пазуху гаркота лезе.
Я ўжо
Як высачаны змрок
У высечаным лесе...

*13 мая 2009 г.*

## Каб не закрычаць...

Вачыма пасвячы аблачыны,
Цені пазавязваўшы ў хатулі,
Цішыня ў Бога выслужыла
Спеў птушыны,
Каб ад самоты
Не закрычаць на зямлі...

*5 мая 2003 г.*

***

Не шкадаваць, і не хваліць,
І не лічыць сябе асноўным,
А ў будні дзень і ў свята быць
З самым сабой
Як роўны з роўным...

*22 ліпеня 2006 г.*

***

Не тухне ён,
Жыцця святы агмень.
Жывеш датуль,
Пакуль жыве твой цень.

*30 лістапада 2003 г.*

## Бліжэй...

Небасхілы пахілы
Цягнуць лёс на гарбе.
Чым бліжэй да магілы,
Тым бліжэй да сябе...

*5 лютага 2000 г.*

***

Напомніць сыты крум крука,
Што,
Вызваляючы прастору,
І багача, і жабрака
Зямля прымае
Без разбору...

*5 красавіка 2008 г.*

## Паразважалі...

Жыццё – міраж,
Шапнуў мураш.
Свет нас прадаў –
Дадаў удаў.

*16 чэрвеня 2005 г.*

## Сцюдзёна...

Журба ў парадзелым людскім бары
Пра сябе нагадвае штодзённа.
Адлятаюць у вечны вырай сябры —
Душа вечарэе сцюдзёна.

*6 сакавіка 2005 г.*

***

Дык як адгадаць загадку
Ад часу —
Скупога купца:
Ці хоча канец пачатку
Убачыць пачатак канца?..

*11 верасня 2008 г.*

***

Дзе суцішыцца
Мусіць імпэт,
Не адкажа зямля сырая.
Свой шукаючы
Згублены след,
Кожны сам сябе паўтарае...

*27 верасня 2007 г.*

***

Дарослым стаць
Спяшаецца дзіця,
І не ўяўляючы ўсяго вар'яцтва
На вуліцах жыцця...

*27 лістапада 2003 г.*

***

Галодная праўда
Сытую хлусню дакарае.
Для ўкрыжавання
Хапае цвікоў.
Як толькі трывае
Зямля сырая,
Трымаючы ў памяці
Таямніцы вякоў?..

*20 мая 2008 г.*

***

Рагатаў бы глыбокі роў,
Каб не ў горле зямля сырая.
Бог дае чалавеку сяброў,
Ворагаў ён сам выбірае...

*4 жніўня 2003 г.*

## Доўг

Самому ўжо такой бяды,
Здаровы ты ці хворы,
Ды над табой твае гады
Стаяць, як крэдыторы.

*16 лютага 2005 г.*

***

Нанова вучыцца поле
Вітацца з заспаным рэхам.
Астывае сутонне забытай гутаю.
Голаму голлю
Цёпла пад першым снегам.
І зябне крыўда,
Нябёсамі непачутая...

*14 снежня 2009 г.*

***

Пакуль яшчэ ў выраі халады,
Спіну хоча выпрастаць полаз.
Згубіла рэха свае сляды.
Туман свой успомніў голас.

*27 лістапада 2008 г.*

***

Не зашкодзіць
Шляхетныя мецъ манеры,
Каб ужыцца са смерцю,
Як з суседкай
На агульнай кватэры.

*2 чэрвеня 2001 г*

***

На могільніку месца суму й сну
Хапае пад зялёнаю павеццю.
І ўпарта дзяцел грукае ў сасну,
Як у глухія дзверы тагосвецця.

*12 жніўня 2004 г.*

**Час**

Загоны ўлясеглі,
Лясы палысеглі.
Усмяглыя рэчкі просяць вады.
Хаўтуры часцейшыя, чым наваселлі.
І радасць
Кумою пайшла да бяды.

*19 жніўня 2002 г.*

***

Бліжэю сэрцам да зямлі.
А думка,
Ўзяўшы босы посах,
Вандруе ў сцішаных нябёсах,
Адно пытаючы —
Калі?..

*21 верасня 2007 г.*

**Забытая хата**

Прыслеплі вокны.
Сцялі сківіцы дзверы.
Апусціліся плечы страхі.
Комін сашчапіў далоні цаглін
І ўсё яшчэ
Успамінае дым...

*2 ліпеня 2009 г.*

**Чарга**

Рака ўспамінаў
Ілам заплывае,
Прынесеным
Імгненнямі кароткімі.
Не спыніцца,
Пакуль зямля трывае,
Чарга жывая
На сустрэчу з продкамі...

*23 чэрвеня 2003 г.*

***

Адыходзячы з гэтага свету,
Мы звычайна
Забываемся нешта.
І таму вяртаемся
Зноў і зноў...

*6 лютага 2008 г.*

***

Мой цень карацее, ніцее.
І, ўшчэнт здарожаны сам,
Парою не цямлю,
Дзе я –
Ці тут,
Ці ўжо там?..

*5 верасня 2008 г.*

***

Смутак – прывідны, як туман.
Скруха – як яблыня белая.
Чакаюць ля роднага ганка
Зранку...

*17 снежня 2009 г.*

***

І жыццё пранасілася,
Як пінжак на лакцях.
Чым залапіць?
А наогул ці трэба?

*30 жніўня 2004 г.*

## Льга

Льга ад усіх уцячы
У сон уначы,
Удзень схавацца
Пазаплеччу ў працы.
Але не ўцячы, не схавацца
Ад той,
У якой страх пад пятой...

*29 чэрвеня 2001 г.*

## Вачыста

Абышла душа мясціны ўсе,
Дзе пакутавала, дзе трывала.
Дзе сабе шчымлівасць даравала,
Кволы сум даверыўшы красе.
За душой вачыста сорак дзён
След у след ступаў вячысты кон...

*31 ліпеня 2003 г.*

***

І сам, яшчэ напалову ў сне,
Спяшаюся прывітаць
Заспанае сёння.
А ў досвітка белыя скроні,
Як у мяне...

*2 студзеня 2007 г.*

***

Спадчыннай маўклівасці запас
Не растрачваюць вякі-маруды.
Перагнаць сябе спрабуе час.
Вечнасць не спяшаецца нікуды...

*16 чэрвеня 2008 г.*

***

Спачатку прачнуўся дзень.
Пасля ўжо
Вечар упёрся ў плот.
Спачатку ўзляцеў авадзень,
Пасля ўжо
Ляцець спрабаваў самалёт.

...А хто быў спачатку —
Агонь ці цень?..

*26 верасня 2007 г.*

## Дарагі...

Грошы — пыл.
Сіла — прах.
Слава — дым.
Пнецца кожны вар'ят
Узвялічвацца.
Гэты свет —
Гатэль дарагі, у якім
Трэба толькі жыццём
Разлічвацца...

*9 мая 2006 г.*

***

Не загадаюць журбе
Колер забыць зялёны
Упэўненыя ў сабе
Восеньскія вароны...

*30 лістапада 2009 г.*

***

Перш чым ступіць на ганак,
Аб трыпутнік ступакі выцірае
І галінкай яблыні
Грукаецца ў шыбіну
Чэрвень, усё яшчэ поўны веры,
Што гаспадыня адчыніць дзверы...

*25 снежня 2009 г.*

## Без развагі

Скон кладзе
Наш кожны дзень на вагі.
Кон за раўнавагай назірае.
Моўчкі
Без увагі і развагі
Забірае ўсё зямля сырая.

*12 снежня 2003 г.*

***

Расце трава.
Прачнулася вада.
Быць гожа
З завушнічкамі бярозам.
Галуб нясе
Галінку для гнязда.
Дарогу крозам
Саступае розум...

*19 красавіка 2007 г.*

## Было...

Сум хмарыць небасхілава чало.
Расплывіста капаецца канаве.
Жыццё – ўспамін таго,
Што ўжо было
Калісьці з нецяперашнімі намі.

*22 сакавіка 2003 г.*

## Трэба!

Трэба так шчырэць,
Знябыўшы зло,
Каб памерці
Часу не было…

*6 лістапада 2007 г.*

***

Слёз на ўсіх хапае
У залевы.
Гора кожны раз
Як першы раз.
Не спяшаюцца нікуды
Дрэвы,
І ля іх
Адпачывае час…

*28 снежня 2007 г.*

***

У Вечнасць хочацца ўвайсці,
І хам узводзіць храм за храмам.
Ды ўсё разлічана ў жыцці –
Хам застаецца толькі хамам…

*11 студзеня 2004 г.*

***

У садзе,
Маладзейшым за мяне ненашмат,
Чуваць,
Як яблык злятае ў траву спрасоння.
А мне каго запытаць –
Заўтра ці сёння?..

*29 чэрвеня 2006 г.*

## З гасцей...

У снах
Сустракаемся ўсё часцей
З сябрамі, што адышлі,
Перад сустрэчаю там,
Ідучы з гасцей на зямлі...

*27 лютага 2004 г.*

## Шчасліва...

У шчасця цярпення хапае,
А нам яго нестае.
І нецярпліўцам доля благая
Прапануе шчасліва
Абдымкі свае...

*9 чэрвеня 2001 г.*

***

Хто адкажа,
Спакой альбо мэта:
Сусвет –
Немаўля ў жыцця
Ці жыццё –
Немаўля ў Сусвета?..

*1 студзеня 2008 г.*

## Выснова

Цёмным быллём прарасло святло.
Вечар адгарадзіўся зарою.
Новае тое,
Што ўжо было.
Тое, што будзе,
Даўно старое...

*5 мая 2005 г.*

## Прыкуты

Ці зорка таксама за лёс свой дрыжыць
І ў небе зямныя пакуты?
Ці страхам, ці сподзевам
Жыць і жыць
Чалавек да сябе прыкуты?..

*6 мая 2004 г.*

***

Ці ў часе мы,
Ці час у нас
Жыве сабе як дома,
Напэўна ж,
Некаму вядома.
Ды ён утойвае адказ.

*1 лютага 2008 г.*

**Роўныя**

Час раўніва
Сваіх кватарантаў пасе.
Не дае залежвацца смеццю.
Як хто ні выслужваецца—
Усе
Роўныя перад старасцю
І перад смерцю...

*27 студзеня 2003 г.*

**Адкрыццё**

Як і Н'ютону некалі,
Яблык зляцеў
На маю галаву.
І гуз не набіў.
І я адкрыццё зрабіў —
Жыву!

*22 кастрычніка 2006 г.*

## Яна

Як смерць, раўнівая,
Як цень, неадлучная,
Як боль, бязлітасная,
Мае ўсіх на прыкмеце
Старасць...

*22 лістапада 2007 г.*

## Пацвярджэнне

У мітусні задыхаецца,
Глухне ў гомане,
Каіцца, аж заікаецца
Жыццёвы фэст.
А латынь усміхаецца:
Homo homoni – lupus est.

*27 кастрычніка 2003 г.*

## А думаю...

На штодзённым таргу
Стараюся перахітрыць тугу,
У плечы спакою
Ўцягваючы галаву.
Змагаюся з дужай немаччу
Як магу.
Дажываю адведзенае,
А думаю, што жыву.

*12 мая 2003 г.*

***

Гарачы град з вачэй
Балючаю заслонай.
Жыццё пражыць лягчэй,
Чым стаць травой зялёнай...

*10 кастрычніка 2009 г.*

***

Талент,
Як самы бедны на свеце,
Чакае міласціны
Ад Усятрымцы.
Тым і жыве...

*14 снежня 2009 г.*

***

Па страле адляцелай
Сумуе лук.
Вяртацца з выраю
Цёпла граю.
Незлічонааблічны гук
Толькі голасу давярае...

*20 чэрвеня 2008 г.*

***

Пасля палётаў
Упоплеч з аблокамі
Прачынацца бяскрылым лёкаем
Надзённых клопатаў
Нялёгка...

*18 мая 2003 г.*

***

Падкова зрываецца з вухналя,
Каб ветахам паратоўна ўзысці.
Стрэмя –
Запыленая пятля,
Ажалязелая ад раптоўнасці...

*8 студзеня 2004 г.*

## Допыт

Неўпрыкметку на схіле год
Роспач допыт свой пачала:
Хто шчырэйшы – шчадрун ці жмот,
Хто мудрэйшы – змяя ці пчала,
Хто смялейшы – ці яд, ці мёд?..

*19 снежня 2003 г.*

## Прыдумаў

Не спаў чалавек
Ні ўдзень ні ўначы.
Было яму клопатаў мала.
Сякеру прыдумаў,
Каб лес сячы.
Яна й да ягонай шыі дастала.

*25 жніўня 2003 г.*

## Штодзённасць

Не можа болем насыціцца
Бязлітаснай лютасці чэрава.
Ранне трымценнем снедае.
Ценямі зніканне вячэрае.
Цесна аблокам мазгоў
Пад небасхілам чэрапа...

*7 студзеня 2008 г.*

## Паслуга

Немітуслівы кат
За памяркоўную плату
Галаву адсячэ і роднаму брату,
А трэба —
Сякеру здасць напракат.

*10 кастрычніка 2000 г.*

***

Мужык нездарма разумны,
Бо дзве атрымаў у пасаг –
Адну галаву, што думае,
Другую, што на плячах...

*21 снежня 2003 г.*

## Каб вольны...

Калючым дротам шытая імперыя
Не дужа разыходзіцца па швах.
Бо навырост закройшчыкі адмервалі
Каптан,
Каб вольны ў ката быў размах.

*29 ліпеня 2005 г.*

## Сама

Юрма не можа без ярма.
Нагода клопату нагодзіць.
Няма ярма –
Юрма сама
Яго нарэшце вынаходзіць.

*31 студзеня 2003 г.*

## Спакон

Спакон даспадобы людскому роду
Бязладна кватараваць на зямлі.
Спачатку дымам пусціць гасподу,
А потым маліцца на камяні.

*6 мая 2004 г.*

***

Нялёгка вырашыць страху:
Далей ад кумы-бяды
Галаву пакласці куды –
Пад паху
А ці на плаху?

*12 ліпеня 2006 г.*

***

А грошы і слава –
Амаль сваякі.
Заўсёды іх не хапае.
У грошай жменя скупая.
І славай адзінай
Жывуць дзівакі...

*1 снежня 2007 г.*

## Засячы!

Яшчэ жывы,
Засячы на ілбе,
Што шлях за табой заняты.
Наступнік —
Гэта той, хто табе
Ужо наступае на пяты.

*8 студзеня 2000 г.*

## Заробак інтэлектуала

Як таўкач у ступе,
Ступіш
Лоб свой
І заробіш кукіш.
А калі заробіш кукіш,
Дык за кукіш
Кукіш купіш...

*21 верасня 2005 г.*

## ***

Як прагнозы збываюцца,
Спёкай робіцца сцюжа.
І вяршыні зрываюцца,
Як заносяцца дужа...

*3 сакавіка 2000 г.*

***

Хто каго ловіць,
Не мовіць рака –
Ці рыбак шчупака,
Ці шчупак рыбака ?

*19 студзеня 2004 г.*

***

Уткнуцца ў бераг
Хочацца чаўну.
Дагнаць свой цень празрысты
Хвалі рупіць.
Хоць кожны ведае сабе цану,
Ды за яе
Ніхто яго не купіць...

*3 верасня 2007 г.*

**Пеня пню**

Трымценне пню
Налічвае пеню
За даўжыню ценю
І за цішыню...

*15 мая 2005 г.*

## Проста...

Маладосць – разняволенае шаленства.
Сталасць – гаспадыня заможная.
Старасць – проста вяртанне ў маленства,
Стомленае і бездапаможнае...

*21 лістапада 2004 г.*

***

Чалавек –
Болей сонцу радня.
Бо не любіць
З цемрай згаджацца.
Паміраe і ён штодня,
Каб упарта
Наноў нараджацца...

*29 лістапада 2007 г.*

## Сподзеў

Травень пачаў шпачыны крок.
Зазелянеліся адхоны.
Дыміцца рунь.
Рунее змрок.
І ў шыбеніцы цень зялёны.

*5 мая 2001 г.*

## Пераліванне

Гэтулькі цішыні й спакою –
Хоць ад радасці закрычы.
Салавей
Піва з бочкі начы п'янкое
Пералівае
Раніцы ў гарлачы.

*12 мая 2006 г.*

## Пярэдадзень

Вялічка ў дарозе.
Лагоду вітае вятрак.
Маладзеецца сонечная карона.
Зямлю сыраватую мацае грак,
Каб Ісусу
Ступаць было несцюдзёна.

*12 сакавіка 2003 г.*

***

Першы гром вітае
Шлюб чарговы
Баразны і плуга.
Неспакой спрадвечны
Расчытаць упарта хоча
Скорапіс
Дакошанага луга,
Тайнапіс вачэй
Грамнічнай ночы...

*8 лютага 2008 г.*

## Пярэстая бліскавіца

Вятры з чала небасхілу
Смутак змялі.
Хмурымі хмарамі
Цёплыя ліўні развезены.
Выпрастаўшыся,
Вырастае з зямлі
Пярэстая бліскавіца бярэзіны...

*25 сакавіка 2007 г.*

***

Як у казцы,
За сіняй гарою
Ускудлачаны певень пяе.
Падымаюцца сосны на ўзроўе,
Даганяючы цені свае...

*12 снежня 2004 г.*

***

Ля чмяля
Руж
Не руш.
Руш
Далей
Да алей...

*25 чэрвеня 2009 г.*

***

Над журбой крыніцы
Вербы гнуцца ніца.
У прымоўклым небе
Знічка знічцы сніцца...

*4 ліпеня 2009 г.*

***

Пытаюся ў ракі,
Ці можна мне
Плысці ў чаўне.
— А чаму ж не,—
Адказвае рака.

І шэпчацца асака...

*7 лютага 2009 г.*

**Пажадаецца...**

Любіць зіма
Нагадаць пра вясну.
І пажадаецца,
Нібы ў адчаі,
Босай нагой
Прывітаць баразну,
Неба азяблае
Злецiць вачамі.

*31 студзеня 2007 г.*

## Начую на гарышчы

І аціхае дождж.
І чуваць,
Як босыя яблыкі
Ходзяць па садзе.

*22 жніўня 2004 г.*

## Лётае...

Грому дбаць пра страх
Няма калі.
Цэдзіць цішу
Рэха гулкаротае.
Валачэцца важка па зямлі,
Хто ў аблоках
Лёгкакрыла лётае...

*27 мая 2006 г.*

## Выдумалі...

Вецер выдумалі ветракі,
Каб крылы не ўдзервянелі.
Сонца выснілі жаўрукі,
Каб сілы не ўдзірванелі...

*8 мая 2004 г.*

***

Веснавая бярэзіна
Аберуч трымаецца за жыццё:
Карані ў зямлі –
Галіны ў небе.

*21 красавіка 2009 г.*

***

Вушацкі дождж
Сваё шапоча.
Вушацкі гром
Сваё грыміць.
Мяне расчуліць
Кожны хоча.

Мне добра...

*24 ліпеня 2009 г.*

***

Дзень хоча замаліць
Свае грахі.
А вечар
Не спяшаецца знарок.
І ападае ліст,
Як дождж сухі.
І чутна, як цяжэе
Лёгкі змрок...

*26 верасня 2007 г.*

## Крутабег

Надрыўны кашаль у перуноў.
Адпачынак —
Таксама праца.
Прачынацца —
Каб спаць наноў.
Спаць —
Каб зноў прачынацца...

*27 кастрычніка 2007 г.*

***

Ніяк сваё вецер не дараве,
Аж перацінае дых.
На ліпеньскай зялёнай траве
Восеньскі лістапад вераб'ёў маладых...

*6 ліпеня 2003 г.*

## Накід

Дзень свой цень хавае.
Лета спачывае.
Восені дарэчы
Пацеркі парэчак...

*30 ліпеня 2009 г.*

## Да партрэта навальніцы

Цемнач рассоўвае межы свае.
Пярун цішыню меле
Ў жорнах забытых.
Бліскавіца аўтографы раздае...

*27 мая 2007 г.*

## Перасмыкае...

Пярун пасівелы над мокрым дахам
Не можа ў пагрозах спыніцца.
Аж перасмыкае гарачым страхам
Бярэзіну бліскавіцы...

*1 верасня 2004 г.*

***

З галінкі спадае кропля
У затоку заспаную,
Паўтараючы:
Дзя-куй, дзя-куй, дзя-куй...

Каму?

*15 чэрвеня 2009 г.*

***

Вярсту далёка дагнаць вярсце,
І ценем кручы падперці кручы.
Наіўным цветам дзядоўнік цвіце,
Таму ён такі калючы...

*19 жніўня 2003 г.*

***

Квецені белы рой
Узгадвае чарнарукі сад.
У сонных досвіткаў
Голыя спіны.
І квола цепліць
Галодны пагляд
Халодная кроў арабіны.

*9 снежня 2006 г.*

## Перакуленае

Вогнішчу
Засохлай ігрушыны
Зябка.
Сукаватыя языкі
Цягнуцца ў цёплае неба
Пагрэцца...

*21 чэрвеня 2009 г.*

***

Сабака аж заходзіцца.
Ўзыходзіць сонца.

І што яшчэ трэба
У роднай старонцы?..

*1 верасня 2009 г.*

## Сэнс

Радасна скача ў штанах блыха.
Бочку дубовую крышыць піва.
З цёплага конскага кацяха
Жук узлятае ў неба шчасліва.

*1 кастрычніка 2004 г.*

## Зазімак

Лёгкая ў нястрыманым памкненні,
Рэчка тчэ цяжкое палатно.
Берагу на мокрыя калені
Човен просіцца
Праветрыць дно.

*20 жніўня 2006 г.*

***

У прысталай сасны
Дзяцел стараецца
Выбіць памяць.
А яна сваёй
Аблачынкай зялёнай
Цягнецца пераказаць
Вандроўным аблокам
Таямніцы, якія
Растаемнілі
Карані ў глыбіні...

*8 верасня 2007 г.*

## Уездзіны

У лета ўязджае вясна
На зялёных драбінах.
І колы нязмазаныя
Жаўрукамі світгочуць...

*10 мая 2005 г.*

***

Свой каўнер настаўляе абшар.
Гнёзды згадвае
Смутак птушыны.
Жаўталісця азяблы жар
Грэецца ад вясёлай сцяжыны...

*4 кастрычніка 2005 г.*

## Няўседнае лісце...

Дадаўшы самоце восеньскай суму,
Ветравей насмешліва ў гурбы змёў
Лісце няўседнае вераб'ёў,
Апалае з вечнага дрэва шуму.

*7 лютага 2004 г.*

***

Першы снег
Губляе пух, як белы лебедзь.
Ціша просіцца
Да рэха ў спарышы.
Ёсць прагноз
Пра замаразкі на глебе.

А пра замаразкі на душы?

*4 кастрычніка 2009 г.*

## Непазбежна...

Вяне агонь у кляновай лампадзе.
Вуліцу дождж несярдзіты мяце.
Сніцца падкова вясновай вярсце.
Сум пасяляецца ў кожным паглядзе.
У лістападзе...

*1 лістапада 2006 г.*

***

Па далані ліста
Варожыць восень,
Ці доўга дрэву
Раскашавацца...

*16 верасня 2009 г.*

**Перагукі**

Іскрыста смяецца снег.
Скруха шалее глуха.
Змрок з ценяў азяблых
Шнуркі ў чаравікі сукае.
Згубіла свой след завіруха
І нервова яго шукае.

*12 сакавіка 2005 г.*

***

Здаровы мароз
Быў бы так дарэчы.
Завея ступае нячутнакрока.
Не разабраць
У белай цямрэчы,
Стракоча бярэзінка
Ці сарока?..

*4 лютага 2009 г.*

## Лютаўскае

У сняжніцы
Ўсе спадніцы да зямлі.
Ў завірухі
Рухі пераспелыя.
У завеі
Веі хоць нясмелыя,
Ды мароз
Да слёз вясёлых давялі.

*8 лютага 2003 г.*

***

Дзядзька вусаты,
Як пан ячмень,
Высявае на дарожкі пясок
Рухам прыроднага сейбіта.
Чакаю,
Калі пясок
Праз снег утаптаны праб'ецца
І зарунее азябла...

*4 лютага 2005 г.*

***

Трымаюць
Абнылыя крылы ялін
Лушчастыя свечкі
Ўніз галавою.
І не запальваюць.
Каго ці чаго
Чакаюць?..

*27 верасня 2007 г.*

## Графіка

Восень болей да графікі схільная,
Хоць пакуль што навокал зялёна.
На засохлай ліпе каля магільніка
Голас спрабуе маладая варона.

*28 жніўня 2005 г.*

***

На беразе ракі забыцця
У восеньскай непрыбранай гасподзе
Выраслі тры камяні,
Каб пасядзець было дзе
Аглухлай цішыні,
Згарбелай вышыні
І летуценнай лагодзе...

*28 кастрычніка 2006 г.*

## Нагадвае...

Лятуць над стаўком вятры на размін.
Лета яшчэ на спагаду багатае.
Качка плыве,
І за ёю крэсліцца клін –
Пра вырай нагадвае...

*18 ліпеня 2006 г.*

***

Настрою светла.
Ветла навакол.
Зажмурылася
Цішыня глухая.
Здаецца,
Млечны Жар
Апаў на дол.
Шапоча, шамаціць
І датухае...

*27 верасня 2007 г.*

## Цёмнач

Крумкачэе самотны сум.
Навальнічацца бровы залевы.
Аблачыняць яшчэ не заціхлы шум
Дровы сырыя — ўчарашнія дрэвы.

*14 верасня 2003 г.*

## Сустрэліся

Дзік змроку
Грэў у мосе лыч мурзаты.
Прыснiла рэчку
Рэчышча старое.
Учора і сягонняшняе заўтра
Сустрэліся на вуліцы настрою...

*21 чэрвеня 2007 г.*

## Традыцыйнае

Плыт прыстаў у прымакі да мяжы,
І цяпер ён — плот.
Студня ў дрымотнай імжы
Пазяхае на повен рот.
Яна не паспела забыцца,
Што сястрою крыніца была калісьці.
Вечарэе лагода.
Да мяцеліцы чорныя шчокі гарод
Грэе азяблымі вяснушкамі жаўталісця...

*3 ліпеня 2003 г.*

***

Мурашкі разумнейшыя за нас.
Яны будуюць,
А не разбураюць.
І нам, сляпым,
Зірнуць нарэшце раюць
На свет спрадвечны,
Як у першы раз...

*1 мая 2009 г.*

***

Падчас мілосці не да злосці.
Ад радасці лягчэй расплакацца.
І закахацца ў маладосці
Так,
Як і ў старасці захакацца.

*12 снежня 2003 г.*

## Весняе

Цяплее лес.
Шалее бэз.
Ўсё смялее
Без
Агляdкі
Спрэс...

*3 чэрвеня 2005 г.*

## ***

Маланка радасцю малодзіць соты.
Пярун зняверам рашаціць засек.
Ад ласкі неба і зямной гаркоты
Палын сівее,
Як і чалавек...

*12 ліпеня 2003 г.*

## ?

І ў філосафаў,
І ў дапатопных жней
Яснасці не было ў пытанні:
Ці майстэрства, ці шчырасць —
Што з іх важней
У паэзіі і ў каханні?..

*1 лістапада 2003 г.*

## Маладая

Каб не астарэла хмурына,
Шалеюць маланак змеі.
Датуль маладая жанчына,
Пакуль раўнаваць умее...

*19 лістапада 2003 г.*

## Заікаецца...

Яліны ўзносяць у неба
Зялёны гімн.
Не спяшаецца цень
Падавацца з лясной гасподы.
І, падвячоркваючы галлём сухім,
Ад асалоды аж заікаецца
Агонь гарачабароды...

*22 мая 2005 г.*

***

Прыцiхла ганарыстае ніколі.
У маладога сёння
Белы крок.
Ды дзе-нідзе
Ў прыспаным наваколлі
Чарнеюцца
Праталінкі сарок...

*9 кастрычніка 2007 г.*

## Па-свойму...

Кожны рады па-свойму
Жаданню свайму.
Човен верыць старому вяслу.
І сінічка ляціць,
Каб сказаць пра зіму,
Каб зімой нагадаць пра вясну.

*2 лютага 2000 г.*

***

На золку
Далей ад дарог
Стог шукае іголку,
Іголка – стог.

А навальніца чакае...

*4 верасня 2009 г.*

***

Жмурыцца,
Задумаўшыся над вечнасцю,
Воблака белабровае.
Ластаўка, бесклапотна шчабечучы,
Вераб'я замуроўвае...

*10 лістапада 2004 г.*

***

Думае хваля,
Спачыць ці не.
Ціне і ценю
Праменне сніцца.
Б’ецца замок
На ўчарнелым чаўне,
Як у цыгана завушніца.

*8 сакавіка 2000 г.*

***

Зоркі зябка
Абменьваюцца летуценнямі.
Сосны мераюцца
Аднайменнымі ценямі.
Адвячорку цярпліва
І задуменна...

*25 снежня 2007 г.*

## Краявід з Рысікам

Задыханы дзень
Завяршае абход.
Змрок нерашуча
Топчацца з краю.
Заходзіць сонца,
І рыжы кот
У апошніх праменях дагарае.

*20 ліпеня 2007 г.*

***

Сарамлівы адвячорак
Даланёй баравіны
Засланіў збянтэжаны твар.
І сочыць праз пальцы соснаў,
Як, разлітае ў возеры,
Дагарае пацiху сонца...

*28 красавіка 2008 г.*

## І твой

Зноў простая сцежка
Зайздросціць крывой.
Азябламу саду не трэба падпорак.
Запахлі праталіны першай травой,
Якой зарасце й твой
Апошні пагорак.

*13 мая 2001 г.*

## Хоць на час...

Пераплывеш раку на бервяне
З былых бароў,
Што калыхалі мрою.
Душа начлежнічае ў роднай старане,
Каб крыўды хоць на час
Прысталі за гарою.

*12 ліпеня 2003 г.*

***

Ацалелая брукаванка –
Абніжаны Млечны Шлях.
Як па ачахлых зорках,
Ступаю па камянях.
Спяшаюся да роднага ганка.

*26 жніўня 2004 г.*

***

Адбыўшы блуканняў рату,
Вачыма сустрэўшы надзею,
Вяртаюся ў маміну хату,
Як з панядзелка ў нядзелю.

*1 верасня 2007 г.*

**Багацейшы...**

У восені
Вясёлая імпрэза.
Кудлаціць ліставей
Густыя шаты.
І, багацейшы радасцю
За Крэза,
Па золаце хаджу
Ля роднай хаты...

*26 верасня 2007 г.*

## Дасюль...

Дасюль для памяці
Насцеж расчынены
Вясёлыя весніцы
Суседскіх двароў.
Над комінам родным
Распагоджана аблачыніцца
Даверлівы дым
Бярозавых дроў...

*1 красавіка 2007 г.*

***

Дасвецце заспанае.
Бор сівабровы.
На ўскрайку перазяблай дарогі
Штось палазам талкуюць падковы.
Вяртаюцца сані з маленства,
З незабытай трывогі...

*22 снежня 2005 г.*

## Дома, ці Вушача

Восень дыхае
Лету ў патыліцу.
Дождж абыякава йдзе,
Як час...

*29 жніўня 2008 г.*

## Каб не забыцца...

Хадзікі на сцяне праз усю ноч
Паўтараюць,
Як будзе вада па-латыні:
Ак-ва, ак-ва, ак-ва...

*12 жніўня 2006 г.*

***

У ранішнім садзе
На выгінастым,
Як шлях жыццёвы,
Суку
Стомлена пажаўцелі
Даверлівыя лісціны.
Яблык
У сціснутым кулаку
Трымае
Зярняты ісціны...

*1 ліпеня 2008 г.*

## Нікне...

А сланечнік ля грады
Нікне аблавухі,
Як салдацік малады
Каля векавухі.

*20 верасня 2000 г.*

***

Яблык упаў —
Маладая восень
Паставіла кропку
У першым сказе
Навэлы светлага смутку.

І на момант задумалася...

*18 ліпеня 2008 г.*

## Ля Верасовачкі

Адцвіў дзядоўнік.
Дасівеў палын.
Гусцей чорнабялее
Гвалт сарочы.
Спаткаліся ўспамін і напамін.
Вуж малады ў траву хавае вочы...

*1 верасня 2005 г.*

## Раніца дома

Сарока скіпае
Лучыну вясёлага пошчаку,
Каб распаліць
Сырыя дровы настрою...

*5 ліпеня 2006 г.*

## Чуваць…

Зоркі смяюцца,
А ў кожным паглядзе
Утуманелая ноч.
Чуваць,
Як ходзяць па сонным садзе
Яблыкі басанож…

*21 жніўня 2006 г.*

## Няўцямна…

Радасць праз усе вякі маладая.
І я адчуваю няўцямна неяк,
Як нячутны іней спадае
У вушацкіх бярэзінак з веек…

*10 лістапада 2004 г.*

## Родная Каменская вуліца

Па яшчэ ацалелым бруку са мною
Ступаюць маладыя правіны.
Маркоце хапае спакою,
Пустазеллю — зямлі.
Да нябыту паварочваюцца спіною
Хаты —
Звечарэлыя дамавіны
Душаў,
Якія тут аднойчы жылі…

*13 жніўня 2003 г.*

***

Нагам вязка,
Рукам носка,
На плячох вязка,
У вачох казка,
На душы боска, –
Сябе ўспамінае
Зніклая вёска.

*5 сакавіка 2006 г.*

## Саладзей...

І зноў я на гады багаты.
Пра шлях той думаю радзей.
І камары ля роднай хаты
Кусаюць неяк саладзей...

*30 чэрвеня 2006 г.*

## Без

Пытанне гэтае
Без адгадкі:
А ці свярбяць
У нябожчыка пяткі?..

*28 мая 2007 г.*

## Бывае

Пераплыўшы мора на тачыле,
Яйкі курку сакатаць вучылі...

*14 чэрвеня 2006 г.*

## Пытаецца...

Пытаецца ў рэха
Усмешка ўсур'ёз:
Хто выдумаў кола —
Дарога ці воз?..

*1 кастрычніка 2007 г.*

## Наканаванасць

З той маладой пары
У напамін успаміну
Спутаны конь з гары
Скача ў даліну...

*5 мая 2004 г.*

## І летам...

І летам у чужых краях зімова.
Аж хрыпнуць,
Клічучы дамоў, грамы.
Яна як мачыха,
Чужая мова.
Без роднай мовы
Чалавек нямы.

*26 чэрвеня 2005 г.*

## Не адгоніш...

Бацькоўскія хаты –
Соты
Ў вуллі,
Што завецца радзімай.
Як дымар летуценняў ні раздзімай,
Не адгоніш пчолаў самоты...

*6 сакавіка 2005 г.*

## Бутаўшчына

Могільнік на паганскім капішчы.
Кальчугакорыя сосны.
На адной прыцвікавана шпакоўня.
Няйначай,
Перакінуўшыся ў шпака,
Вольная ад пакутаў зямных,
У ёй душа пасялілася...

*23 жніўня 2004 г.*

## Настрой

Раптоўна рухнула
Прыцемкаў крона.
На душы сцюдзёна і сыра.
На могільніку варона
Каркае мокражвіра...

*21 кастрычніка 2001 г.*

## Ці шмат...

Наогул,
Ці шмат чалавеку трэба?
Акрайчык неба.
Глыток крыніцы.
Каб мог не забыцца,
З якога ён краю,
Чыю дарогу
Наноў паўтарае...

*23 ліпеня 2007 г.*

***

Зоркі не паміраюць.
Яны згараюць,
Каб нам
Вяртацца было лягчэй
Да першаагню...

*10 студзеня 2008 г.*

***

На чужыне
Хто раднейшы тузе?
Ці балюча слязе
На лязе?
Хто па шчасце
Апошні ў чарзе?..

*19 лютага 2008 г.*

## Няма

Радасць лекаваць можна
Толькі тугой.
У радасці вушы глухія.
Як і маці,
Радзімы няма благой,
Ёсць толькі сыны благія.

*21 мая 2005 г.*

## Цяжка...

Сум не важаць
На вясёлых вагах.
Смутку й на вясёлых вагах
Важка.
Без радзімы на чужых абсягах
Нават ветру дыхаецца цяжка...

*27 мая 2007 г.*

## З рукі...

Пʼюць у слова жаўрукі з рукі.
Да яго не прыстаюць заганы.
Словам можна запыняць вякі.
Словам можна перавязваць раны.

*7 лістапада 2006 г.*

## Крывіцкі тост

Радзіма ў нас усіх адна.
Асушым келіхі да дна.
Каб мы жылі,
Каб мы былі
Нязводна на сваёй зямлі!

*15 снежня 2004 г.*

## Звар'яцелае пытанне

*Ля помніка Якубу Коласу*

Мулка ганьбе й славе
На падсуднай лаве.
Вочы бессаромныя ў спакусы.
Ці ж застацца ў Беларусі
Мусяць неўзабаве
Толькі бронзавыя беларусы?

*22 студзеня 2008 г.*

## Снілася...

Прачынаюся...
Усторкваю сонна
На плечы слова.
Ды спахопліваюся,
А гэтая кашуля мая
Вывернута
Ці на той бок?..

*20 ліпеня 2001 г.*

## Штогод

Штогод лягчэе мой умалот.
Скупее на дзіва багатая ніва.
І толькі з роднага краю кот
Адзін мяне разумее маўкліва.

*13 чэрвеня 2006 г.*

## Стомлены

Сум –
Стомлены дарадца –
Сам час свой дабывае.
Ратуе толькі праца.
Яна ж і дабівае...

*20 ліпеня 2007 г.*

## Сапраўды

Свет гэты –
Міт,
Сваяк таму.
З жыцця ў нябыт –
З турмы ў турму...

*28 кастрычніка 2006 г.*

## Вусціш

Самота ў вязніцы
І днюе й начуе.
І рэдкія зоркі
Як кроплі расы.
І вязень
У цішы закрачанай
Чуе,
Як у яго растуць валасы...

*13 мая 2007 г.*

***

Праляцелі, як гусі, дні
Па-над роднаю стараною.
Засталася з усёй радні
Толькі скруха адна са мною.

*8 мая 2004 г.*

## Вясёлая

Патэльня — гарачая сведка,
Хто ў печы падпальвае сварку.
Сям'я —
Вясёлая клетка
У пералюджаным заапарку.

*19 снежня 2003 г.*

## Не зарасце...

Нябёсаў ранішніх бясхмарнасць
Зацемрыць дзённая трывога.
Шлях ад кавярні да лякарні
Не зарасце травою...

*25 кастрычніка 2007 г.*

***

Непрыручаных пнуцца карміць
З рукі
Ўсе вякі дарагімі прысмакамі.
Бываюць з ашыйнікамі ваўкі,
Але
Яны завуцца сабакамі...

*2 лістапада 2003 г.*

***

На растрачанай душы зіма.
Цемра на збязлюджаных абшарах.
Да сябе прыкутаму няма
Праблеску ні ў хмарах,
Ані ў марах.

*18 кастрычніка 2004 г.*

***

Замятае снягамі сыпучымі
Сцежкі памяці і курганы.
Навакольнікі мне знадакучылі,
Бо і сам я такі,
Як яны...

*22 сакавіка 2008 г.*

**Гадуем...**

Думаем, што жывем,
А гэта мы йдзем з гасцей.
Радуемся радзей,
А часцей бядуем.
Думаем,
Што гадуем дзяцей,
А гэта мы
Старасць сваю гадуем.

*5 сакавіка 2003 г.*

## Дзякуй...

Дзякуй начы,
Што хоць на міг
Ад самога сябе
І ўсіх
Можна ў сон
Уцячы...

*27 верасня 2007 г.*

## Смела...

Як у перасохлай студні на дне,
У душы беспрасветна глуха.
Паненка радасць
Ані заўважае мяне.
Толькі смела ўсміхаецца
Пані скруха.

*13 верасня 2005 г.*

## Назусім...

Як па запацелай шыбіне,
Па стомленай памяці
Час правёў даланёй.
І самапытанні звыклыя
*Дзе, што, з кім*
Зніклі.
Ужо назусім...

*1 лістапада 2007 г.*

## Не дужа вясёлае

Як ні старайся на сяўбе,
Вартуе ўраджай патрава.
Жыццё пад старасць у цябе
Як недасоленая страва.

*3 верасня 2006 г.*

***

Якія сняцца самоце сны?
Ці час даганяе
Сябе самога?
Наогул,
Ці адпачываюць яны —
Дарога,
Вясна,
Трывога?..

*5 студзеня 2008 г.*

***

Не трызнячы
Прывідным раем,
Не лічачы пеклам
Свой дом,
Упарта штодня паміраем,
А лічыцца —
Вечна жывём...

*30 чэрвеня 2007 г.*

***

У весялосці вячэра сумная.
Сустрэчай з рэхам
Самота жыве.
Паспее ноч памаўчаць,
Задумацца.
А ў вечара вецер у галаве.

*29 жніўня 2005 г.*

**Сівее...**

У астарэлым маміным садзе
Без мамы зябка і горка.
Сцежку перамяла
Пялёсткавая завея.
На вачах
У замроенага адвячорка
Маладзюткі туман сівее...

*19 мая 2006 г.*

***

Дарагія мясціны наведаць
Ногі прысталі.
Затое ўспаміны
З маладымі нагамі...

*14 студзеня 2007 г.*

## Карацее...

Штодня карацее туды дарога,
Дзе я сустрэў сябе маладога.
Хачу пярэчыць.
Але маўчу.
Перарабіць не магу нічога...

*28 верасня 2007 г.*

***

Багаты час
Скупаваты ў дзяльбе,
Баіцца лішняе даць эпохам.
Чалавек —
Толькі цень самога сябе
Такога, якім ён
Задуманы Богам.

*24 сакавіка 2006 г.*

## Затрымацца...

Малюся, каб дазволіў Бог
Яшчэ па свеце патуляцца.
З усіх дарог,
З усіх трывог
Прыйсці ў сябе...
І затрымацца...

*12 снежня 2003 г.*

***

Прысталі ногі ад зямных дарог.
Лунаюць думкі ясназорным шляхам.
Вяртаецца на стомлены парог
Памкненняў цень,
Які зрабіўся прахам.

*5 сакавіка 2005 г.*

***

Сама сябе шкадуе знямога.
І яна жывая таксама.
Не адпачывае ніколі дарога,
Як некалі мама...

*20 чэрвеня 2008 г.*

## Каляхатняе

З-пад агалелага галля
Зноў восень гляне сіратою,
Напамінаючы пра тое,
Што за расстаннаю ракою
Чакае родная зямля
І рэха вечна маладое...

*2 кастрычніка 2006 г.*

## Вяртаюся...

Смутак бачыць
На парозе маму.
І самота адчыняе браму...

*19 сакавіка 2004 г.*

## Недаравальна

У тлуме клапотаў
І ў сне, і ў труне,
І ў радасці лютай самай
Недаравальна сорамна мне
Перад Усявышнім і Мамай.

*17 лістапада 2003 г.*

## Як сляза...

Ці яно сышло з абраза,
І жыццё
Ім сябе сцвярджае.
Чыстае,
Як святая сляза,
Слова *Мама*.

*17 ліпеня 2007 г.*

# жаўталісця азяблы жар

Каб зімой нагадаць пра вясну...

жаўталісця азяблы жар

## І надзею мае...

Усё цвіце.
І ў падзяку нябёсам
У спракавечным зялёным храме
Сасна трымае ценькія свечкі,
Зацепленыя сонным святлом.
Усё цвіце.
І надзею мае
На працяг,
На спагаду часу.
Усё цвіце.
Спакорваецца лагодзе.
Салавей салодзіць гаркоту жыцця.
Зязюля лічыць стагоддзі...
Сарока свой цень
Нясе на хвасце.
Усё цвіце...

*30 мая 2005 г.*

***

Ступаецца ўпэўнена
Ранняму кроку.
П'е смага нагбом
З маладога карца.
Агонь чуе шэпт
Таямнічага змроку.
Рака прадчувае
Пачатак канца.

Завеі
І абарыгены каменні —
Усе, хто
Настылай душой адтае,
Урэшце свае
Даганяюць памкненні.
Адно чалавек
Ад сябе адстае.

*17 лютага 2008 г.*

## Радасць

Радасць
На зямлі жыццё трымае.
Радасць працы,
Радасць забыцця.
Радасць праснака і каравая.
Радасць маладога адкрыцця,

Што заўчасна пасівее гора,
Покуль цёмназмрочча дапаўзе.
Сёння ёсць!
І пра глухое ўчора
Радасці забыцца балазе.

Радасць шчыра
Запрашае ў госці,
Хто засумаваў
З сабой самым.
Вучыць заставацца маладым
Сэрца,
Непадлеглае зайздросці.

*15 лютага 2007 г.*

## Пад парасонам

Адштурхнуўшыся ад святла,
У ваколлі дажджыста-сонным
На спатканне, відаць, плыла
Чараціінка пад парасонам.

Чарацінку чакаў Чарот,
І няйначай яшчэ зялёны.
Намагаўся прэсны народ
Закруціць яе ў вір штодзённы.

Жмурылася ў зайздросці імгла.
Мокры гук
Шаптаўся са звонам.
На спатканне з лёсам плыла
Чарацінка пад парасонам.

*13 ліпеня 2007 г.*

## На плячы ў нецярпення

Дагасаюць сляды ліставею.
Аблачынка ўспаміну плыве.
Грэе позірк азяблай надзеі
Першы снег
На зялёнай траве.

Першы снег
Яшчэ сыдзе, растане.
Зноў узыдзе
Трава па вясне.
Сум прыстане
Прыспешваць расстанне,
На плячы ў нецярпення
Засне...

*24 снежня 2007 г.*

## Да мроі...

Да мроі як падаць рукою.
Ступае смутак наўздагад.
Нябёсы поўныя спакою.
І задуменны далягляд.

Прыгоркаў згорбленыя спіны.
І прысмерку нячутны крок.
Памаладзелыя ўспаміны.
І пасівелы васілёк.

*7 ліпеня 2004 г.*

## Раслі...

Ах, якія раслі бур'яны!
Як нязмушана ў іх былося!
Досвітак,
Як той конь вараны,
Тут губляў сваё перапялёссе.

І крышыліся бур'яны,
І калоліся, як папрокі,
Тут жа засветла,
Хто не ляны,
Аблюбоўваў начлег шырокі.

З бур'яноў уцякалі сны,
Ведалі —
Тут не тое штосьці.

Як умелі маўчаць бур'яны!
І раслі яны ў
Маладосці...

*8 сакавіка 1996 г.*

## Адрозніць...

Смутак летнюю смугу вітае
І не хоча думаць пра зіму.
Восенню ўзгадаецца яму
Бесхмурынная хвіліна тая,

Што ўсміхалася свайму настрою
І дрыжэла ў кроплі дажджавой.
Развінуўся мурагоў сувой,
Каб прайшла па ім нячутна мроя.

Ранішняя мроя-недаткёнка
У каралях з маладой расы.
Успамін адрозніць галасы:
Гэта сіваграк,
А гэта слонка...

*3 чэрвеня 2001 г.*

***

Лірычны верш –
Юнак дзівоснай моцы й
Мужчына,
Што адчуў сваю бяду.
Касмічны сон
Усіх зямных эмоцый,
Табе на плаху
Галаву кладу.

І паўтараю
За Пятраркам шчыра,
Душою загавеўшы
Да Каляд:
«Мілосны верш!
Пясняр знямог, і ліра
Наладжана на самы сумны лад».

*24 снежня 1995 г.*

***

Ласка ўрэшце пераможа зло.
Зайздрасць анямее назаўсёды.
Радасці вясновае вясло
Ахіне аблокамі лагоды.

Цень ад крыл анёлавых падзе
Яблыні на ранішнія скроні.
Сонца будзе сведкаю ў судзе,
Вышле скаргу елка на сутонне.

Колас долу ціхаму паклон
Адаб'е за кожнае світанне.
Возьме холад марнату ў палон.
Ад парыўнай жарсці час адстане.
Застаецца юным трапятанне.

*15 верасня 2001 г.*

## Як быццам...

А гэта ўсё як быццам не са мной:
Старэю, напінаюся, хварэю,
Гляджу ўдагонку маладому рэю,
Манюся смутак
Заручыць з маной.

Была вясна,
І лецейка было,
І шчодрылася восень залатая.
Яшчэ трывае сподзеву сцябло,
А лістапад зіме пад ногі аблятае.

*10 лістапада 2000 г.*

## Шляхта

Гадоў маіх
Шляхта вушацкая ўсмак
Адфэсцілася, адбалявала.
Даверу сарамлівы юнак
З асцярогай пабраўся трывала.
І засталася яшчэ са мной
Гадоў няпэўная рэшта
Штурхацца
Спаміж гаманой і маной,
Да канца спадзявацца на нешта.

*18 сакавіка 2003 г.*

## Выбіраю

*Каля зорак і каля*
*Вуснаў тваіх гаваркіх...*
Кэнэт Рэксрот

Зоры ўтойваюць нешта,
Вусны ведаюць штосьці.
Грэе зорная рэшта
Ад высокай міласці.

Ад міласці,
Якая
Праз вякі не змаўкае.
Ад міласці,
З якою
Шэпча вір асакою.
Ад міласці,
Якую
Ветравінне смакуе.

Закаханы як хворы...
Сцежка ў неба сырая...
Слухаць вусны
Ці зоры,
Я не ведаю.
Выбіраю...

*12 жніўня 1995 г.*

## Світай…

Прачнуцца на чулым плячы
Хацела б нядзеля ў аўторка.
Ключы жарсці аддаючы,
Цярпенне зажмурыцца горка.
Як ростані дні ні лічы,
На сэрцы самотна і золка.

Світай жа і ўдзень і ўначы,
Чакання трывожная зорка.

*24 чэрвеня 2001 г.*

***

Не трэба з успамінам сустракацца.
Бо напамінам
Зробіцца ўспамін.
А напамінам лёгка абстрыкацца,
Што крапівой,
Дзе ў прымаках палын.

І ўжо ніяк
Не вылезеш з маркоты,
Як тое дрэва
Са сваёй кары ж.
Падаўшыся ў вясёлыя залёты,
У палыновым полымі згарыш...

*18 снежня 1995 г.*

***

Сакавіковыя крокі
Чуюць азяблыя ўзмежкі.
Лётаюць лёгка сарокі,
Як падгарэлыя снежкі.

Пад лёдам падталым рэчка
Чакае сустрэчы з чоўнам.
Доўжыцца даўняя спрэчка
Белага з чорным...

*8 сакавіка 2008 г.*

## Мова

Вяроўка з ласкі звітая,
На якой
Ты можаш засіліць
Падступны смутак,
Разгубленаю рукой
Завязаўшы нарэшце пятлю.
Вяроўка звітая з чысціні,
Якой
Залыгацьмеш чароды чутак,
Заганяючы іх у спакой
Непрыкаяным словам
*Люблю.*

*29 лістапада 1997 г.*

## Можаце...

Маладая вясна
Пасылае вас на...
А вы малады
Можаце йсці
Туды
Ці
Куды яшчэ,
Покуль ваш цень худы
Не ўцячэ
У хлуды...

*8 мая 2007 г.*

***

Веснавое
Зялёнае полымя.
Восеньскае
Чырвонае полымя.
Зімовае
Белае полымя.
Самі сябе дапальваюць,
Каб году святлей было
Ступаць па зямлі.
І весялей смуткаваць
Чаканню...

*24 красавіка 2008 г.*

## Радзіма кахання

Родны край – гэта там,
Дзе аднойчы каханне
Нарадзілася, каб нарадзіць
Для вачэй маладых
Маладое світанне,
Каб на радасць душу разбудзіць.

Родны край – гэта там,
Дзе раптоўна каханне
У палон узяло, павяло
Неадумна рашуча
Цябе на спатканне,
Каб лагода ўзяла пад крыло.

Родны край – гэта там,
Дзе хацела каханне
Маладосцю сябе паўтарыць.
Не дарэмна спатканню
Зайздросціць расстанне.
Зорка шчасця высока гарыць.

Я кахаю!
Лунае нябёсаў вітанне.
Я кахаю!
Вякоў запавет.
Кожны носіць у сэрцы
Радзіму кахання.
На каханні трымаецца свет!

*23 верасня 1997 г.*

## Радовішчы радасці

Радовішчы радасці знайсці
Нялёгка,
Бо іх ахоўвае гора.
Жарынкі жарсці
Згараць на лісці –
На лістах, што ў заўтра
Напіша ўчора.

Радовішчы радасці, яны
Невычэрпныя,
Таму анікому
Не ўцячы ад свае маны,
Што разгубленасць
Верне дадому.

Жаху ані ў галаве,
Дзе ходзіць нявестка –
Вестка благая.
Гора ў харомах жыве.
Радасць
Пад зямлёй залягае.

*19 кастрычніка 2003 г.*

## Каб аддаць...

Не цурацца ніякіх пакут.
Быць у згодзе з маладым дакорам.
Жыць і думкай тут,
А не за морам,
Каб аддаць душу было не сорам
На пракорам
Недаспаным зорам.

А не загайданаму самому
Гадаваць нястомленую стому...

*4 чэрвеня 2003 г.*

## У несканчоным свеце

Старасць баіцца павітацца з каханай.
Каханая заўсягды маладая.
Неба ўзросту праз гады халадае.
Жарсць галадае, прывечаная пашанай.
Колькі яе кахаюць –
Гэтулькі гадоў адшуканай
У несканчоным свеце мілосці.
Восень зрэдчас
Да вясны завітвае ў госці.
І сівець застаецца злосці,
Ашуканай ласкаю апантанай...

*5 мая 1997 г.*

## Кахаць...

Кахаць – надзею калыхаць.
Няхай расце!
Кахаць – гаціць праз пекла гаць
У пекнаце.

Кахаць – спаборніцтва пачаць
З Тварцом самым.
Кахаць – пра цішыню крычаць
Усім глухім.

Кахаць – самоту ашукаць.
Грэх – не манах.
Кахаць – пяшчоту адшукаць
У камянях...

*9 снежня 1997 г.*

## Ды спяшаюцца...

Знячэўны, прыкмеціш,
Вечарэць пачала
Твая апошняя раніца маладая.
Аблачынка абачлівая
З небасхілавага чала
Сплыла –
І ў гасподзе душы
Здрадліва халадае.

А за сабой не заўважыў,
Калі ты ўзімеў, аб'інеў,
Дазволу не запытаўшы
У свайго даверлівага хацення.
Неспакой злагаднеў,
Прытаміўся раўнівы гнеў.
Ды спяшаюцца ценем адным
Стаць два нецярплівыя цені...

*2 мая 2003 г.*

## Пад аркаю

Рунь набірае сілу.
Хмаркам хапае ўвагі.
Б'еццa ў грудзёх небасхілу
Жаўранак раўнавагі.

Над светам
Нябачнай рукою
Узнята арка спакою.

*3 снежня 2003 г.*

## І палова...

Кожны крок
Сваю сцяжыну сцежыць.
Гром шукае
Свой апошні ўзгрым.
Вечар з ноччу
Маладым належыць.
Ранне і палова дня –
Старым...

*16 верасня 1997 г.*

## Падушка

Восень вятры скубе
І сама сабе напявае.
Пер’ем ветравым набівае
Насыпку,
З кужаліны неба пашытую
Нецярплівай іголкай маланкі.
Ніткі тумановыя блыталіся.
Насыпка выйшла малая.
Восень рукамі цёплымі
Прыцемкі кратае.
Уздзявае на насыпку
Навалачку воблака
Велікаватую.

Вечар падушку,
Як малечу, гушкае.
Болей гэткай не знойдзеш
Нідзе.
Яна падабацца павінна сну.
Гром яе
Пад гулкую галаву кладзе,
Каб не праспаць вясну...

*22 снежня 1998 г.*

***

Так памірае зорка,
Пасля сябе на тысячагоддзі
Пакідаючы след лагодзе.

Так памірае летняя ноч
У нетрах сэрцаў употай,
Губляючы святло й пяшчоту.

Так памірае мілосць,
Як зара вечаровая за гарамі.
Гарыць, але не згарае...

*12 студзеня 2005 г.*

## Якраз...

Зіма хадзіла зімнымі дварамі,
Шукала завірушныя сляды.
Яшчэ пупышкі пахлі сівярамі
І час не заўважаў свае гады.

Ільдзінка,
Як падталая падкова,
Круцілася ў раскручаным віры.
Ды я пачуў
Цурчанне жаўрукова,
І сам памаладзеў
Мой сум стары.

Маўчаць
Самоце стала немагчыма.
Сабраліся ў дарогу валуны,
Калі мы ўсё ж
Сустрэліся вачыма
Якраз за паўгадзіны да вясны...

*6 сакавіка 2000 г.*

## Не адкажа...

Гады свае ўжо лічу на вёсны,
Зязюлям шчодрым
Не даўшы веры.
Хай сам Ярыла,
Як бацька хросны,
Аксціць грымотна
Мае намеры.

Яшчэ паспею ўзысці травою,
Пясчынкай
У вока часу запасці.
Я цемры свячу
Галавой сівою
Падпасавічам
На восеньскай пасце.

Але не ўцямлю,
Ці сон дзівосны,
Ці даўнаваты прынеслі хвалі.
Сон не адкажа,
Як гэта вёсны
З каханых
Хутка ўнучкамі сталі.

*23 сакавіка 1999 г.*

## Маладое віно

Маладое віно
Хмеліць па-маладому.
Маладое віно
Маладое душой.
Маладое віно
Не даводзіць дадому —
Спаць да дня пакідае
На падушцы чужой.

Маладое віно
Цвеліць па-маладому.
Пазлачаначка-чарачка —
Светлае дно —
Не даверыць нікому
Салодкую стому,
Толькі ёй і яму.
Маладое віно.

*17 сакавіка 1998 г.*

***

Падасца,
Што былі яны даўно,
Спатканне,
Развітанне,
Хваляванне.
І засталося ранішнім адно
З усіх пачуццяў
Ціхае чаканне.

*17 снежня 1997 г.*

## На сустрэчу

Заплюшчыўся,
І на мяне зірнулі
Далёкія мае былыя вочы.
Яны мяне, вядома, не пазналі.
А я ўгадаў, ажно памаладзеў.
...Глядзелі на здарожаную стому,
Як чорныя агеньчыкі, гарэлі
Мае калісьці, нейчыя цяпер.
І не было ў іх, чыстых, ні папроку,
Ні шкадавання, ні цяжкога смутку.
Ды штосьці скіравала іх, відаць,
Вясёла развітацца
На сустрэчу...

*1 верасня 2002 г.*

## Палон

Усе мы ў міласці ў палоне.
І ў нашых адзіных для нас
Аблокамі пахнуць далоні,
На міг запыняецца час.

Да радасці ломімся ў госці,
Сячэм пад сабою сукі.
Мы ўсе ў ягамосці міласці
Няпрошаныя жабракі.

Пярун у раскацістым тосце,
Да зор свой паслаўшы дазор,
У гонар крыўдлівай міласці
Падыме прадонне азёр.

І космас брыво небакраю
Нахмурыць, як горды сусед.
Каб выдыхнуць слова *кахаю*,
Аднойчы прыходзім на свет.

І слухае рэўнасць глухая,
Як блытае вернасць сляды.
Былосць звечарэла ўздыхае.
У згоды настрой малады.

Прачнуўшыся з зоркаю ранняй,
І цень свой не ўбачыць спакой.
Паненка знайменіцца паняй.
Міласць не бывае ўдавой.

Ні кпінаў, ні позіркаў косых
Мілосць не баіцца нідзе.
Каб толькі не гнуўся той посах,
Што юнага ў сталасць вядзе.

Мілосць — і лагода, й карыда,
Рака, дзе не спяць берагі.
І самая лютая крыўда
Ад тых, хто табе дарагі.

Такое надумае штосьці
Настрой, што самога сябе
Пачне раўнаваць да мілосці,
Абдзелены ў шчодрай дзяльбе.

І моцы не хопіць зайздросці
Халоднай пабыць хоць у снах.
І вочы ў галоднай мілосці
Пазычыць баіцца манах.

Шануе мілосць аблачынку,
Што жарсці аценіць чало,
Каб неба здалося ў аўчынку,
З якой жыць усё пачало.

Мілосць — гэта шчырасць і праца,
Акшчоны нябёсамі рух.
І мусяць жывыя старацца,
Каб вечны агонь не патух.

*11 кастрычніка 2003 г.*

## Дзве

Ёсць жарсць шалёная,
Што ўсё патрушчыць,
І ціхая, як водгулле,
Міласць.
У жарсці зірк
Ад слепасці хітрушчы.
Міласць апусціць
Вочы ў небыласць.

Льга з жарсцю
Пасварыцца й памірыцца,
Перахітрыць сябе,
Нібы ў бядзе.
А ягамосць міласць,
Як тая жрыца,
Ахвяру на ахвярнік
Пакладзе...

*15 мая 1997 г.*

## **Аль-бомнае**

Лістападзіць настрой
Драбязінка любая.
Мне цябе не хапае,
Як каню мурагу.
Не тужу, не ўсыхаю,
Не ржу, не ўздыхаю,
Не ведаю сам,
Ці кахаю.
Ведаю —
Без цябе не магу!

*15 ліпеня 2005 г.*

## Суцеш

Перапёлка шэрая,
Адкажы, прашу,
Чым жа ты вячэрала,
Нашчыла душу?

Ці расой заспанаю,
А ці каласком,
Ці нябеснай маннаю
За глухім стаўком?

Будзь жа госцяй быстраю
За маім сталом.
Пачастунак выстаўлю —
Пераксці крылом.

Мой настрой зажураны
Голасам суцеш.
Небасхіл зажмураны
Знічкаю разрэж...

*4 снежня 1997 г.*

## Пазычае...

Валадарыць у гэтым свеце зніканне.
І пытае ў дрэва трывання лісцё,
Ці жыццё даўжэйшае за каханне,
Ці каханне даўжэйшае за жыццё?

Пазычае ў сонца сарамлівае ранне
Хоць праменьчык для звечарэлых вачэй.
І супернічаюць жыццё і каханне.
А крыўдлівай душы ад таго не лягчэй.

*14 чэрвеня 2005 г.*

## Кропля

Неразгаданая кропля
Нашай зямлі.
Крамяная кропля
Ўрачыстай зоркі.
Закаханая кропля
Журботнага вока.

Кропля мёду ў вуллі.
Кропля дажджавое гаворкі.
Кропля кропкі
Ў Запавеце Прарока.

... Кропля жарсці,
Зямносцю сваёй незямная,
Жыццё зачынае...

*27 кастрычніка 2004 г.*

## Пацёмшчык

Пацёмшчыкі святла не любяць,
Пра закаханых жартавалі.
Нашто святло вачам, якія
Прапаляць змрок, распаляць рэўнасць.
Нашто святло рукам, якія
Навобмацак вядуць гаворку.
Нашто святло губам, якія
Прыгубяць, прыгалубяць, згубяць.

Падзёншчыкі начэй бяссонных,
Пацёмшчыкі – сваты світанняў.

... Мяне ў асветнікі піхаюць,
А я ў пацёмшчыкі
Вярнуўся б...

*18 кастрычніка 1995 г.*

## Спаконна першыя

У змроку свой цень адшукае,
Любы яму лёгкі цяжар.
Як трэба,
Сябе ашукае
Пястун бліскавіцы –
Пажар.

На свет
Мы прыходзім спрасоння.
Настрою будзіць нас шкада.
А рух не засне,
Бо ў далоні
Злавіцца не дасца
Вада.

Спрыяюць жывому абшару,
Каб ён не зважаў на гады,
Гарачыя вочы пажару,
Халодная памяць вады...

*18 жніўня 2007 г.*

## Недатыкальны запас

Кожнай душы,
Каб ачуліць яе,
Каб распагодзіць турботы,
Неразгаданая доля дае
Недатыкальны запас пяшчоты.

Зайздрасць сляпая,
Галодная злосць
Прагнуць намесці сумёты,
Каб разбазарыла пані Міласць
Недатыкальны запас пяшчоты.

Мроі звыкаюць
Лагодна смялець.
І ў свеце –
Гасподзе самоты –
Не дазваляе давар'яцець
Недатыкальны запас пяшчоты...

*18 лістапада 2005 г.*

## Шчырасць

*Але Сакалоўскай*

За шчырасць
Толькі жарсць адна
Шчырэйшая
На гэтым свеце.
Жыццё нагбом —
І піць да дна!
Каб быць
У лёса на прыкмеце.

Згубіцца
Ў зманлівым жыцці,
Не чуць нічога
І не бачыць.
Пасля
Сябе ў сабе знайсці
І жарсці
Шчырасцю аддзячыць.

На неадступныя гады
Звяртаць увагу
Не жадае,
Бо пані Шчырасць
Заўсягды
І гожая і маладая!

*15,19 лютага 2007 г.*

**Але...**

У грудзях халоднай скалы
Шалёна б'ецца крыніца.
Самаўзвышаючыся ад хвалы,
І ў сне
Скала сама сабе сніцца.

А не задаволены сам сабой
Першанец пяшчоты і гневу,
Закахаўся ў скалу прыбой,
Разбіваючыся на густую залеву.

Часам хочацца
Палагаднець скале.
Але...

*26 студзеня 2006 г.*

## Не дарадца

І малому сучку
На крамяным ствале
Ліставейнай хапае працы.
Я хачу цябе з сэрца прагнаць,
Але
Сэрца – розуму не дарадца.
Парасчуліцца хочацца
Часам скале,
Вогнішчу з туманом пабрацца.

Думкі хочуць забыцца цябе,
Але
Напамін – забыццю не дарадца.

Не панура
Віну й на жалобным стале,
Не самотна віне дакарацца.

Я хачу цвярозым пабыць,
Але
Я шаленству свайму не дарадца...

*14 кастрычніка 2003 г.*

## Заўсёды!

Ці ёсць яна,
Апошняя мілосць?
Як ёсць, дык толькі
Першая заўсёды.
Чаканы госць –
Заўсёды ягамосць.
Свет існіцца
Пад зоркаю лагоды.

Кахаеш – значыць
Дыхаеш, жывеш.
Мілосць –
І празарлівая, й сляпая.
Бо закаханы –
Апантаны верш,
Які нахабна
Па зямлі ступае...

*29 студзеня 2006 г.*

# жыта жыцця

І няма ў гэтым свеце
Бяскрылых...

жыта жыцця

## Аднойчы

Аднойчы хоча асмялець мастак
Спадручным Усятворцавым назвацца,
Перш чым на хмараплывістых мастах
З душой сваёй зажуранай спатканца.

На развітанне шчырая душа
Распавядзе,
Дакуль яна трымцела.
Увогуле любы мастак –
Ляўша,
Калі ён сэрцам творыць звар'яцела.

Калі ён сэрцам бачыць гэты свет
І той,
Што як свайго яго чакае.
Тут на зямлі пакінуць ціхі след –
Фатыга асалодліва цяжкая.

Пад мройны плён
Падставіўшы латак,
Не дазваляе лёс сябе калечыць.

І лічыць вёрсты зорныя мастак,
Якімі йсціме
Ўсятворцу ўкленчыць.

*14 снежня 2003 г.*

## Вершапраходцы

Вершапраходцы крывіцкай мовы,
Іх шлях
Не ўсыпаны быў васількамі.
Гатовыя да размовы з вякамі,
Знаёмілі з рэхам
Знямелыя словы.

Вучыліся ў неба
Нахмарваць бровы.
Жар-птушку рыфмы
Лавілі ў блакіце.
Шматкроп'е зорак
Ставілі ў міце
Вершапраходцы крывіцкай мовы.

*13 студзеня 2008 г.*

***

Дай, мова беларуская, руку,
Перавядзі цераз раку нябыту.
За ўсё, што мне паслала на вяку,
Табе купіў бы сукню з аксаміту.

Збіраю, як жабрак па медзяку,
Па слову, плоцячы пагардзе мыту.
Ты неўміручая — і, як мерцвяку,
Сон ажывіш з-за кратаў алфавіту.

Табе адной даверыцца душа —
Заступніца, парадніца, шчыруха.
Іскрынкі выкрычыць агонь з сушша.
І гора, й радасць утаймуе скруха.
Няхай на сухалес ідзе імша.
Калі цябе не чую — ў свеце глуха.

*14 студзеня 2001 г.*

## Здаралася...

*Генадзю Бураўкіну*

А здаралася на Беларусі,
Малацілі сноп на абусе,
Блін пяклі на лязе сякеры,
Праснакі ў рыдля на далані,
Толькі не выракаліся веры
Ды крывіцкай сваёй радні.
Косамі да цвярдых мазалёў
І мурог, і сівец касілі,
І няпрошаных бабылёў,
Бо чужой не кленчылі сіле.
Жарсць любіла каса-літоўка,
Што крамяная семнастоўка.
І панеў сабе ў Беларусі
Хлеб гасцям на бялёвым абрусе.

*12 мая 2005 г.*

## Крылы

Крылы – рукі настрою.
Яны
За паветра прывыклі трымацца.
Ды не так,
Як цялятка пры матцы.
Там яны,
Дзе на выпасах сны.

Крылы – хрэсніцы мроі.
Яны
Акрыляць палы дух блаславёны.
З ланцуга дзён
Знікомыя звёны
Пералье цішыня на званы.

Небасхілу зайздросціць мяжа.
Ліст смяецца
На вербах панылых.
І няма ў гэтым свеце
Бяскрылых.
Крылы ёсць
І ў стрыжа, і ў вужа...

*9 верасня 1997 г.*

## Апора

*Пятру Васючэнку*

Ад сэнсу маючы ключы,
З мілосцю мудрасць спалучалі
Шляхетнейшыя палачане,
Харобрайшыя крывічы.

Аблогу цемры аручы,
Карчы валілі без адхлання
Разважлівыя палачане,
Даверлівыя крывічы.

...Насуперак чужой начы
Вы наша нашчыце світанне,
Галіністыя палачане,
Рэліктавыя крывічы...

*16 верасня 2006 г.*

## Даецца...

Мы давяраем
Ружовым крозам
У чорна-белым
Сваім жыцці.
Не толькі разумным
Даецца розум.
І мусіць розум
Сябе пасці.

Даецца сок
Вінаградным лозам,
Каб захмялеў
І цвярозы клёк.
Ісці за возам
Цікаўным козам.
Што воз пусты,
Не відаць здалёк...

*7 красавіка 1997 г.*

## З нагоды...

У кожнага мора свая глыбіня.
У кожнага сэрца свая таямніца.
Крыло і хмурынка –
Нябёсам радня.
Спякоце крыніца сцюдзёная сніцца.

І мора калісьці гарою было.
І гора смяялася радасным смехам.
Спяшалася цемру пабачыць святло.
І ціша ажно заікалася рэхам.

На беразе мора чакаем усе
Надзейнай пагоды,
Душэўнай лагоды,
Калі з нашым шчасцем
Чаўны прынясе,
Што лёс пасылае нам
З добрай нагоды...

*22 чэрвеня 2001 г.*

## Жыць!

*Францішцы Сокалавай**

Жыць
Нашым словам,
Нашым галасам,
Як у трывалым жыце
Каласам.

Жыць
Нашым светлым хмарам,
Што заўжды
Чало святла
Цянілі ад бяды.

Жыць
Нашым марам,
Што вядуць шляхі,
Як ластаўкі,
З-пад роднае страхі.

*2 студзеня 2007 г.*

* Францішка Сокалава — перакладчыца вершаў Рыгора Барадуліна на чэшскую мову. Зборнік «Žyt!», Praha, 2006.

## Той…

Яны
Зямлю спачатку абжылі –
Звяры і птушкі –
Пушчы ды вазёры.
Ім ленавацца не было калі.
Раскацíста вятрам
Было ў галлі,
Сляды вякоў
Губляліся ў быллі.
Ад першасораму яснелі зоры.

Пасля прыйшоў заспаны чалавек
І ўсё парушыў,
Папаліў, пасек.

Дагэтуль ён
І днямі і начамі
Усё, што засталося,
Даніўчае.

Ды той перамагае
У двубоі,
Ў каго не сілы злой,
А болей болю…

*28 красавіка 2007 г.*

## Хапіла...

З-за золата зямлю перавялі,
А з-за зямлі — людзей,
З-за дроваў — пушчы.
І ўсім хапіла золата й зямлі.
Стаміўся зрок сляпы
І змрок відушчы.

Хапіла дроваў на агнішчы,
Дзе
Згарэлі парыванні і надзеі.
І самавынішчэнне рэй вядзе,
Пакуль само дашчэнту
Знелюдзее.

*5 красавіка 2003 г.*

## Гонар і голад

Гонар і голад –
Браты чужыя.
Ніколі не зміраццца
Спаміж сабой.
Гонар вячэрае
Светлай журбой.
Голад віе
Вяроўкі на шыі.

Доля,
Як ластаўка маладая,
Лепіць гняздзечка
Ў падстрэшку вясны.
Гонар не ступіць
На сцежку маны.
Голад самога сябе
Даядае...

*10 красавіка 2008 г.*

***

Мана і нябесная манна.
Дзе манна, а дзе мана?
Як сонная спёка, рахмана
Людская гудзе гамана.

Мана небасхілу й бязмена
І праўда зямлі сырой.
І рэха клянецца бязменна
Лагчынаю і гарой,

Што перадае слова ў слова
І думкі, й настрой Перуна.
Журбоціцца праўда сурова.
Лісліва якоча мана...

*3 мая 2004 г.*

## Кагосьці дзесьці...

Калісьці
Хтосьці кагосьці
Паклікаў прыйсці
У госці.
Дагэтуль чакаць
У госці
Чамусьці камусьці
Хапае мосці.
І ўсмешка, і сцежка
Усцешна
Гатовыя везці і весці
Уежнае, ўлежнае
Дзесьці,
Дзе будзе і піць,
І есці,
І ў кожным
Заможным тосце
Вяльможна ўцякаць
Ад злосці.

Цікаўныя ягамосці
Ад сквапнай зайздросці
Патайна
На патэльні пытання
Смажацца самі
Карасямі ў цесце.
Хто гэты ці гэны хтосьці,
Дзе
Гэта ці гэна дзесьці?..

*16 жніўня 2003 г.*

## Саромеюся...

Я саромеюся крыві
Безабаронна голай.
Бо яна, цягавітая,
На вачах памірае,
Каб зноў цячы
І, забыўшы балючыя крыўды,
Не дазволіць жыццю
Спыніцца.

Ці напамінанне гэта,
А ці заклён?
Ды з маленства
Да апошніх дзён
Я саромеюся крыві...

*30 мая 2008 г.*

## Свае

І тупая,
І вастрадзюбая
Куля
Палец нагадвае нечым.
Палец той,
Што нядоўга думае,
Што спачатку
Быў чалавечым.

Куля й палец,
Яны як свае.
Заручыла іх
Злая дзея.
Палец сцята
Ў цемры гніе.
Куля моўчкі
Ў зямлі іржавее.

Куля й палец
Як немач і страх.
Іх сябрына,
Як спрэчка, жывая.
Скіраваць
Рупіць пальцу шлях.
Куля шлях абрывае...

*13 лютага 2007 г.*

***

*Валі*

Я без цябе,
Як без ветру вятрак.
Ты мой настрой і трывога.
Знаходзіць
Сваю праталінку грак.
Луг раскашуецца
Зялёнастога.
Кон — ён адменны
Актор і мастак.
Мілосць
Разгаворыць нямога.
Ад смутку
Дужэе знямога.
Я без цябе,
Як без ветру вятрак...

*3 лістапада 2009 г.*

## Белая цішыня

Баіцца белая цішыня
Паварухнуць азяблымі пальцамі.
Каркне варона —
І з сонных соснаў
Снег насцярожана
А-
  сы-
      па-
          ец-
              ца...

*1 лютага 2005 г.*

## Чорны дзяцел

Чорны дзяцел
У заснежаным бары
Ціха лекуе сасонку маладую.
Маладая завіруха калядуе.
У застуджаных вятроў настрой сыры.

Чорны дзяцел
У насцежаным бары
Да таемнасці жывіцы дападае.
Хоць гадоў не лічыць
Скруха маладая,
Дачакалася зіма сваёй пары.

Пра чарэнь
І пра ката на каптуры
Снам на вуха
Шэпча згадка маладая.
Беспрытульнаму маўчанню спагадае
Чорны дзяцел
У значлежаным бары...

*2 лютага 2005 г.*

## Што?

Што адчувае цень,
Калі яго хоча змрок
Заціснуць на вузялок?

Што адчувае дуб,
Калі яго да ашчэру
Цалуе сякера?

Што адчувае,
Выліўшыся да кроплі,
Залева?

Ці саромеецца сябе
Прыслоўе:
Заб'еш бабра —
Ўратуеш дрэва?..

*4 верасня 2008 г.*

## Перадзім’е

Сівяры адчуваюць
Сваю сцюдзёную сілу.
Паціху галоднае рэха
Ад голасу адстае.
Рэчка спяшаецца
Шыю абвіць
Ўтуманеламу небасхілу,
Пакуль яшчэ
Цёплыя пальцы ў яе...

*14 студзеня 2007 г.*

***

Вуж –
Жывая вяроўка,
З якой
Жах звівае пятлю,
Каб засіліць
Задуменны спакой,
Што хоча
Пасля начы
Разважліваю ракой
Цячы
Наўсцяж

Аж
Да зааблочча...

*13 ліпеня 2008 г.*

## Васільковае

Даверлівыя васількі –
Нябёсапольмныя свечкі.
Ім вырывацца
Так дарэчы
У ветра сквапнага з рукі.

Павесялелы далягляд
Зрабіўся раптам васільковым.
І летні гром разжыўся словам
Сказаць,
Што ён прачнуцца рад.

... Як далікатнымі цвікамі,
Прыбіта рэха васількамі
Да асачыстых берагоў,
Дзе хвалі сноў
Шукаюць схоў...

*2 чэрвеня 2007 г.*

## Сваякі

Галінка ружы
І калючы дрот.

Галінка
Лісцямі зазелянее.
Дрот парыжэе
Ад іржы й імжы.
Цвет на галінцы
Ўспыхне вогнявока.
На дроце кроў
Балюча закрычыць.

Дрот і галінка –
Нечым сваякі.
Як промні і цвікі...

*2 студзеня 2007 г.*

## Захопнік і абаронца

Спачатку захопнік,
Які захапіць імкнецца,
Што магчыма
І што немагчыма,
Рукамі, намерамі.
Хоць вачыма.

Пасля абаронца,
Які намагаецца абараніць
Усё нахапанае.
І дарагое, і таннае.

І ўрэшце
Разам з усім
Ператвараецца ў прах,
Над якім
Валуном надмагільным
Страх
Адлежвае бакі
Праз вякі...

*23 красавіка 2008 г.*

## Праснак

Гісторыя —
Жорны пачэсныя.
Спачыну не ведаюць камяні.
Праснак спаконнай праўды пячэцца
З мукі мітусні й хлусні.

І печы под не халодае,
Падмецены скразняком.
Вар'ят, на ўладу галодны,
Падавіцца праснаком...

*18 снежня 2003 г.*

## Прагнуць...

Вякі – галодныя ваўкі,
Дні – перазяблыя сініцы,
Бяруць у голада з рукі
Усё з капкана і з пляніцы.
Дапасці хочуць наўпраасткі
Напіцца з вечнае крыніцы
Вякі – галодныя ваўкі,
Дні – перазяблыя сініцы.

*28 мая 2006 г.*

## Чорна-белы

Чорна-белы кот –
Як ноч і дзень,
Што развітваюцца
На змярканні.

Пазычае кот
Бярэзіне свой цень
І, бяросту росту
Змераўшы,
Знікае
У знявераную мрою.

Чорна-белы кот
Азяблага настрою...

*8 мая 2007 г.*

## Шукае

Комін –
Абеліск у памяць пушчы,
Што загінула ў галоднай печы.
Воблакам зрабіўся
Дым відушчы,
Каб сябе адчуць у стравеччы.

Комін стыне.
Воблака блукае.
... Зноў даліну сноў
Душа шукае...

*27 красавіка 2007 г.*

## Вернасць

Колькі ні смяяліся з вароны,
З голасу картавага ні кпілі, –
Падаў ейны цень
На лбы й на троны,
Седалам былі сукі і шпілі.

Свой убор да пер'іны варона
Ад часін паганскіх захавала.
Што ж за ёй дагэтуль падазрона
Сочыць чалавечая навала?

Хто вароне гнёзды разбурае,
Хто крадзе галюткіх варанятак,
Хто дурной варону называе,
Беспрабудна ходзячы ў вар'ятах?

*18 студзеня 1997 г.*

## Каб успомнілі...

Усё забываецца, ніякавее.
Як што застаецца,
Дык толькі забытае.
Перадзазімкавая ліставея
Вятрыстыя думкі галін пераблытае.

І навальнічныя аблачыны
Сябе дапаляць у снежным полымі.
Галіны папросяцца ў напаміны,
Каб некалі іх, згалелых, успомнілі.

Галодную памяць
Стомленай глыбіні
Варушаць перамоклыя карані.

*11 лістапада 2001 г.*

## Й...

Золатам яшчэ жывым
гай асыпае дол
за дазвол
вым-
кнуць угору.
Неба
не ба-
іцца дакору
вятроў
вандроў-
ных,
ад якіх
гола
й
хола-
дна
на-
ва-
кола...

*24 снежня 2007 г.*

## Кусман сну

Выгарыць на вятры
Пыхаю парусіна.
Ціхая ласка сына —
Газаю ў ліхтары.

Будзеш прасіць: паўтары
Цень ад крыла жураўліны,
Дотык халоднай гліны.
Выраю востры локаць
З тога зялёны,
Калі
Ён упіраўся ў лотаць
На веснавое зямлі.

Вецер — як спадар.
Дол падмяце слата.
Праглыне ліхтар
Язык дагарэлы кната.
Сцюжаю нагадаецца сквар.
Занядужае вечар-ліхвяр.

Імжа-хуткацечніца
Звечніцца...

*28 лістапада 2003 г.*

***

Хто бачыў,
Як плачуць арлы,
Сягнуўшы за чорныя хмары?
Дзявочыя вочы імглы
Баяцца сурочыць пажары,

Што грэюць душу вышыні
Сваёй палымянай пяшчотай.

І плачуць арлы ў цішыні
Ад гордай самоты ўпотай...

*15 верасня 2008 г.*

***

Не горбяцца сосны,
Каб адна адной
Не замінаць
У неба цягнуцца.
І цені не гнуцца,
З выпрастанай спіной
Прытулак сабе
Адшукаць імкнуцца.
І пнуцца
Сагрэць цішыню
Гарачыя далоні агню.

Як дрэва без караня,
Расце вышыня...

*7 сакавіка 2008 г.*

## Халодная лагода

Узлесак стаіць як абдзіртус.
На хіб калючы іржэўніку,
Ціхі, дагістарычны,
Сеецца сонны снег.
Як не замлеюць рукі,
Што ў небе трымаюць рэшата,
Каб гэтак разважліва, мерна
Сыпаўся пыцель, з якога
Калядных бліноў напякуць
На негарачым сонцы...

*24 снежня 2000 г.*

**Яны...**

Віно віны
Надзейна хмеліць,
Не заціхаючы, шуміць.
Віно віны
Лагоду цвеліць,
Шчыміць
І вочы ўзгадкам цьміць.

Віна віна
Трывае ўпарта,
Як ні стараецца мана.
Глыбокая
Ў суцехі кварта,
У ёй ні берагоў,
Ні дна.

Яны як сны,
Адны здаўна –
Віно віны,
Віна віна...

*21 снежня 2007 г.*

## Mater atrium necessitas

*Генадзю Мацуру*

Маці ўсіх мастацтваў — неабходнасць.
Неабходнасць рупіцца,
Каб жыць.
Неабходнасць змусіць верагоднасць
Да задумы плён прываражыць.

Неабходнасць звыклае з'іначыць,
Прыкарміць святлом,
Як птушак, дні.
У падкове
Смех вясёлкі бачыць,
Чуць у слове
Крокі цішыні.

Сцежка да раскутасці крывая.
Лёс здаўна
Скупы ў сваёй дзяльбе.
Мастака па-над сабой трымае
Неабходнасць выказаць сябе...

*17 чэрвеня 2006 г.*

## Нашчадкі

Знікаюць беларусы,
Як зубры,
Прыручаныя
Гаспадыняй воляй.
Ні Белавежаў,
Ні бязмежжаў болей
Няма.
Як ні хітры,
Як ні мудры.

Дом стаўся цесным
Для гаспадароў.
І ланцугі куюцца
Кавалямі.
Нашчадкі
Ценямі валадароў
Род доўжаць
Паслухмянымі валамі...

*17 снежня 2007 г.*

## Быць!

*Ігару Сарокіну*

Быць Беларусам –
Гэта значыць
Свайго ні гуку не забыць,
Усё чужое перайначыць,
Каб Беларусі вечна быць!

Быць Беларусам –
Гэта значыць
Вясёла з сумнай долі кпіць,
Да Бога сцежку верай значыць,
Нагбом з карца надзеі піць.

Быць Беларусам –
Гэта значыць
За родны Край згараць на дым,
Па-беларуску чуць і бачыць
На гэтым свеце і на тым.

*19 верасня 1999 г.*

## Не да сну...

Свабода.
Ёй і ўночы не да сну.
Баіцца, пільная, праспаць світанне.
Адно, што можа, –
Выпрастаць спіну
Сабе дазволіць
Парабчанка й пані.

Бо неба мроі
На яе спіне,
І просіцца на ўвагу
Дол спакою.
Свабоду стома
Змрокам ахіне,
Амые сподзеў
Зорнаю ракою.

Падданніца
І апякунка дня
Няшчадна нішчыць
Кайданы і краты.
І слухае начная цішыня,
Як астываюць
Рыцарскія латы...

*12 красавіка 2006 г.*

## Жывосць

І камень таксама жывы.
Жывая ахвяра і кара.
Убачылі крылы Ікара
Зялёную ўсмешку травы.

Упарціцца змроку блакіт.
Спакою не верыць трывога.
Знябыціўшы столькі жывога,
Жывы для паўтору нябыт.

*16 лістапада 2003 г.*

## Тры словы

Бязмежжа, сподзеў, святло
Кунежацца
Ў слове *было*.

Маркота, пустэча, імглосць
Трываюць
У слове *ёсць*.

Сцежка ўсмешкі
Знікае ў хлудзе
У слове *будзе*.

Тры словы
Супярэчлівыя, дасведчаныя,
Ды
Гатовыя да размовы
З Вечнасцю
Заўсягды...

*31 кастрычніка 2007 г.*

## Жыта жыцця

У жыце жыцця
Не ўсе каласы
Аднолькава любяць зярняты.
Не ўсім стае
Цеплыні і расы,
Каб быў каравай багаты.

Умее чакаць
На куце куцця.
Пакорыцца доля прыкмеце.
Пакуль каласуе
Жыта жыцця,
Зямлі не самотна ў Сусвеце...

*29 лістапада 2007 г.*

# ахвярынкі

Душы нашыя
Сподзевам нашчацца...

ахвярынкі

*

Калі дазваляў Усявышні
Затрымацца на гэтым свеце,
Што меў на мэце?

*

Бог чалавека стварыў,
Каб было
На кім прымераць дабро і зло.

*

Каб бачылі нашыя душы далёка,
Над зямлёй незаходна ўзыходзіць
Вока Прарока.

*

Льга ашукаць
І сябе самога.
Але не Бога.

*

У Бога мёртвых няма,
Бо душы спаконна жывыя.
А Зямля — для сябе турма.

*

Слова —
Ўсяго аснова.
Душа відушчая ў слова.

*

З жыцця былога,
Як з успаміну,
Да нябеснага Бацькі вяртацца
Сцюдзёна блуднаму сыну.

*

Там айчына душы,
Дзе магчыма
Пасвіць цёплыя зоркі вачыма...

*

Сам сябе дагнаць спрабуе след.
І, паўтораны ў сваіх нашчадках,
Чалавек самотны, як Сусвет.

*

Чалавек шлях ліста паўтарае:
Аддрыжыць на галіне жыцця,
Покуль прыме зямля сырая...

*

Цвік забівае ў сцяну малаток.
Чалавека ў зямлю заганяе жыццё.
Прамень заганяе ў заўтра сёння.

*

Калі нараджаецца, галосіць дзіця,
Бо душа ягоная не ведае
Сумную радасць жыцця.

*

Калі зацята стараешся
Спакойна думаць пра смерць —
Значыцца жыць збіраешся.

*

Зорку пачуць
Можа толькі душа,
Бо таксама самотная…

*

Падвешвае лёс калыску бяссонную
Кожнаму за цёплую зорку ягоную.

*

Усё жыццё мітусіцца,
Старацца, каб прыдбаць
Не патрэбную анікому
Стому...

*

І як ты
З жыццём ні хітрыш –
Яно на табе ставіць крыж...

*

За нястомнасць і ўсяжэрнасць тлену
Спраўна аддае жыццё падаткі.
Рупцеся, старэйшыя, пра змену,
Каб было каму кусаць за пяткі!

*

Жыццё
З такімі хітрымі вачыма,
Што ад яго ўтаіцца
Немагчыма!

*

Жыццё – жывая чарга туды,
Дзе мяняюць на Вечнасць
Зямныя гады...

*

Няўтульна думцы на чужых падворках.
Як досвітак па неачахлых вугалях,
Мой сум ступае па гарачых зорках.

*

Галоўнае ў гэтым жыцці —
У час адысці...

*

Не прыдумалі яшчэ калёс,
На якіх
Аб'ехаць можна лёс.

*

На погарб апусціцца
Цяжкай птушкай
Камень,
Каб стаць апошняй падушкай.

*

На небе ці на зямлі
Калі яна адпачывае,
Спадумка жывая?

*

Жабрак бяздомны
І пан вяльможны —
Сабе належаць
Павінен кожны.

*

Думу не давярай суму.
І цішыні не мані.

*

Мая душа —
Ляўша...

*

Шлях непахісны:
Пасля пакут —
На кут...

*

У сцяну цішыні заганяюць цвік гуку,
Каб пачапіць адрыўны каляндар сноў.

*

У свята радні багата.
Аблога –
Абранка нарога.
Адплата – сужэнніца ката.

*

Урач дзіцячы
Лечыць дзяцей
І дарослых,
Якія здзяцінелі...

*

У радасці бесклапотнай
Думка не ў галаве.
Журбой чалавек жыве.

*

Ступаць аднолькава тузе
Ці па лязу,
Ці па слязе.

*

Ступай шырэй,
Каб паменеў
Твой шлях у краіну ценяў.

*

Свет аб'ехаўшы,
Спакойна зразумей —
На радзіме
Да магільніка бліжэй.

*

Пень стахлы і атожылак тугі —
Жывая дыялектыка спрадвечча,
Маўклівы сказ працягу і тугі...

*

На чужой старане
Прыме зямля сырая,
Ды не прыхіне.

*

Спярша пад табою
Гаворыць зямля.
Яна ж над табою
Зашэпча пасля...

*

Карацее наша дарога.
Ступаем туды, як у заўтрашні дзень,
Пра які невядома нічога.

*

Душы нашыя
Сподзевам нашчацца...

*

Вяскоўцы, гараджане, хутаране.
Мы ўсе падданцы смерці —
Паміране.

*

Высока сябе чалавек нясе,
Каб абнізіцца,
Стаўшы пяском ці глінай.
Роўныя ўсе перад дамавінай...

*

Ад смерці ратуйся,
Але рыхтуйся.

*

Як душа абрастае лускою,
Чысціць яе
Нецяжкою рукою.

*

Тым і жыву,
Што новаму дню
Раю далечыню...

*

Раўнавазе трэба
Гэтак мала —
Каб хвароба
Жыць не замінала...

*

Прыходзіць лёгка на гэты свет,
З яго адыходзіць няўтульна.

*

Прысягнуўшы ў вернасці нябёсам,
Зоркі ў светлай змове
З нашым лёсам.

*

Пакуль я збіраўся
Развагу прасіць на падмогу,
Жыццё мільганула,
Як заяц цераз дарогу...

*

Нам толькі дазволена ў жыцці
Да недасяжнай мэты
Смела йсці.

*

Кляновая субота –
Траецкія Дзяды.
Зялёная дарога на клады...

*

Душа не лічыць
Зямныя гады.
Яна маладая назаўсягды.

*

Падспудна адчуваю, што даўно
Я надакучыў і трывозе, і знямозе.

*

Не за бяседным сталом,
Не ў труне –
Самым сабой чалавек застаецца
У сне...

*

Мой смутак пастарэў,
Вярнуўся смех дамоў.
Ды так і не сустрэў.
Ды так і не знайшоў...

*

Чалавек штовек
Працуе да поту
На сваю ляноту.

*

Шлях, як галлю,
Усім турботам –
З зямлі ў зямлю
І ў неба потым.

*

Ясней па часе робіцца ўсім –
Сяброў у старасці, як валасоў.
Ці дужа рэдка, ці гола зусім.

*

Таму ён і тупіцца,
Нож,
Што ўсюдых торкае нос...

*

Сёння — гэта заспанае ўчора,
Якое сябе разбудзіць забылася.

*

Прыгнаныя з прадоннай цішыні
Тугою валачомнай ці дакорам,
Свае маленства помняць камяні.

*

І тут усё як у людзей — надмагіллі
Выпінаюцца адно перад адным.

*

Ісціна не давярае папроку.
І прымае нашы аблічча жыццё,
Каб на сябе падзівіцца збоку.

*

Здаецца, слухаю ўпершыню,
Як стракатлівыя кавалькі
Куюць зялёную цішыню...

*

Збыўся
Старавечча сон прарочы,
Покуль свечка
Выплакала вочы...

*

Досвітак за плячыма.
Цёмнач перад вачыма.
Цераз роспач цярпліва
Цягне мост перспектыва.

*

Дзень расце вясною,
Каб расло
Для чаўна ўзаемнасці вясло.

*

Хоць жаўталісце долу б’е паклоны,
У лета ад начы і дня ключы.
І сухарукі сад яшчэ зялёны.

*

Крокі дачакаліся касца.
Свеціць недакошанаму лугу
Непатушаная свечка дзьмухаўца.

*

Мароз цвікі забівае без малатка.
Дарога сонная грэецца ў лесе
Усмешкаю маладзіка.

*

Ад адзіноты старэе сад.
Апошняя памірае хата.
Ў сядзібы забытай зялёны пагляд.

*

Чым адмераць,
Каб не памыліцца,
Колькі кіламетраў бліскавіцы?

*

Чыю пачуе чалавек падзяку
За тое,
Што з ваўка зрабіў сабаку?

*

І асвойчаныя ваўкі —
Чалавеку не сваякі.

*

Хутка бяздомныя разумнеюць.
Каты з сабакамі плачуць разам,
Што людзі іх не разумеюць.

*

Сон глытае мяне,
Як кіслае малако.

*

Ранняму жаўранку не да сну.
За пазухаю ў ветра зацішна
Ўзрушанаму Перуну.

*

У нябыта ўсё на прыкмеце...
Неба чорнае, як некралог
Па чарговай планеце...

*

Пра што нарэшце дбаў руплівы Ной —
Пра кожнае дыханне
Ці пра гной?

*

Над бяссоннаю крыніцай
Ноч схілілася дрымотная.
Хмара ксціцца бліскавіцай.
Далеч моліцца грымотамі.

*

Усёдазволенасці двайніца,
Ноч любіць цёмную глыбіню,
Але зірнуць на сябе баіцца...

*

У першыя гады заўсягды
Вяртаюцца першыя халады.

*

У кожнай каметы свае прыкметы.
У кожнай зоркі свае пагоркі.
У кожнай карэты свае кюветы.

*

А ці ветру голаму баліць
Недабінтаваная бярэзінка?

*

А на небе ані пыліны.
Чортаў профіль маладзіка
Над зялёным крыжам яліны.

*

Аблокі — стомленыя крыгі
У задуменным моры мары.

*

Выскачыў рух
У цішыні з пакою,
Каб зарасці
Асакою спакою.

*

Голы дождж
Не саромеецца начы —
Абы цячы...

*

Каб вышыню спасцігнуць,
Думцы рупіць напіцца
З капытка веташка...

*

Каб хмурынка.
Паўдзён, як шчупак без лускі,
Задыхаецца ля ракі...

*

На вуліцы каляровыя мухаморы
Пнуцца дождж апярэдзіць.

*

Сон
Мае вочы памяці,
І таму ён бачыць
Усё...

*

У ветракоў спадзяванняў маіх
Абнылі крылы.
Ці гэта проста вецер заціх?

*

Вецер нешта рабіне на вуха
Гэткае прашаптаў,
Аж зачырванелася маладзюсенькая...

*

Вогнішча сівое,
На старасць злое,
Зоркам маладым
Пускае ў вочы дым...

*

Над долам вясёла ўзвіліся,
Ды не ўтрымаліся доўга
Аднакрылыя матылькі
Жаўталісця...

*

З кім маюць падзяліць
Свой сум дзявочы
Вясновых зорак мроістыя вочы?

*

На вуха ветру
Шэпча жаўталісце:
І я было зялёнае
Калісьці...

*

Нам даспадобы,
Мне й красавіку,
Варона на бярозавым суку...

*

Рэха дагнаць і ўгаварыць
Вярнуцца назад —
Гэта і ёсць паэзія.

*

Застацца за ўсё страшней
З вока на вока
З сорамам...

*

Сон —
На момант здзейсненая мроя,
Як наноў узведзеная Троя.

*

Пытанне-назола
Кружляе наўкола,
Ці ёсць ён, пачатак,
У круглага кола?

*

Пра гэта самае
Каркае на суку варона:
Без грошай і ў спёку сцюдзёна.

*

Нічога ў свеце новага няма.
Старое ўсё –
І вечнасць, і турма.

*

Ні страла не адкажа, ні лук,
Хто пяшчотнейшы, вуж ці вожык,
Хто лягчэйшы, ці цень, ці гук?

*

У суцяшэння
Чужая кішэня.

*

Змяя без джала не джаліцца.
Змяніўшы кашулю апошнюю,
Каму ёй без джала жаліцца?

*

Калі пастарацца,
Льга адпачыць ад працы.
А як адпачыць ад сябе?..

*

Завыць бы ваўком,
Ды як навучыцца?
Лясы павысеклі.
Дапалявалі ваўкоў...

*

Грошы й камень куюць,
І чалавека цкуюць.

*

Як у нектар
Не вярнуцца воску,
Так і гораду ў вёску.

*

Рыжы паўсюды рыжы —
І ў Полацку,
І ў Парыжы...

*

І выццё —
Таксама жыццё,
Толькі сабачае.

*

Траянскай пароды коні
Цукар бяруць
З далоні.

*

Сабаку, які ўпадабаў хвастакрутку
І выслужыў персанальную будку,
Разагнацца на волі льга
На даўжыню ланцуга.

*

Сутнасць улады ў барацьбе за яе.
А ўлада па-свойму даўгі аддае.

*

Душа не хоча прызнаць за свае
Мае здарожаныя гады.
Ёй, змаладзелай, хады стае...

*

Даланю
Мазалі пакідаюць.
А душу?..

*

Быццам чорнаму буслу,
Душы
Просіцца затаіцца ў глушы.

*

Змываюць ручаі
З сівой шчакі скалы
Грымучы мёд змяі,
Салодкі яд пчалы.

*

Парыву жарсці не шкада.
Яно й халодным пацалункам
Працалавала лёд вада...

*

Восені хапае неспакою.
І пачырванела арабіна.
Што яна падумала такое?

*

Каб сталі жонкамі Лаура ці Марыля,
Як бы Франчэска ці Адам
Загаварылі?

*

Для самотных
На кірмашы
Прадаюцца кошкі –
Скрэбцiся на душы.

*

Гэта ведае змеянятка,
Што пяшчотная самая –
Ягоная матка.

*

Каханне – хвароба,
Ды ад яе
Лекаў няма,
Бо ніхто не шукае...

*

Маўчыць галінамі ў неба крона.
У закаханых і ў глуханямых,
Як змоўцы, вочы крычаць шалёна.

*

У глухой труне
Я ад людзей адпачну
І людзі адпачнуць ад мяне.

*

Не кожнаму
Д'ябал ключы давярае
Ад брамы сямейнага раю...

*

Мулкая дужа
Клетка сям'і,
Збітая з рэбраў мужа.

*

Знелюбела жонка – халодная печ.
Конь скапыціўся. А дровы ў лесе...

*

Па сынах, што стаяць
Па шчасце ў чарзе,
Матчынай трывозе балюча,
Як на лязе слязе.

*

Колькі яму дасцё,
Столькі вам і аддасць
Жыццё...

*

Хрыстовых вачэй вазёры
Напоўненыя святой
Світальнаю мілатой.

*

Пасля нябесных дарог і трывог
Дзе адпачываціме Бог?

*

У неба на высокім чале
Маршчынка Млечнага Шляху.

*

Душа вядзе за тыя небасхілы,
Дзе родныя аблокі і магілы.

*

Я пачынаю баяцца вечара.
Бо за вечарам следам прыйдзе яна,
Мая апошняя ноч. І вечная.

*

Вяртаюся, вяртаюся туды,
Адкуль ужо не вернуцца сляды.

*

Ні ў радасці, ні ў бядзе,
Ні на Страшным Судзе
Не адракуся ад Беларусі.

*

Развітанне —
Мабыць, што й апошні
Раз вітанне.

*

У роднай хаце спаконна
Маці — другая жывая ікона.

*

І сцяжыны сыноўняга лёсу
Ціха ў гэтым свеце пралеглі,
Як маміны чорныя косы.

*

Позна прыйшоў я сказаць прабач.
За сасной, недалёка ад мамы,
Селіцца на магільніку свежы плач.

*

Мама —
Пасярэдніца між Богам і сынам,
Дзеліцца небам і хлебам адзіным.

*

Я да скону заручаны з той стараною,
Дзе мама, як зорка,
Стаіць нада мною...

*

Ты пад сэрцам насіла мяне,
А цяпер
Я нашу цябе ў сэрцы,
Мама.



На аўдыенцыі ў Папы Рымскага Яна Паўла II у Ватыкане
28 чэрвеня 2004 г.



З Папскім Нунцыем архібіскупам Марцінам Вадовічам.
Мінск, 2006 г.



З айцом Уладыславам Завальнюком. Вушача, 2005 г.



Ля Вушацкага касцёла св. Лаўрэна пасля прэзентацыі кнігі «Ксты» 11 верасня 2005 г.





У Стакгольме з Алай Сакалоўскай. Красавік 2006 г.

У Беларускім ліцэі ў Гайнаўцы ў Польшчы. 2006 г.





Пачаткоўцы з Якубам Коласам. 1955 г.

З Петрусём Броўкам. 70-я гады.





З Піменам Панчанкам. 80-я гады.

З Уладзімірам Караткевічам. 1972 г.





З Васілём Быкавым. Мінск, 80-я гады.

З Міколам Аўрамчыкам. 90-я гады.





З Генадзем Бураўкіным. 90-я гады.

З Сяргеем Законнікавым і Валянцінам Тарасам. Вушача, 2005 г.





З мамай Кулінай. 1958 г.

У Верасовачцы ля бацькавай ігрушыны. 70-я гады.



З жонкай Валянцінай, дачкой Ілонай, унучкай Дамінікай.
1994 г.





Яшчэ Арэц!..

Ля роднай брамкі.

# Змест

Яшчэ мне хочацца жывой вады...
*Кс. Уладыслаў Завальнюк, Ала Сакалоўская* 5

**На шалях дабра і зла** 9
Не паверыць... 10
Непадуладны 11
У чарзе 12
Яшчэ не ноч... 13
Каб паспеў... 14
І нагадвае... 15
Успамін 16
На шалях дабра і зла 17
Прачынаемся... 18
З намі... 19
«І вецер не ведае, дзе...» 20
Каб не зябла... 21
Мова камянёў 22
Непрычаканы... 23
Халаднее... 24
«Як перад выраем...» 25
Па-новаму... 26
«Зжаць загон нашых дзён...» 27
Omnia mea mecum porto 28
Чужэюць... 29
Пералётня 30
Адпаведна 31
Ціха... 32
Відаць... 33
«Усё жывое...» 34
Будзіў... 35
Напомняць... 36
Недарэмна... 37
«Жыццё сабой занятае...» 38
Прызімак 39
«Таго не хапае...» 40
Лягчэй... 41
«Жыццё рыфмуе...» 42
Адно... 43
Бадай што... 44

Пані ....... 45
Падзеліцца... ....... 46
Лёс не кожнаму... ....... 47
Гузікі ....... 48
Усіх... ....... 49
«Мінулае...» ....... 50
Каб не мялела... ....... 51
Позірк цішыні ....... 52
У мроях ....... 53
Боль ....... 54
Не маючы... ....... 55
«Пасвечвае залысінамі тло...» ....... 56
SOS ....... 57
Там... ....... 58
«Жыць — значыць жаць...» ....... 59
«Па жыцці...» ....... 60
Жыві! ....... 61
Якая рука... ....... 62
Тады й цябе... ....... 63
Збудзь... ....... 64
Не знелюдзець... ....... 65
Хоць... ....... 66
Аддаваць... ....... 67

**Ціха ўкленчы нябёсам** ....... 69
Мне светла... ....... 70
Як па сухому... ....... 71
Слава! ....... 72
Шчырэць... ....... 73
Іначай... ....... 74
Anno Domini ....... 75
Прыходзіць... ....... 76
На мове матчынай... ....... 77
28 чэрвеня 2004 года ....... 78
«Шалом, Ерусалім...» ....... 79
Касцёл ....... 80
«Шчодры Госпадзе!..» ....... 81
Маці Божая Будслаўская ....... 82
Малітва Матчына ....... 83
Хвала пчале ....... 84
«Светлая Апякунка раёў...» ....... 85
«Іспас...» ....... 86
Прыйдзе... ....... 87

І нанова... 88
Не тут 89
Парабкаванне 90
Дасведчаная дабрыня 91
На дне прадоння 92
З далоні 93
За веру 94
Касцельны звон 95
Дзе тая? 96
Згараючы... 97
На ручніках 98
Досыць! 99
Ля Селішчанскага касцёла 100
Балюча... 101
На тое... 102
Як думка 103
Хрост 104
Калыханка 105
Радзімалюб 106
Знядзеленыя вочы 107
Вераю 108
Трыпціх Чырвонага касцёла 109

**Я забыўся, як бульба цвіце...** 113
Дрэмле сон... 114
Мой род 115
«Жыву не тут...» 116
Шпакоўня 117
Подых 118
Падлётак 119
«Сны маленства майго залатога...» 120
Зябка 121
«Каса й сякера...» 123
Вузельчыкі на памяць 124
Вогнішча 125
Адказ рэху 126
«Мама радзей пачынае сніцца...» 127
«Я забыўся...» 128
Зялёнае людства 129
Неразгаданая... 130
Запросіны 131
Крэўнае 132
Экспромт 133

Імяніны... 134
«Асланяе брамку ў родную хату...» 135
Перачытваю... 136
Нанізаць... 137
«Прыспаны змрок...» 138
Таксама... 139
«Праз яшчэ зялёны...» 140
«Сінічкі раннія спевы...» 141
Вясціны 142
«У прыхмараным небе...» 143
«Курку топча певень...» 144
«Мітуслівая шляхта...» 145
Вушацкая сасна 146
«Адвячорак той самы...» 147
«Засохлая ігрушына...» 148
Суседзі 149
Ноч у дарозе 150
Дагасанне 151
«Люляюць старыя яблыні...» 152
«У маленстве радасць...» 153
«Каб зрэзаць галінку...» 154
«Запалі магіл утравелыя грудзі...» 155
Спрэчка 156
«Прыгадвае свой цень...» 157
Зноў дома 158
«Абсягу адсутна і нема...» 159
«Конь спакойны, як стол...» 160
«Певень голас падае...» 161
«Шчырэйшага болей нікога няма...» 162
Трыумвірат 163
Ці не гэткі? 164
Перазімавалі... 165
І потым... 166
«З сухой аблачыны...» 167
Прапажа 168
Чуе дном... 169
Дзе ветрава радзіма? 170
«Птах вёслакрылы...» 171
«Выходжу на ганак...» 172
«Страх на гарышчы заціх...» 173
«Сонца прачнулася...» 174
Настраёвае 175
«Сухарукі сад...» 176

«На паганскім капішчы...» 177
Арэц 178
«Аблавухі вятрак...» 179
«На лясным магільніку...» 180
Зямляцкі трыпціх 181
«У падстрэшшы мамінай хаты...» 182
Прыляцелі.. 183
Адвячорак ля мамінай хаты 184
«Мама ткала...» 185
І чуе... 186
Адкажы.. 187
Маміна слова 188
Хоць нешта 189
«Жыццё — кароткі шлях на кут...» 190
«Ты сабе, душа...» 191
«Рана цямнее...» 192
Застаўся.. 193
Іншапланецянін 194
«Калі люляўся ў пупышцы...» 195
«Кожны існы...» 196
«А што яшчэ...» 197
Меней... 198
Няўжо... 199
Журба нерастрачаная 200
На гарадскіх хутарах 201
Даганяючы вякі 202
Як жар 203
Задажджыла... 204
Туды, 205
У адпаведнасці з настроем 206
Іду 207
Вякі і землякі 208
Чужы... 209
Дзе можна... 210
«Я прашу шаноўную цішыню...» 211
«Зрабіўся белым марны прах...» 212
Каб мог... 213

**Паміж тлом і святлом** 215
«Не першы прыйшоў я...» 216
Пакуль... 217
«Яшчэ на гэтым свеце...» 218
Пацярпі... 219

Звіняць… 220
Каб… 221
Спачувае 222
«Усё цяжэй насіць свае гады...» 223
І помніць… 224
Трывожнай ахвотай… 225
Не пакінуць… 226
Няпэўнасць 227
Журлівае 228
«Відаць, мне цяжка будзе паміраццa...» 229
Слядамі дажджоў 230
«Ноч кроіла цемру на...» 231
Усё яшчэ… 232
Смутнае 233
«Пераходзяць па мне...» 234
Жыву… 235
«Збіраючыся, затрымацца...» 236
Не скажа… 237
Рака й чалавек 238
Куды? 239
Лічыць… 240
Твае 241
Следам… 242
Самотны воўк 243
І я там… 244
Зялёна 245
Змаркочанае 246
Нетутэйшы… 247
Сурочаны… 248
Пытанне 249
Auribus tenco lupam 250
Перадвесне 251
Як зразумееш… 252
«Вусы падрыгваюць...» 253
На дно… 254
Яшчэ ляцець… 255
Кожны сам… 256
Рабства 257
Змеі агню 258
Наканаваная няволя 259
Ворагі 260
Не змог… 261
Шчырэюць… 262

Трымае... 263
Цвёрдая валюта 264
«Даўнейшы ён за шлях...» 265
Нябачны... 266
Невядома... 267
Не самой... 268
Грэе... 269
«Знябытае, забытае...» 270
Хай без мяне... 271
А ўсё-ткі... 272
Жаўранак кахання 273

**Вянцы ізруба** 275
Як хрэснік... 276
Паволі... 276
«І Вечнасць шануе цяпло...» 276
«У небе начным...» 277
«Жыццё — як выдыхнуты верш...» 277
«Засмягне рэха баравое...» 277
На памяць 278
«Што табе дадзена...» 278
Недагарэлыя 278
Варта... 279
Вернецца 279
У каго? 279
У госці... 280
«І памяці твая апрыкла праца...» 280
«І не было супыну сцежцы...» 280
«Закон жыцця...» 281
«Жыццё — такі прымусовая праца...» 281
Дасць... 281
«Пры няпрошанай ростані...» 282
Усё роўна... 282
«Праз гады...» 282
Скеміць... 283
«Малітву не заглушыць брэх...» 283
«Перш чым тленам зрабіцца...» 283
Сустрэча 284
Прапанова 284
Маўчаць... 284
Добрай ночы! 285
«У зорак позіркі заімгляцца...» 285
«А калі пагасне...» 285

«Нядоўга на покуці стыне куцця...» 286
Шэпт 286
«Стаіўся смех...» 286
Каб не закрычаць... 287
«Не шкадаваць, і не хваліць...» 287
«Не тухне ён...» 287
Бліжэй... 288
«Напомніць сыты крум крука...» 288
Паразважалі... 288
Сцюдзёна... 289
«Дык як адгадаць загадку...» 289
«Дзе суцішыцца...» 289
»Дарослым стаць...» 290
«Галодная праўда...» 290
«Рагатаў бы глыбокі роў...» 290
Доўг 291
«Нанова вучыцца поле...» 291
«Пакуль яшчэ ў выраі халады...» 291
«Не зашкодзіць...» 292
«На магільніку месца суму й сну...» 292
Час 292
«Бліжэю сэрцам да зямлі...» 293
Забытая хата 293
Чарга 293
«Адыходзячы з гэтага свету...» 294
«Мой цень карацее, ніцее...» 294
«Смутак прывідны, як туман...» 294
«І жыццё пранасілася...» 295
Льга 295
Вачыста 295
«І сам, яшчэ напалову ў сне...» 296
«Спадчыннай маўклівасці запас...» 296
«Спачатку прачнуўся дзень...» 296
Дарагі... 297
«Не загадаюць журбе...» 297
«Перш чым ступіць на ганак...» 297
Без развагі 298
«Расце трава...» 298
Было... 298
Трэба! 299
«Слёз на ўсіх хапае...» 299
«У Вечнасць хочацца ўвайсці...» 299
«У садзе...» 300

З гасцей.....300
Шчасліва….....300
«Хто адкажа...».....301
Выснова.....301
Прыкуты.....301
«Ці ў часе мы...».....302
Роўныя.....302
Адкрыццё.....302
Яна.....303
Пацвярджэнне.....303
А думаю….....303
«Гарачы град з вачэй...».....304
«Талент...».....304
«Па страле адляцелай...».....304
«Пасля палётаў...».....305
«Падкова зрываецца з вухналя...».....305
Допыт.....305
Прыдумаў.....306
Штодзённасць.....306
Паслуга.....306
«Мужык нездарма разумны...».....307
Каб вольны….....307
Сама.....307
Спакон.....308
«Нялёгка вырашыць страху...».....308
«А грошы і слава...».....308
Засячы!.....309
Заробак інтэлектуала.....309
«Як прагнозы збываюцца...».....309
«Хто каго ловіць...».....310
«Уткнуцца ў бераг...».....310
Пеня пню.....310
Проста….....311
«Чалавек...».....311
Сподзеў.....311
Пераліванне.....312
Пярэдадзень.....312
«Першы гром вітае...».....312
Пярэстая бліскавіца.....313
«Як у казцы...».....313
«Ля чмяля...».....313
«Над журбой крыніцы...».....314
«Пытаюся ў ракі...».....314

Пажадаецца... 314
Начую на гарышчы 315
Лётае... 315
Выдумалі... 315
«Веснавая бярэзіна...» 316
«Вушацкі дождж...» 316
«Дзень хоча замаліць...» 316
Крутабег 317
«Ніяк сваё вецер не дараве...» 317
Накід 317
Да партрэта навальніцы 318
Перасмыкае 318
«З галінкі спадае кропля...» 318
«Вярсту далёка дагнаць вярсце...» 319
«Квецені белы рой...» 319
Перакуленае 319
«Сабака аж заходзіцца...» 320
Сэнс 320
Зазімак 320
«У прысталай сасны...» 321
Уездзіны 321
«Свой каўнер настаўляе абшар...» 321
Няўседнае лісце... 322
«Першы снег...» 322
Непазбежна... 322
«Па далані ліста...» 323
Перагукі 323
«Здаровы мароз...» 323
Лютаўскае 324
«Дзядзька вусаты...» 324
«Трымаюць...» 324
Графіка 325
«На беразе ракі забыцця...» 325
Нагадвае... 325
«Настрою светла...» 326
Цёмнач 326
Сустрэліся 326
Традыцыйнае 327
«Мурашкі разумнейшыя за нас...» 327
«Падчас мілосці не да злосці...» 327
Весняе 328
«Маланка радасцю малодзіць соты...» 328
? 328

Маладая ........ 329
Заікаецца… ........ 329
«Прыцiхла ганарыстае ніколі...» ........ 329
Па-свойму… ........ 330
«На золку...» ........ 330
«Жмурыцца...» ........ 330
«Думае хваля...» ........ 331
«Зоркі зябка...» ........ 331
Краявід з Рысікам ........ 331
«Сарамлівы адвячорак...» ........ 332
І твой ........ 332
Хоць на час… ........ 332
«Ацалелая брукаванка...» ........ 333
«Адбыўшы блуканняў рату...» ........ 333
Багацейшы… ........ 333
Дасюль… ........ 334
«Дасвеццe заспанае...» ........ 334
Дома, ці Вушача ........ 334
Каб не забыцца… ........ 335
«У ранішнім садзе...» ........ 335
Нікне… ........ 335
«Яблык упаў...» ........ 336
Ля Верасовачкі ........ 336
Раніца дома ........ 336
Чуваць… ........ 337
Няўцямна… ........ 337
Родная Каменская вуліца ........ 337
«Нагам вязка...» ........ 338
Саладзей… ........ 338
Без ........ 338
Бывае ........ 339
Пытаецца… ........ 339
Наканаванасць ........ 339
І летам… ........ 340
Не адгоніш… ........ 340
Бутаўшчына ........ 340
Настрой ........ 341
Ці шмат… ........ 341
«Зоркі не паміраюць...» ........ 341
«На чужыне...» ........ 342
Няма ........ 342
Цяжка… ........ 342
З рукі… ........ 343

Крывіцкі тост 343
Звар'яцелае пытанне 343
Снілася... 344
Штогод 344
Стомлены 344
Сапраўды 345
Вусціш 345
«Праляцелі, як гусі, дні...» 345
Вясёлае 346
Не зарасце... 346
«Непрыручаных пнуцца карміць...» 346
«На растрачанай душы зіма...» 347
«Замятае снягамі сыпучымі...» 347
Гадуем... 347
Дзякуй... 348
Смела... 348
Назусім... 348
Не дужа вясёлае 349
«Якія сняцца самоце сны?..» 349
«Не трызнячы...» 349
«У весялосці вячэра сумная...» 350
Сівее... 350
«Дарагія мясціны наведаць...» 350
Карацее... 351
«Багаты час...» 351
Затрымацца... 351
«Прысталі ногі ад зямных дарог...» 352
«Сама сябе шкадуе знямога...» 352
Каляхатняе 352
Вяртаюся... 353
Недаравальна 353
Як сляза... 353

**Жаўталісця азяблы жар** 355
І надзею мае... 356
«Ступаецца ўпэўнена...» 357
Радасць 358
Пад парасонам 359
На плячы ў нецярпення 360
Да мроі... 361
Раслі... 362
Адрозніць... 363
«Лірычны верш...» 364

«Ласка ўрэшце пераможа зло...» 365
Як быццам... 366
Шляхта 367
Выбіраю 368
Світай... 369
«Не трэба з успамінам сустракацца...» 370
«Сакавіковыя крокі...» 371
Мова 372
Можаце... 373
«Веснавое...» 374
Радзіма кахання 375
Радовішчы радосці 376
Каб аддаць... 377
У несканчоным свеце 378
Кахаць... 379
Ды спяшаюцца... 380
Пад аркаю 381
І палова... 382
Падушка 383
«Так памірае зорка...» 384
Якраз... 385
Не адкажа... 386
Маладое віно 387
«Падасца...» 388
На сустрэчу 389
Палон 390
Дзве 392
Аль-бомнае 393
Суцеш 394
Пазычае 395
Кропля 396
Пацёмшчык 397
Спаконна першыя 398
Недатыкальны запас 399
Шчырасць 400
Але... 401
Не дарадца 402
Заўсёды! 403

**Жыта жыцця** 405
Аднойчы 406
Вершапраходцы 407
«Дай, мова беларуская, руку...» 408

Здаралася… 409
Крылы 410
Апора 411
Даецца… 412
З нагоды… 413
Жыць! 414
Той… 415
Хапіла… 416
Гонар і голад 417
«Мана і нябесная манна...» 418
Кагосьці дзесьці 419
Саромеюся… 420
Свае 421
«Я без цябе...» 422
Белая цішыня 423
Чорны дзяцел 424
Што? 425
Перадзім'е 426
«Вуж...» 427
Васільковае 428
Сваякі 429
Захопнік і абаронца 430
Праснак 431
Прагнуць… 432
Чорна-белы 433
Шукае 434
Вернасць 435
Каб успомнілі… 436
Й… 437
Кусман сну 438
«Хто бачыў...» 439
«Не горбяцца сосны...» 440
Халодная лагода 441
Яны… 442
Mater atrium necessitas 443
Нашчадкі 444
Быць! 445
Не да сну… 446
Жывосць 447
Тры словы 448
Жыта жыцця 449

**Ахвярынкі** 451

Літаратурна-мастацкае выданне

**Барадулін** Рыгор

Халодная памяць вады

Рэдактар *А. С. Сакалоўская*
Камп'ютарны набор *А. А. Лешчанка*
Дызайн і макет *Г. І. Мацур*

Фотаздымкі
*Сяргея Шапрана,*
*Георгія Ліхтаровіча*
і з архіва
*Рыгора Барадуліна,*
*Алы Сакалоўскай,*
*Генадзя Бураўкіна,*
*Сяргея Законнікава*